WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

30 ЛІПЕНЯ 2011 г.
СУБОТА
№ 143
(27007)

Кошт 750 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

ВАГОНАБУДАЎНІЧАЙ ВЫТВОРЧАСЦІ БЫЦЬ

У Беларусі на працягу двух гадоў неабходна асвоіць выпуск усяго спектра камплектуючых для вытворчасці вагонаў. Аб гэтым заявіў Прэзідэнт краіны падчас паездкі па Магілёўшчыне. Аляксандр Лукашэнка наведаў Асіповіцкі вагонабудаўнічы завод, перадае БЕЛТА.

«Мы павінны зрабіць свой вагон, гэта будзе прарыў у прамысловасці», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка, адзначыўшы, што попыт на гэту прадукцыю ў далейшым будзе толькі ўзрастаць.

Размова ў тым ліку вядзецца аб вытворчасці ў Беларусі вагонных цялежак, або папросту кажучы, хадавой часткі вагонаў, а таксама іншых камплектуючых, якія пакуль закупляюцца за мяжой. «У нас вялікі аб'ём грузаперавозак чыгуначным транспартам і вялікая патрэбнасць у рухомым саставе. На яго закупку ідуць вялікія валютныя сродкі», — адзначыў Прэзідэнт.

Акрамя таго, Аляксандр Лукашэнка на Асіповіцкім заводзе агледзеў будаўнічую пляцоўку асноўнага вагонабудаўнічага корпуса. Як далажыў кіраўніку дзяржавы прэм'ер-міністр Міхаіл Мясніковіч, сёлета ўвесь гэты корпус павінен быць уведзены ў эксплуатацыю. Тут плануецца вырабляць вагоны і танк-кантэйнеры. «Ніякіх больш адтэрміновак быць не павінна і не будзе», — падкрэсліў Прэзідэнт, адзначыўшы, што за зацягванне тэрмінаў здачы аб'екта вінаватыя ў гэтым будуць пакараны.

Прэзідэнт раскрытыкаваў тэмпы рэалізацыі інвестпраекта па будаўніцтве Асіповіцкага вагонабудаўнічага завода. Як адзначыў кіраўнік дзяржавы, развіццё вагонабудавання ў Беларусі — вельмі важны напрамак для эканомікі краіны ў цэлым. Ён нагадаў, што раней ім было прынята рашэнне аб стварэнні ў краіне сучасных магутных прадпрыемстваў па вытворчасці грузавых і спецыяльных вагонаў. «Гэтым здымаліся не толькі вострыя транспартныя праблемы, але і адкрываўся перспектыўны напрамак развіцця прамысловасці, нарошчвання экспартнага патэнцыялу за кошт як продажу выпускаемых вагонаў, так і пашырэння паслуг па перавозцы грузаў», — сказаў Прэзідэнт.

Паводле яго слоў, першы этап пройдзены ўжо: створаны і набірае размах сучасны завод па вытворчасці вагонаў у Магілёве. «На працягу 1,5-2 гадоў гэты завод павінен вырабляць увесь спектр камплектуючых для вытворчасці таго класа вагонаў, якія мы будзем вырабляць у Магілёве. У бліжэйшы час мы паглядзім і гэта прадпрыемства», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Другі пункт росту, працягнуў Аляксандр Лукашэнка, — прадпрыемства ў Асіповічах. У свой час было прынята рашэнне стварыць тут на базе рамонтнага дэпо яшчэ адзін магутны цэнтр айчыннага вагонабудавання. Былі вызначаны ўмовы рэалізацыі гэтага інвестыцыйнага праекта, крыніцы фінансавання, агавораны тэрміны ўводу ў строй магутнасцяў, намечаны меры па развіцці сацыяльнай сферы для прыцягнення і замацавання кваліфікаваных рабочых і спецыялістаў.

«На самай справе — даўгабуд. І што здзіўляе, аўтары гэтага даўгабуду — родная дзяржава ў асобе ўрада, родны манапаліст у асобе Беларускай чыгункі і прыватнае прадпрыемства (расійскае ЗАТ «Гранд Экспрэс». — **Заўвага БЕЛТА**), якое так палка хацела тут разгарнуць вытворчасць, праспела час, ільготы, гарантыі і г.д. Усё атрымалі. У выніку — даўгабуд, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Тэмпы работ — нікуды не вартыя. Пастаянна ўзнікаюць праблемы, нестыкоўкі, узаемныя прэтэнзіі акцыянераў. Тэрміны завяршэння будаўніцтва неаднаразова пераносіліся, прытым у асноўным з-за недастатковага фінансавання. Я дадаў бы — з-за непаваротлівасці, разгільдзяйства».

Як адзначыў Прэзідэнт, урад у гэтым пытанні замест прыняцця энергічных мер заняў іншую пазіцыю, пусціўшы ўсё на самацёк. У выніку пад пагрозай зрыву апынуўся ўвод у эксплуатацыю завода, што зусім недапушчальна.

«У чым справа? Чаму не будуем? Чаму зрываем важны інвестыцыйны праект?», — такія пытанні паставіў перад удзельнікамі нарады кіраўнік дзяржавы. Пры гэтым ён папярэдзіў: «Ніякіх пераносаў тэрмінаў больш не будзе. Дамовіліся — трэба выконваць узятыя на сябе абавязацельствы».

Аляксандр Лукашэнка ў сувязі з гэтым таксама адзначыў пэўную абсурднасць у існуючай сітуацыі, паколькі кіраўніку дзяржавы даводзіцца падштурхоўваць фактычна прыватнае прадпрыемства да таго, каб яны больш і хутчэй зараблялі грошы.

«Не будзеце рабіць вы, не зробіце да канца года, мы ад вашых паслуг адмовімся і будзем займацца гэтым самі. Вагонабудаўнічая вытворчасць у краіне будзе. Пытанне ў тым, з вамі або з кімсьці іншым», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка, запатрабаваўшы далажыць яму, чаму не выконваюцца даручэнні па будаўніцтве завода, а таксама што неабходна зрабіць для безумоўнага ўводу ў строй ва ўстаноўленыя тэрміны ўзводзімых аб'ектаў.

Хлеб ёсць, і яго абавязкова трэба ўбраць

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ў ходзе рабочай паездкі ў Магілёўскую вобласць запатрабаваў на высокім якасным узроўні і ў неабходныя тэрміны правесці ўборачную кампанію ў краіне.

«Якасць — гэта пытанне нумар адзін. Ніякай спешкі быць не павінна, тэхнікі хапае. Пры нармальнай арганізацыі хлеб убраць можна, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Хлеб ёсць, і яго абавязкова трэба ўбраць. У арсенале для гэтага ў нас ёсць усё».

Як далажыў кіраўніку дзяржавы губернатар Магілёўскай вобласці Пётр Руднік, плошча ўборкі збожжавых і зернебабовых культур у рэгіёне складае 335,2 тыс.га. На сёння збожжавыя ўбраны на плошчы 74,5 тыс га, што складае больш за 22 працэнты. Валавы збор перавысіў 255 тыс.т пры сярэдняй ураджайнасці 34,2 ц/га. Паводле слоў губернатара, выніковы валавы збор чакаецца на ўзроўні 1 млн 350 тыс.т пры сярэдняй ураджайнасці 40 ц/га. Пры гэтым якасць сёлетняга ўраджаю, паводле ацэнак вучоных, значна вышэйшая, чым у мінулыя гады. У сувязі з гэтым Аляксандр Лукашэнка даручыў прэм'ер-міністру Міхаілу Мясніковічу абнавіць дзяржрэзерв збожжа.

Асобна кіраўнік дзяржавы закрануў пытанне будаўніцтва сельгасаб'ектаў, зрабіўшы акцэнт на неабходнасці эканомнага расходавання сродкаў на гэтыя мэты без скарачэння аб'ёмаў будаўніцтва. «Будоўлю спыняць нельга, фермы трэба будаваць, і не толькі малочнатаварныя», — адзначыў ён.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Рубежскі дуб — прыгажосць і моц зямлі, сведка слаўнай і трагічнай гісторыі.

Віктар Радкевіч – апошні сапраўдны знаўца купалавых сцежак, якія ён можа знайсці нават у такім высокім травастоі.

У ПОШУКАХ КУПАЛАЎСКІХ ХУТАРОЎ

МАРА прайсці малавядомымі ці зусім невядомымі дарогамі і сцяжынкамі Янкі Купалы даймае не першы год. Акрамя славутых мясцін і дарог да іх існуе і безліч амаль забытых куткоў. Амаль зніклых. Нагода наспела сама сабою: налета будзе адзначацца 130-годдзе песняра. Сапраўды, калі Вязынку ў нас ведаюць усе, Ляўкі, Яхімоўшчыну і Харуванцы з Акопамі некаторыя, дык пра Айчызну, Рубеж, Моцеўшчыну, Здарэнне і шмат іншых колішніх хутароў, паселішчаў ды ўрочышчаў, упэўнены, многія нават не чулі.

Ніякага тут перабольшвання і тым больш першаадкрывальніцтва. А вось жадання дапамагчы тым, хто адкрывае для сябе невядомую Бацькаўшчыну, хоча больш ведаць пра паэта, хоць адбаўляй. Гэтымі сцежкамі цяпер карыстаюцца жыхары Харуванцаў, Карпілаўкі, Бясядаў, Янушкавічаў — ходзяць імі ў грыбы, ягады, па дровы. Не надаючы гэтаму асаблівага значэння. Нядаўна давялося пачуць ад старэйшых жыхароў вёскі Харуванцы: «Да 80-х гадоў ніхто ў нас пра Купалу не ўзгадваў. Касілі сена і ў Акопах, і ў іншых урочышчах, а пра паэта не казалі. Пакуль не справілі 100-гадовы юбілей». Падумалася тады: як хутка ў нас усё забываецца! Тут жа цякло такое незвычайнае жыццё!

Цяпер немагчыма ўявіць Харуванцы без славутага імя і без музея. Без Акопаў. Добра было б вярнуць з нябыту і іншыя зямныя адзнакі, звязаныя з жыццём Купалы. У выглядзе рэшткаў падмуркаў колішніх сядзіб, крынічак з сажалкамі, тых жа дарог і сцяжынак. Каб можна было прайсціся па іх, паглядзець навакольныя краявіды. І яшчэ раз пераканацца, што яны непаўторныя, і нездарма нехта параўнаў іх са Швейцарыяй. Дастаткова збочыць з вялікай дарогі — і адкрываюцца цудоўныя малюнкі!

Сапраўдная канцэнтрацыя мясцін, звязаных з Купалам, знаходзіцца на памежжы Мінскага і Лагойскага раёнаў, праваруч аўтамагістралі Р-58, якая вядзе са сталіцы ў нарачанскі край. Калі на 30-м кіламетры збочваеш у вёску Карпілаўку, трапляеш, лічы, у колішні фальварак, дзе жыў Антон Іванавіч Лявіцкі — беларускі пісьменнік, вядомы пад псеўданімам Ядвігін Ш. Гэта ён падахвоціў маладога Купалу пісаць па-беларуску, а пазней друкаваў у газетах водгукі на ягоныя кнігі. Ядвігін Ш. — без перабольшвання хросны бацька Купалы ў літаратуры. Для будучага паэта Карпілаўка была і крыніцай натхнення, і шляхам у вялікі літаратурны свет. Сёння пра месца колішняй сядзібы Лявіцкіх нагадваюць толькі старыя ліпы. Нядаўна там усталяваны ахоўны знак.

СТАР. 3

Аляксандр ЯРАШЭНКА:

«ЭКАНОМІКА БЕЛАРУСІ ПАЧАЛА РУХ У БОК ЗБАЛАНСАВАНАСЦІ»

Вынікі сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі за першае паўгоддзе 2011 года агучыў і пракаментаваў на брыфінгу Аляксандр ЯРАШЭНКА, намеснік міністра эканомікі. У прыватнасці, ён адзначыў, што яны характарызуюцца высокім тэмпам росту ВУП, паляпшэннем шэрагу якасных паказчыкаў і большасці найважнейшых прагнозных параметраў.

Тэмпы росту валавога ўнутранага прадукту за шэсць месяцаў склалі 111%, прадукцыйнасць працы ўзрасла на 12,3% (за студзень-май), энергаёмістасць зніжана на 10,4%. Высокі тэмп росту ВУП падтрымліваўся таксама станоўчай дынамікай росту дабаўленай вартасці ў апрацоўчай прамысловасці (112,1%), будаўніцтве (120,5%) і гандлі (129,5%).

— У першым паўгоддзі рост эканомікі быў абумоўлены пераважна пашырэннем унутранага попыту, якому спрыялі рост грашовых даходаў насельніцтва і правядзенне няжорсткай грашова-крэдытнай палітыкі. Асноўнымі кампанентамі гэтага ўнутранага попыту былі рознічны тавараабарот праз усе каналы рэалізацыі (ён павялічыўся на 18,4%) і інвестыцыі ў асноўны капітал (выраслі на 27,6%). Рост тавараабароту быў абумоўлены высокімі дэвальвацыйнымі і інфляцыйнымі чаканнямі, вынікам якіх з'явіўся ажыятажны спажывецкі попыт. Аднак прынятыя ўрадам меры (рэгулярны маніторынг спажывецкага рынку, павелічэнне адгрузкі прадукцыі, увядзенне свабоднага цэнаўтварэння на шэраг прадуктаў і іншыя мерапрыемствы) дазволілі стабілізаваць сітуацыю. Сёння ў рэальным выражэнні, скарэктаваным на ўзровень інфляцыі, рознічны тавараабарот менавіта ў чэрвені знізіўся амаль на 20% у параўнанні з маем. Гэта кажа пра тое, што сітуацыя стабілізавалася, і той ажыятаж, які прысутнічаў у першыя 4-5 месяцаў, усё-такі пайшоў на спад, — сказаў Аляксандр Ярашэнка.

Што тычыцца інвестыцый у асноўны капітал, то іх тэмпы росту былі амаль у два разы вышэйшыя за рост ВУП: на інвеставанне эканомікі краіны за паўгода было выкарыстана 32,6 трыльёна рублёў, што ў супастаўных цэнах складае 127,6% да ўзроўню 2010 года.

— У прынцыпе, гэтая сітуацыя добрая, калі б яна забяспечвалася ў тым ліку і якасным складнікам росту. Аднак шмат у чым гэтыя інвестыцыі былі абумоўлены павелічэннем аб'ёмаў будаўніча-мантажных работ (тэмп росту іх склаў 124,1%). Акрамя таго, мы адзначаем, што рост інвестыцыйнага працэсу ў многім з'явіўся наступствам даступнасці крэдытных рэсурсаў па нізкіх працэнтных стаўках: доля крэдытаў банкаў у крыніцах фінансавання інвестыцый узрасла да 37%. У прынцыпе, нічога дрэннага няма, калі крэдытныя рэсурсы маюць тэндэнцыю да росту, у тым ліку і ў інвестыцыйным складніку, аднак неабходна адзначыць: амаль палова гэтых крэдытных рэсурсаў была выдзелена на льготных умовах, што ў нейкай ступені якраз дэстабілізавала сітуацыю, у тым ліку ў грашова-крэдытнай палітыцы, — адзначыў намеснік міністра эканомікі.

СТАР. 2

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ВЫБУХ НА ШАХЦЕ

КАЛЯ 20 ГАРНЯКОЎ ЗАГІНУЛІ ПАДЧАС ДЗВЮХ АВАРЫЙ НА ШАХТАХ УКРАІНЫ

Колькасць ахвяр выбуху, які адбыўся ў ноч на 29 ліпеня ў луганскай шахце «Сухадольская-Усходняя», дасягнула 17 чалавек. Пра гэта паведамляе МНС Украіны.

На сайце МНС змешчана інфармацыя толькі пра колькасць загінулых, пацярпелых і тых, хто знік без вестак. Улічваючы, што ў новых звестках фігуруюць 17 загінулых і двое шпіталізаваных гарнякоў (раней паведамлялася пра 16 загінулых і трох шпіталізаваных), можна выказаць здагадку, што адзін з пацярпелых памёр у бальніцы. Зніклымі лічацца дзевяць чалавек. Праца шахты прыпынена.

У луганскай шахце, як заявілі ў абласной адміністрацыі, адбыўся выбух паветрана-метанавай сумесі (што стала прычынай выбуху, пакуль невядома). У сувязі з НС заведзена справа па артыкуле «Парушэнне правіл бяспекі на выбуханебяспечных прадпрыемствах». Тым часам раніцай 29 ліпеня яшчэ ў адной шахце на ўсходзе Украіны адбылася аварыя. У шахце «Бажанова» (Данецкая вобласць), як паведамляецца, абвалілася наземная частка пад'ёмніка. У выніку, паводле папярэдняй інфармацыі, загінуў адзін чалавек, двое былі вызваленыя, зніклымі без вестак лічацца дзесяць чалавек. У шахце на момант аварыі працавалі больш за 500 гарнякоў. Яны выйшлі на паверхню па рэзервовых ствалах.

АМАЛЬ 227 ТЫСЯЧ СУПРАЦОЎНІКАЎ МУС РАСІІ БУДУЦЬ ЗВОЛЬНЕНЫ ПАДЧАС РЭФОРМЫ

У выніку рэформы органаў унутраных спраў будуць скарочаны 226 900 чалавек — гэта 22% ад агульнай колькасці МУС у адносінах да дарэформеннага перыяду, паведаміў прэзідэнт РФ Дзмітрый Мядзведзеў на нарадзе з кіраўнікамі сілавых ведамстваў і праваахоўных органаў у пятніцу.

Мядзведзеў удакладніў, што цяпер з МУС падчас першай фазы рэформы ўжо звольнена 183 тысячы чалавек, а неўзабаве будуць звольнены яшчэ 48 тысяч супрацоўнікаў. Паводле інфармацыі прэзідэнта Расіі, атэстацыю прайшлі каля аднаго мільёна супрацоўнікаў органаў унутраных спраў.

ПРЭЗІДЭНТ БЕЛАРУСІ ПАВІНШАВАЎ АЛЯКСАНДРУ ГЕРАСІМЕНЮ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў члена нацыянальнай каманды краіны па плаванні Аляксандру Герасіменю з залатым медалём, заваяваным на чэмпіянаце свету ў Шанхаі.

«Твой цудоўны поспех, дасягнуты ва ўпартай барацьбе з мацнейшымі спартсменамі свету, увойдзе ў слаўны летапіс і будзе добрым прыкладам для перайманя. Праявіўшы майстэрства і мэтанакіраванасць, ты прынесла ў скарбонку беларускай каманды ўзнагароду вышэйшай вартасці, пацвердзіўшы статус Беларусі як спартыўнай дзяржавы», — гаворыцца ў віншаванні. Аляксандр Лукашэнка пажадаў спартсменцы ўдачы, шчасця і новых перамог.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

А ВАСЯ СУПРАЦЬ!

Вытворчыя драмы

І што самае цікавае, не адзін Вася. Проста астатнія супрацоўнікі прадпрыемства «Гомельдрэў» сваю думку выказваюць толькі на асабістай кухні. Размова ідзе пра Васю, які даслаў ліст у рэдакцыю газеты «Звязда», на электронную паштовую скрыню. Здаецца, можна было б не рэагаваць, бо скарга ананімная (Вася не пакінуў ні тэлефона, ні адраса, ні прозвішча), але ж і яго можна зразумець у гэтай сітуацыі. Хутка зразумееце чаму. Далей — вытрымкі з паслання:

«Завод ААТ «Гомельдрэў». Справа ў тым, што нядаўна без нашай згоды выдалі карткі, на якія налічваецца частка зарплаты і якімі можна аплачваць пакупкі толькі ў краме завода. У краме ўсё ці не ў два разы даражэй і не першай свежасці. Былі выпадкі, што ў піражках, цукерках шакаладных і інш. былі чарвякі. Як такую прадукцыю можна купляць! Напрыклад: цана на халадзільнік у звычайнай краме 2 мільёны, а ў краме ААТ «Гомельдрэў» — 3 мільёны. Зняць грошы з гэтай карткі нельга. Калі не карыстаешся карткай, грошы назапашваюцца, але зняць іх усё роўна нельга...»

І далей просьба разабрацца, ці законна такое наваўвядзенне на прадпрыемстве

Спачатку патэлефанавала сваёй знаёмай, якая там працуе. Яна пацвердзіла факт увядзення пластыкавых картак ААТ «Гомельдрэў» для атрымання на іх часткі заробку для ўсіх, хто працуе на прадпрыемстве. І сказала, што людзі называюць паміж сабой гэтыя віртуальныя грошы «харчовым пайком».

Новае — зусім не забытае старое

Думаю, не многія забылі часіны, калі на кожным другім прадпрыемстве заробак выдавалі тым, што вырабляліі: футрам, цацкамі, каўбасой ці мэбляй. Каму дзе пашанцавала працаваць... (Добра, што не навінамі — бо ўсё маё жыццё прысвечана журналістыцы!) І хоць дзівосныя 90-я ў мінулым, некаторыя метады барацьбы за выжыванне ўзгадваюцца, яны зараз вельмі даспадобы, калі гаварыць пра сённяшнія рэаліі. Тым больш што Працоўны кодэкс Рэспублікі Беларусь змяшчае падставы для ўвядзення натуральнай аплаты за працу.

У адпаведнасці з артыкулам 74 Працоўнага кодэкса Рэспублікі Беларусь, заработная плата выплачваецца ў грашовых адзінках Рэспублікі Беларусь. Са згоды працаўніка дапускаецца замена грашовай аплаты цалкам ці часткова натуральнай аплатай (змешаная форма аплаты). Такую згоду неабходна атрымліваць і ў тым выпадку, калі натуральная ці змешаная форма аплаты працы прадугледжана ў калектыўным дагаворы. Прынамсі, спачатку аб ім.

Сёлета ў чэрвені якраз і быў прыняты гэты дакумент на канферэнцыі ААТ «Гомельдрэў». У адпаведнасці з пунктам 3.47 раздзела «Аплата працы» калектыўнага дагавора, «заработная плата ў памеры 10% (па пластыкавых картках ААТ «Гомельдрэў») **можа** выдавацца ў натуральным выглядзе, у тым ліку гатовай прадукцыяй, таварамі народнага спажывання (за выключэннем вінна-гарэлачных вырабаў), прадукцыяй, выраблёнай цэхам грамадскага харчавання, якая рэалізуецца праз гандлёвыя кропкі ААТ «Гомельдрэў», а таксама таварамі, якія рэалізуюцца праз прыватнае гандлёвае ўнітарнае прадпрыемства «Мэбля «Гомельдрэў».

У гэтай цытаце невыпадкова выдзелена тлустым шрыфтам слова **«можа»**. Як растлумачыла працоўны арбітр па Гомельскай вобласці Наталля Сакалова, такім чынам можна меркаваць, што **можа і не выплачвацца**:

— І далей: «...заробак у памеры 10 % па пластыкавых картках ААТ «Гомельдрэў» можа выдавацца ў натуральным выглядзе, у тым ліку гатовай прадукцыяй». Але ж што азначае **«можа»**, калі заработная плата на картку ААТ «Гомельдрэў» цяпер трапляе безварыянтна? А калі Вася не хоча? Той загад, які быў «спушчаны» пад подпіс калектыву для азнаямлення, пры такой фармулёўцы ў калектыўным дагаворы і адсутнасці змяненняў у кантракце азначае, што Вася адзін месяц можа хацець атрымліваць заробак натуральным прадуктам, іншы — не. Яму дастаткова на імя кіраўніка напісаць заяву пра тое, што ён не хоча атрымліваць заробак у такім парадку, а хоча толькі ў грашовым выглядзе.

СТАР. 2

ЦЭНЫ НА ЗВАДКАВАНЫ ГАЗ ПАВЫСЯЦЦА З 1 ЖНІЎНЯ

У Беларусі з 1 жніўня павышаюцца цэны на звадкаваны газ. Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў Мінэканомікі, каментуючы пастановы ад 25 ліпеня гэтага года № 113 «Аб устанаўленні гранічных рознічных цэн на звадкаваны газ пры рэалізацыі на аўтамабільных газазаправачных станцыях», № 114 «Аб цане на газ звадкаваны, які рэалізуецца насельніцтву ў балонах» і № 115 «Аб унясенні змяненняў у пастанову Міністэрства эканомікі Рэспублікі Беларусь ад 4 красавіка 2011 № 52».

Звадкаваны газ у Беларусі выпрацоўваецца ў асноўным з імпартуемай сыравіны. Дзейныя цяпер адпускныя цэны на звадкаваны газ не забяспечваюць рэнтабельную работу арганізацый, якія выпрацоўваюць гэты прадукт для камунальна-бытавога спажывання і запраўкі аўтамабільнага транспарту. У сувязі з гэтым Міністэрства эканомікі прыняло рашэнне аб іх павелічэнні з 1 жніўня 2011 года. Цэны арганізацый-вытворцаў на звадкаваны газ для камунальна-бытавога спажывання павялічаны на 23 працэнты, для запраўкі аўтатранспарту — на 24 працэнты. У сувязі з павышэннем завадскіх адпускных цэн на звадкаваныя газы Міністэрства эканомікі таксама прыняло рашэнне аб павелічэнні цэн на звадкаваны газ, які выкарыстоўваецца ў якасці маторнага паліва, — на 24 працэнты, на звадкаваны газ для запраўкі ў малалітражныя балоны (1 л, 5 л, 12 л, 27 л) — на 23 працэнты.

НЕСПРЫЯЛЬНЫЯ ДНІ І ГАДЗІНЫ Ў ЖНІЎНІ

1, панядзелак,	*5.30 — 7.30*	19, пятніца,	*11.00 — 12.00*
2, аўторак,	*1.30 — 22.00*	22, панядзелак,	*0.00 — 1.00*
3, серада,	*2.00 — 9.00*	24, серада,	*8.30 — 10.30*
10, серада,	*19.30 — 23.00*	25, чацвер,	*12.00 — 22.00*
11, чацвер,	*3.00 — 22.30*	26, пятніца,	*1.00 — 15.00*
12, пятніца,	*1.00 — 3.00*	28, нядзеля,	*16.00 — 18.00*
15, панядзелак,	*7.30 — 23.00*	29, панядзелак,	*21.00 — 23.00*
16, аўторак,	*1.00 — 22.00*	30, аўторак,	*1.00 — 17.30*

З 1 ЖНІЎНЯ БЮДЖЭТ ПРАЖЫТКОВАГА МІНІМУМУ ПАВЯЛІЧВАЕЦЦА ДА BR442 ТЫС. 360

У Беларусі з 1 жніўня будзе дзейнічаць новы бюджэт пражыткоўага мінімуму. БПМ павышаецца на 28,9 працэнта да Br442 тыс. 360, паведаміў намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Ігар Старавойтаў учора на пасяджэнні калегіі ведамства, перадае БЕЛТА.

Пастановай Савета Міністраў № 1015 ад 28 ліпеня зацверджаны бюджэт пражыткоўага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва ў цэнах чэрвеня гэтага года ў разліку на адзін месяц. Перыяд дзеяння гэтага сацыяльнага нарматыву — з 1 жніўня па 31 кастрычніка 2011 года. Бюджэт пражыткоўага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва са жніўня складзе Br442 тыс. 360, сказаў Ігар Старавойтаў.

Бюджэт пражыткоўага мінімуму па асноўных сацыяльна-дэмаграфічных групах у цэнах чэрвеня ў разліку на адзін месяц са жніўня складзе: для працаздольнага насельніцтва — Br481 тыс. 920, пенсіянераў — Br366 тыс. 790, дзяцей ва ўзросце да 3 гадоў — Br348 тыс. 970, дзяцей ад 3 да 6 гадоў — Br448 тыс. 560, ад 6 да 18 гадоў — Br475 тыс. 250, для дзяцей-студэнтаў — Br425 тыс. 980. Новы БПМ павысіўся на 28,9 працэнта да нарматыву, які дзейнічае з 1 мая па 31 ліпеня 2011 года (Br343 тыс. 260). Адпаведна са жніўня ўзрастуць памеры дзяржаўных дапамог сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей.

Пастановай Мінпрацы і сацабароны ад 21 ліпеня гэтага года № 71 мінімальны спажывецкі бюджэт сям'і з чатырох чалавек на перыяд з 1 жніўня па 31 кастрычніка ўстаноўлены ў памеры Br675 тыс. 980.

Мінімальны спажывецкі бюджэт прымяняецца як сацыяльны нарматыў для прагназавання змяненняў узроўню жыцця насельніцтва, узмацнення сацыяльнай падтрымкі маючых патрэбу грамадзян, фарміравання сістэмы народна-гаспадарчых прапорцый і прыярытэтаў, якія забяспечваюць паэтапнае набліжэнне спажывання грамадзян да навукова абгрунтаванага ўзроўню.

Асноўныя артыкулы расходаў сярэднедушавога мінімальнага спажывецкага бюджэту сям'і з чатырох чалавек у цэнах чэрвеня 2011 года наступныя: прадукты харчавання — 58,9 працэнта, адзенне, бялізна, абутак — 15,7 працэнта, карыстанне жылым памяшканнем і камунальныя паслугі — 7,1 працэнта, бытавыя паслугі, транспарт, сувязь — 5 працэнтаў, прадметы культурна-бытавога і гаспадарчага прызначэння — 8,3 працэнта, культурна-асветныя мерапрыемствы і адпачынак — 1,5 працэнта, узносы і плацяжы — 1,5 працэнта, прадметы санітарыі, гігіены, лякарствы — 2 працэнты.

Зацверджаны таксама сярэднедушавыя мінімальныя спажывецкія бюджэты маладой сям'і з адным дзіцем — Br699 тыс. 190, працаздольнага насельніцтва — Br858 тыс. 950, пенсіянераў — Br671 тыс. 770, студэнтаў — Br623 тыс. 990, дзяцей ва ўзросце да 3 гадоў — Br513 тыс. 690, дзяцей ва ўзросце ад 3 да 6 гадоў — Br626 тыс. 260, дзяцей ва ўзросце ад 6 да 14 гадоў — Br755 тыс. 880.

АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ВЫКАЗАЎ СПАЧУВАННІ Ў СУВЯЗІ З ГІБЕЛЛЮ ЛЮДЗЕЙ НА ШАХЦЕ «СУХАДОЛЬСКАЯ-УСХОДНЯЯ» ВА УКРАІНЕ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ад імя беларускага народа і сябе асабіста выказаў шчырыя спачуванні Прэзідэнту Украіны Віктару Януковічу, а таксама родным і блізкім загінулых у выніку трагічнага здарэння на шахце «Сухадольская-Усходняя» ва Украіне, якое прывяло да чалавечых ахвяр.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 30.07.2011 г. (для б/н разлікаў)				Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ	
▲ 1 долар ЗША	4 958,00	1 чэшская крона	292,85	USD	27,6796
▼ 1 еўра	7 084,98	1 польскі злоты	1 766,68	10 UAH	34,6125
1 латвійскі лат	9 988,92	▼ 1 расійскі рубель	179,12	10000 BYR	55,9071
1 літоўскі літ	2 051,69	1 украінская грыўня	619,81	EUR	39,5182

Агенцыя ўладзімір грацкова

АЛЯКСАНДРА Ў «ЗОЛАЦЕ»

Віншуем!

НАША Аляксандра Герасіменя ўсё ж здзейсніла самую запаветную для любога спартсмена мару — выйграла «золата» чэмпіянату свету! На самай прэстыжнай дыстанцыі — 100 метраў вольным стылем — у фінальным заплыве ў Шанхаі яна паказала аднолькавы час разам з датчанкай Жанет Отэсен — 53,45 сек. Залатыя медалі атрымалі абедзве дзяўчыны і падзялілі верхнюю прыступку п'едэстала. Гэты вынік Сашы з'яўляецца і новым нацыянальным рэкордам. «Бронзу» на гэтай дыстанцыі атрымала Раномі Кромавіджоджа з Галандыі.

Гэтая ўзнагарода стала першай для нашай каманды на сусветным першынстве па водных відах спорту і другой для беларускі асабіста. Крыху раней на сёлетнім чэмпіянаце Герасіменя заняла толькі шостае месца ў фінале сваёй любімай дыстанцыі 50 метраў на спіне, а ў 2007 годзе менавіта гэтая дыстанцыя стала медальнай для Аляксандры: яна выйграла «серабро».

А на чэмпіянатах Еўропы наша спартсменка выступае больш паспяхова. Летась у Будапешце Аляксандра Герасіменя заваявала «золата» ў плаванні на спіне на 50 метраў, а таксама «серабро» на 100 метраў вольным стылем, у 2002-м — «бронзу» на 50 метраў вольным стылем і на 50 метраў на спіне, у 2006-м — «серабро» на 50 метраў на спіне, у 2002-м на чэмпіянаце Еўропы на «кароткай вадзе» таксама стала другой на 50 метраў вольным стылем.

Ул. інф.

Фота БЕЛТА.

Аляксандра Герасіменя і Жанет Отэсен.

А ВАСЯ СУПРАЦЬ!

Факт

ДВОЙЧЫ ДЗВЕ!

Адразу два экіпажы на Гомельшчыне на высокапрадукцыйных «Лексіёнах» намалацілі дзве тысячы тон зерня.

Вечарам 28 ліпеня Валянцін Саламаха і Аляксандр Грань з агракамбіната «Холмеч» Рэчыцкага раёна і раніцай пятніцы Мікалай Дзегцярэнка з КСУП «Брагінскі», які адзін працуе на камбайне і быў першым на Гомельшчыне, хто намалаціў тысячу тон збожжа. У камітэце па сельскай гаспадарцы і харчаванні Гомельскага аблвыканкама гавораць, што ў Саламахі і Граня камбайн больш магутны і ўраджайнасць больш высокая — у сярэднім 70 цэнтнераў збожжа з гектара. У «Брагінскім» збіраюць на круг па 30,7 цэнтнера. Аднак гэтая гаспадарка ўключылася ва ўборачную-2011 адной з першых у краіне. Рэкорд мог быць пастаўлены і раней, але ж моцныя дажджы на Палессі некалькі запаволілі ход уборачнай.

ЭКВАТАР ПЕРААДОЛЕЛІ

Больш за палову збожжавых культур убрана на Гомельшчыне. Лідзіруюць па тэмпах уборкі мазыране: скошана і абмалочана 65 % плошчаў.

У 14 з 21 раёна вобласці ўборачная пераваліла за экватар, астатнія хутка набліжаюцца да яго. Каля 470 тысяч тон у бункернай вазе ўжо намалацілі хлебаробы Гомельскай вобласці. Сярэдняя ўраджайнасць зараз складае амаль 28 цэнтнераў з гектара. А вось хлебаробы Рэчыцкага раёна збіраюць на круг па 40 цэнтнераў. Умовы надвор'я спрыяюць павелічэнню тэмпаў работ на хлебнай ніве, паведамляюць у камітэце па сельскай гаспадарцы і харчаванні Гомельскага аблвыканкама. На палі штодзень выходзіць звыш 1,5 тысячы камбайнаў. Усяго хлебаробам Гомельшчыны трэба ўбраць звыш 333 тысяч гектараў збожжавых і зернебабовых.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

РАСІЙСКІ ПАСАЖЫРСКІ САМАЛЁТ ЗРАБІЎ АВАРЫЙНУЮ ПАСАДКУ Ў НАЦЫЯНАЛЬНЫМ АЭРАПОРЦЕ «МІНСК»

Пасажырскі самалёт маркі «Боінг 767» авіякампаніі «Расія» рэйсам Родас (Грэцыя) — Санкт-Пецярбург (Расія) зрабіў учора ноччу аварыйную пасадку ў Нацыянальным аэрапорце «Мінск». У час пасадкі ніхто не пацярпеў. Аб гэтым карэспандэнту БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе МНС.

Паводле папярэдняй інфармацыі, на вышыні 10 тыс. м пілоты выявілі няспраўнасць: адмову падачы паліва ў правы рухавік самалёта. На борце самалёта знаходзіліся 290 пасажыраў і 11 членаў экіпажа. «У 02.53 самалёт зрабіў пасадку», — удакладнілі ў МНС, дадаўшы, што прычына здарэння ўстанаўліваецца.

БЕЗ МОТАШЛЕМА, ПАСВЕДЧАННЯ КІРОЎЦЫ І «ПАД ГАЗАМ»

У тое, што адбылося ля будынка Гродзенскай ДАІ па вуліцы Белуша, цяжка паверыць, але пратакол сведчыць: не жарт, факт. Зноў пераконваешся, што ў хамства няма ніякіх «тармазоў».

Ужо немалады мужчына на аўтамабілі свайго знаёмага даставіў скутар на пляцоўку Дзяржаўтаінспекцыі для пастаноўкі гэтага транспартнага сродку на ўлік. Прайшоў агляд, падаў дакументы на рэгістрацыю і накіраваўся ў... бліжэйшы бар. Пасля чаго сеў на «Навігатар» і паехаў. Аднак, паколькі быў без моташлема, адразу ж прыцягнуў увагу супрацоўніка ДАІ. У выніку аказалася, што гэты шафёр ніколі не меў пасведчання кіроўцы. А медасведчанне канстатавала, што ў яго крыві ўтрымліваецца больш за 0,8 праміле алкаголю.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

АЦЭНКА ЎЗРОЎНЮ БАЯВОЙ ПАДРЫХТОЎКІ — ВЫСОКАЯ

Члены Пастаяннага савета пры арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы, кіраўніцтва Сакратарыята і Аб'яднанага штаба АДКБ высока ацанілі сістэму і ўзровень баявой падрыхтоўкі ваеннаслужачых 103-й гвардзейскай асобнай мабільнай брыгады Узброеных Сіл Беларусі. Пра гэта 29 ліпеня журналістам паведаміў генеральны сакратар АДКБ Мікалай Бардзюжа, перадае БЕЛТА.

Фота БЕЛТА

Члены Пастаяннага савета пры АДКБ азнаёміліся з узроўнем баявой падрыхтоўкі мабільнай брыгады і яе тэхнічным аснашчэннем. На палігоне ў Віцебскім раёне ўдзельнікі назіралі за дзеяннямі ваеннаслужачых сіл спецыяльнай аперацыі Узброеных Сіл Беларусі. Ваеннаслужачыя 103-й мабільнай брыгады прадэманстравалі высадку без парашутаў, а таксама работу вадалазных падраздзяленняў.

БРАГУ КАНФІСКАВАЛІ, А «ЗАВОД» ПАКІНУЛІ

Супрацоўнікі аддзела аховы правапарадку і прафілактыкі УУС адміністрацыі Першамайскага раёна г. Мінска выявілі ў Навагрудскім раёне Гродзенскай вобласці міні-завод па вырабе самагону.

На момант візіту праваахоўнікаў у лясным масіве, дзе размяшчаецца гэтая «вытворчасць», было ўсяго 50 л брагі, аднак сама ёмістасць разлічана на 1 тону. Як мяркуецца, мясцовыя жыхары па чарзе выкарыстоўваюць гэтыя магутнасці. А вось хто менавіта займаецца забароненай справай, яшчэ трэба высветліць. Калі вам вядома месцазнаходжанне падобных «прадпрыемстваў», званіце па нумары «гарачай лініі» ў Мінску: 8 (017) 270 55 01.

Святлана БАРЫСЕНКА.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ 30 августа 2011 года ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

по продаже недвижимого имущества, принадлежащего ОАО Ордена «Знак Почета» «Автокомбинат №4»

Предмет торгов (наименование и сведения о продаваемом имуществе)	- здание административно-хозяйственное общей площадью 529,3 кв. м, литер А 2/к, инвентарный номер 500/С-27625; - автостоянка (сооружение специализированное автомобильного транспорта и автодорожного хозяйства) общей площадью 5229,0 кв. м, инвентарный номер 500/С-1011026.
Сведения о земельных участках	- земельный участок площадью 0,0849 га, кадастровый номер 500000000002005019, целевое назначение: эксплуатация и обслуживание административно-бытового здания; - земельный участок площадью 0,5229 га, кадастровый номер 500000000002006902, целевое назначение: эксплуатация и обслуживание открытой автостоянки;
Местонахождение продаваемого имущества	г. Минск, пр-т Партизанский, д. 178
Сведения о продавце	ОАО Ордена «Знак Почета» «Автокомбинат №4», ул. Социалистическая, 26, 220102 г. Минск, телефоны: (017)243-31-93, (029)341-31-59
Сведения об организаторе аукциона	УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск, телефон (017)227-48-36
Начальная цена предмета торгов	2 490 000 000 белорусских рублей
Сумма задатка	249 000 000 белорусских рублей
Наличие обременений	аренда

Процедура проведения торгов установлена порядком проведения аукциона.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона; копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка; а также иные документы в соответствии с Положением.

Задаток перечисляется на расчетный счет № 3012104971019, в региональной дирекции №700 ОАО «БПС-Банк», г. Минск, код 153001369, получатель – УП «Минский городской центр недвижимости» УНП 190398583.

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемое имущество. Наивысшая (окончательная) цена фиксируется в протоколе о результатах аукциона и не включает НДС.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, осуществляется участником, выигравшим торги.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается в течение 10 рабочих дней с даты проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в течение 30 календарных дней с даты заключения договора купли-продажи.

Аукцион состоится 30 августа 2011 года в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются с 01.08.2011 по 26.08.2011 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (в пятницу – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок: (017)227 48 36, (017)243 31 93, (029)341 31 59

Утерянные представительством Белгосстраха по Советскому району г. Минска бланки страховых полисов по обязательному страхованию гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории стран — членов системы «Зелёная карта» **серии BY01A № 4389537** и добровольному страхованию имущества граждан **формы 2РН серии БИ № 6811167 считать недействительными**.

УНП 101883943

Утерянный представительством Белгосстраха по Ленинскому району г. Минска бланк страхового полиса по обязательному страхованию гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории стран — членов системы «Зелёная карта» **серии BY01 № 5513682 считать недействительным**.

УНП 101883943

«ЭКАНОМІКА БЕЛАРУСІ ПАЧАЛА РУХ У БОК ЗБАЛАНСАВАНАСЦІ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Дарэчы, прырост ВУП шмат у чым забяспечаны дынамікай развіцця прамысловага комплексу краіны: індэкс вытворчасці прадукцыі ў студзені-чэрвені склаў 111,5% да адпаведнага летняга перыяду. Як адзначыў Аляксандр Ярашэнка.

І зноў пра якасць

Намеснік міністра эканомікі ў сваім выступленні адзначыў, што хоць у прагнозах на гэты год стаўка рабілася на выкананне якасных паказчыкаў, але фактычна атрымалася, што эканамічны рост па-ранейшаму забяспечваецца за кошт аб'ёмных паказчыкаў:

— Падчас прагнозаў мы вызначылі для апрацоўчай прамысловасці апераджальны рост дабаўленай вартасці над аб'ёмамі прамысловай вытворчасці. Гэта была прынцыповая, важнейшая пазіцыя, якая закладвалася ў прагноз і дэманстравала тое, што эканамічны рост павінен быць забяспечаны менавіта за кошт якаснага складніка. Але за 1 квартал дабаўленая вартасць хоць і расла вельмі вялікімі тэмпамі (112,8%), але валавы выпуск за гэты перыяд вырас больш (114%). Такім чынам, нам не ўдалося дабіцца менавіта якаснага росту эканомікі з пункту гледжання прамысловай вытворчасці, — сказаў Аляксандр Ярашэнка.

Аляксандр Ярашэнка таксама перакананы, што якраз-такі выкананне якасных прагнозных паказчыкаў дазволіць скарациць адмоўнае сальда знешняга гандлю таварамі і паслугамі, якое за студзень-май 2011 года склалася ў памеры мінус 2,6 мільярда долараў і пагоршылася ў параўнанні з аналагічным перыядам 2010 года на 772,2 мільёна долараў.

— Выкананне якасных паказчыкаў з улікам росту цэн на імпартныя сыравіну і матэрыялы павінна забяспечыць станоўчую дынаміку, якая намецілася, па скарачэнні адмоўнага сальда знешняга гандлю. Бо зараз дэвальвацыя нацыянальнай валюты аказала пазітыўны ўплыў на развіццё знешняга гандлю, што паказваюць адпаведныя лічбы. У прыватнасці, у маі захаваўся на рэкордна высокім узроўні (3,5 мільярда долараў) вартасны аб'ём экспарту тавараў. Сёлета за 5 месяцаў упершыню за апошнія некалькі гадоў тэмпы росту экспарту тавараў перавысілі тэмпы росту імпарту (161,2% супраць 156,7%). У выніку сёлета ў маі сальда знешняга гандлю таварамі і паслугамі ўпершыню, пачынаючы з лютага 2010 года, было станоўчым і склала 116 мільёнаў долараў.

— Мне б хацелася зрабіць выснову, што, нягледзячы на наяўнасць пэўных складанасцяў, эканоміка Беларусі пачала рух у бок збалансаванасці. Я хачу яшчэ раз падкрэсліць, што асновай для збалансаванасці, для далейшага ўстойлівага эканамічнага росту Міністэрства эканомікі бачыць паляпшэнне менавіта якасных паказчыкаў гаспадарчай дзейнасці кожнай арганізацыі. Гэта з'яўляецца ў канчатковым выніку раззервам і ключавым фактарам у павышэнні канкурэнтаздольнасці эканомікі краіны.

Бюджэтнікі атрымаюць індэксацыю зарплат, калі інфляцыя будзе больш чым 5% за месяц

Асобна журналісты пацікавіліся пра зарплаты: ці чакаць іх рост у бліжэйшы час? Аляксандр Ярашэнка патлумачыў: зараз пакуль захоўваецца рост рэальнай зарплаты над прадукцыйнасцю працы:

— Статыстыкай зафіксаваны рост рэальнай зарплаты насельніцтва на 19,6% (прадукцыйнасць працы выраслa на 12,3%. — **Аўт.**), — кажа ён. — А галоўная задача збалансаванага росту заключаецца ў тым, каб прадукцыйнасць працы і зарплата былі адэкватныя і эквівалентныя. Гэта якраз тая аснова збалансаванасці, якой мы дабіваемся і якая павінна быць у эканоміцы.

Пры гэтым ён адзначыў, што індэксацыя даходаў будзе, калі інфляцыя перавысіць 5% за месяц:

— Будзе праведзена індэксацыя даходаў у сувязі з інфляцыяй, калі ў нас будзе перавышэнне інфляцыяй 5-працэнтнага парога. Для работнікаў бюджэтных арганізацый гэтая індэксацыя будзе праводзіцца ў абавязковым парадку за кошт бюджэтных сродкаў.

А вось калі казаць пра арганізацыі рэальнага сектара эканомікі, то там аналагічная кампенсацыя таксама прадугледжана, але такі механізм павінен быць запісаны ў калектыўнай дамове гэтай арганізацыі:

— Аплата працы павінна быць адназначна зарыентавана на прадукцыйнасць: калі арганізацыі рэальнага сектара могуць сабе дазволіць з пункту гледжання прыбытку і рэнтабельнасці продажаў павысіць сваім работнікам зарплату, то мы гэта толькі вітаем. Але такое павышэнне не павінна быць на шкоду ні самому прадпрыемству, ні эканоміцы Рэспублікі Беларусь, — адзначыў Аляксандр Ярашэнка.

Павел БЕРАСНЕЎ.

Закончэнне. Пачатак на 1-й стар.

Калі зарплата ненаяўная, значыць, гэта каму-небудзь трэба...

— Не ад добрага жыцця мы на гэта пайшлі, — гаворыць **намеснік генеральнага дырэктара ААТ «Гомельдрэў» Анатоль МАЛАФЕЕЎ**. — У нас працуе каля 4 тысяч чалавек. Складаная сітуацыя пачалася з мая. Мы думалі, як падтрымаць людзей. Па-першае, прынялі рашэнне аб падняцці заработнай платы са жніўня на 10-17 %. У чэрвені рыхтавалі дакументы. Але ж, каб людзі не хвалявaліся два месяцы, рашылі зрабіць гэта загадзя. Мы варыянт з натуральнай аплатай падгледзелі ў сваіх калег у Бабруйску. Што гэта дае для прадпрыемства? Спадзяёмся павялічыць абаротныя сродкі. Такое рашэнне дае магчымасць каля 500 мільёнаў рублёў штомесяц пакінуць на прадпрыемстве. Калі б у нас сёння хапала грошай, мы не ўводзілі б такую форму аплаты. У нас сярэдні заробак за май быў — 823 тысячы. Цяпер сярэдняя зарплата — больш за мільён. Працаўнікам гэтыя грошы залічваюцца ў заробак, і ў будучыні гэта ўплывае на памер пенсіі. Тыя грошы, што ідуць на картку, можна патраціць і ў сталовай, і ў харчовай краме, і ў мэблевай, і крэдыты беспрацэнтныя пагасіць.

Старшыня прафкама прадпрыемства ААТ «Гомельдрэў» Уладзімір ХОМЧАНКА лічыць, што сёння на прадпрыемстве вышукваюцца ўсе магчымасці, каб выжыць, перацярпець і дапамагчы людзям:

— Зараз вялікія запасы нерэалізаванай прадукцыі знаходзяцца не толькі на складах, але і цэхі застаўленыя мэбляй. Аднак ніводнага чалавека ў нас не адправілі на свой кошт, не звольнілі і не скарацілі. Натуральная форма аплаты ініцыявана найманымнікам. Рашэнне аб выдачы часткі заробку не наяўнымі грашыма прынята ў сувязі з цяжкім становішчам, якое склалася. Мы хадзілі па цэхах, тлумачылі людзям: ну няма наяўных грошай, каб павышаць заробак, таму пайшлі на такое рашэнне. Справа ў тым, што, каб своечасова выплаціць заробак, даводзілася браць крэдыты ў банку пад вельмі высокія працэнты. А гэта — непасільны цяжар для прадпрыемства. Таму і было прынята такое рашэнне.

Той самы Мюнхгаўзен?

Што казаць, рашэнне адміністрацыі нагадвае дзеянні Мюнхгаўзена, які каня і сябе за валасы выцягвае з дрыгвы. Грошы супрацоўнікаў, якія застаюцца на прадпрыемстве, могуць дапамагчы выратаваць вялікае прадпрыемства, якое сёння, сапраўды, знаходзіцца не ў лепшым фінансавым становішчы. Але ж гэтае рашэнне не вельмі папулярнае. І зразумела, што яно не можа падабацца людзям, якія і так пацярпелі ад дэвальвацыі беларускага рубля. І яны справядліва лічаць, што 10 % надбаўкі да заробку ніяк не кампенсуюць іх страты. Аднак і яны не могуць не разумець, што калі прадпрыемства канчаткова «ляжа», то ўсе ўвогуле страцяць працу і сродкі для існавання. Вось таму і маўчаць, і прымаюць без радасці, але ж з разуменнем выйсце, якое прапануе наймальнік.

— Людзі — большасць — нас разумеюць, — кажа намеснік генеральнага дырэктара ААТ «Гомельдрэў» Анатоль Малафееў. — Мы прайшлі ўсе цэхі, тлумачылі людзям, што тыя 10 %, якія дадалі да зарплаты, будуць ісці на картку. Каля 20 % нашых супрацоўнікаў узялі крэдыты і купляюць нашу мэблю, многія харчуюцца ў сталовай, купляюць тавары ў нашай краме. Картка гэтая накапляльная. Калі не патраціў грошы ў гэтым месяцы, можаш накапіць і купіць нешта вялікае потым. Я сам у трох самых буйных цэхах з людзьмі размаўляў. Спачатку гэты загад не падпісалі 27 чалавек. Цяпер іх засталося пяцёра. У Бабруйску, ведаю, таксама знайшоўся адзін чалавек, які ў аналагічнай сітуацыі падаў у суд на адміністрацыю. Але ж адміністрацыя выйграла суд. Штомесяц мы перавodзім людзей на працу па кантракце, але пакуль не ўсе на кантрактах. І мы прапішам гэтую ўмову ў кантрактах — тэрмін да канца года.

Закон не дышаль

Цяпер зноў да юрыдычнага боку справы. **Працоўны арбітр па Гомельскай вобласці Наталля САКАЛОВА**, якая наведала прадпрыемства і пазнаёмілася з дакументамі, лічыць, што прымяненне найманым змешанай формы аплаты замест грашовай з'яўляецца для працаўнікоў зменай істотных умоў працы:

— У адпаведнасці з артыкулам 32 Працоўнага кодэкса Рэспублікі Беларусь, наймальнік абавязаны папярэдзіць працаўніка пра змену істотных умоў працы пісьмова не пазней чым за адзін месяц, паказаўшы абгрунтаваныя вытворчыя, арганізацыйныя ці эканамічныя прычыны прынятага ім рашэння. У выпадку згоды працаўніка працягнуць працоўныя адносіны ў новых умовах, у працоўны дагавор (кантракт) павінны быць занесены змены пра ўжыванне змешанай формы аплаты, з указаннем у адпаведнасці з патрабаваннямі пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 2 жніўня 1999 г. №1180 «Аб устанаўленні прыкладнай формы кантракта наймальніка з працаўніком» і пастановы Міністэрства працы Рэспублікі Беларусь ад 27 снежня 1999 г. №155 «Аб устанаўленні прыкладнай формы працоўнага дагавора» пераліку тавараў, якімі будзе рабіцца натуральная аплата. Адмова працаўніка ад працягу работы ў сувязі са зменай істотных умоў працы з'яўляецца падставай для спынення працоўных адносін згодна з пунктам 5 артыкула 35 Працоўнага кодэкса Рэспублікі Беларусь.

Але ж супрацоўнікі прадпрыемства не атрымлівалі ніякіх апавяшчэнняў пра ўвядзенне віртуальных грошай. Пра гэта мне паведаміла зноў жа мая знаёмая, а не ананімны Вася. У такой паперы павінны быць названы матывы прыняцця непапулярнага рашэння і дакладна вызначана, якія тавары можна набываць у краме. Калі супрацоўнік згодны з новымі ўмовамі аплаты працы, ён падпіша паперу і працягне свой працоўны дагавор або кантракт, калі не — будзе шукаць працу ў іншым месцы.

— Калі гэта будзе напісана ў кантракце супрацоўніка, не будзе мець сэнсу скардзіцца, — падкрэслівае працоўны арбітр па Гомельскай вобласці Наталля Сакалова. — Калі чалавека сітуацыя не задавальняе і ён урэшце страчвае працу і падае ў суд, толькі суд дасць ацэнку, ці былі сапраўды дастатковыя прычыны, указаныя ў апавяшчэнні для змянення ўмоў аплаты працы.

Вам сядло вялікае, дыван і тэлевізар?..

Дарэчы, натуральная аплата не можа выдавацца таварамі, пералік якіх зацверджаны пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 28 красавіка 2000 г. № 603. Да іх ліку адносяцца нафтапрадукты, гаруча-змазачныя матэрыялы; лекавыя сродкі, вырабы медыцынскага прызначэння; дэзынфекцыйныя сродкі; **алкагольныя напоі; тытунёвыя вырабы;** наркатычныя рэчывы; нехарчовая спіртазмяшчальная прадукцыя, у тым ліку парфумна-касметычная, з аб'ёмнай доляй спірту этылавага ад сямі і вышэй адсоткаў; каштоўныя металы, каштоўныя камяні ў любым выглядзе і стане; выбуховыя і атрутныя рэчывы, прамысловыя выбуховыя матэрыялы.

Прынамсі, пакуль не зразумела, якім чынам прадавец будзе вызначаць і дзе адзначаць, якія тавары канкрэтна пакупнік набыў па картцы ААТ «Гомельдрэў»? Таму што, акрамя цукру і каўбасы, тут прадаюцца і гарэлка, і піва, і цыгарэты, забароненыя для продажу па натураплаце. Тым больш што ў кантрактах (ці працоўных дагаворах) супрацоўнікаў завода дагэтуль не гаворыцца ні аб апланце натуральным прадуктам, ні ўдакладняецца якім.

Працоўны арбітр па Гомельскай вобласці рэкамендавала правесці дадатковую тлумачальную работу ў працоўным калектыве ААТ «Гомельдрэў» і пераканацца ў згодзе працаўнікоў на змену формы аплаты працы. Намеснік генеральнага дырэктара прадпрыемства Анатоль Малафееў пасля візіту на прадпрыемства Наталлі Сакаловай пераконваў мяне, што практычна вырашаны пытанні са згодай супрацоўнікаў на новую форму аплаты працы. Застаюцца пытанні: чаму гэта своечасова не праведзена праз адпаведныя юрыдычныя дакументы? І як цяпер будуць афармляцца змяненні ў кантракты і працоўныя дагаворы — заднім числом? Ці будзе зменена размытая фармулёўка ў калектыўным дагаворы, якая дапускае розныя варыянты аплаты працы?

Ці быў чарвяк у цукерках?

Што тычыцца крамы і тавараў у ёй, тут адназначна нельга праверыць, якія прадукты і калі не задаволілі нашага чытача Васю: «...не першай свежасці. Былі выпадкі, што ў піражках, цукерках шаколадных і інш. былі чарвякі». Калі такі факт быў, дзе і кім ён зафіксаваны? Напрыклад, у акце праверкі санітарнымі службамі, у кнізе скаргаў?.. Зразумела ж, на прадпрыемстве (а крама з'яўляецца адным са структурных падраздзяленняў ААТ «Гомельдрэў») аспрэчылі такую заяву, як галаслоўную. Фактаў, каб адносіцца да яе інакш, няма.

Дарэчы, як і да заявы пра надзвычай высокія цэны на бытавую тэхніку. Нагадаю, паводле слоў Васі, «халадзільнік у звычайнай краме каштуе 2 мільёны, у краме ААТ «Гомельдрэў» — 3 мільёны». Сёння ўсе разумеюць, што так абстрактна параўноўваць нельга. Ёсць цана на канкрэтныя мадэлі тэхнікі. І калі іх параўноўваць з цэнамі ў іншых магазінах — атрымліваецца прыкладна на адным узроўні. Больш за тое, супрацоўнікі прадпрыемства, калі назапасілі пэўную суму на сваёй картцы, могуць набыць халадзільнік ці пральную машыну пад індывідуальны заказ — калі цана задавальняе.

Спадзявайся і чакай

Сёлета на тэрыторыі мяркуецца закончыць будаўніцтва новага лесапільнага завода з самым сучасным абсталяваннем з Германіі, які заменіць састарэлы цэх лесапілення. Кіраўніцтва ААТ «Гомельдрэў» упэўнена, што з яго ўводам вырашацца праблемы ўсяго прадпрыемства, бо ўжо сёння ў краінах замежжа ёсць попыт на будучую прадукцыю. Дажывём да восені.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

На «Карміну Бурану» — у Жодзіна

Дабрачынная акцыя ў рамках міжнароднага культурнага праекта «Interface-2» пройдзе ў гэтыя выхадныя.

30 ліпеня ў 18 гадзін і 31 у 15.30 у Жодзіне на сцэне Палаца культуры Беларускага аўтамабільнага завода адбудзецца прэм'ера сусветна вядомага балета «Карміна Бурана» на музыку нямецкага кампазітара Карла Орфа. Пастаноўку балета, у якой занятыя 100 маладых непрафесійных выканаўцаў з нямецкіх гарадоў Бохума, Дортмунда, Дуйсбурга, Кёльна, Эсэна і іншых, а таксама з Мінска, Ельска і Жодзіна, ажыццявіла вопытны харэограф і кіраўнік тэатра і школы танца ў Дуйсбургу Ула Вельтыке.

Арганізатары дабрачыннай акцыі — кіраўнік ініцыятывы «Дзеці Чарнобыля» Дагмар фан Эмерых з Германіі і Жодзінскі гарвыканкам. Прэм'еру могуць паглядзець не толькі жодзінцы, але і госці горада. Дарэчы, **31 ліпеня, у нядзелю, ад будынка Нацыянальнай бібліятэкі ў 14 гадзін будуць адпраўляцца ў Жодзіна спецыяльныя аўтобусы.** І праезд, і наведванне мерапрыемства — бясплатныя.

Ул. інф.

«АДЗІН СУПРАЦЬ УСІХ» АБО ЎСЁ СУПРАЦЬ АДНАГО

Выпрабавана на сабе

Карэспандэнт «Звязды» даведаўся, што адчуваюць удзельнікі адной з папулярнейшых інтэлектуальных перадач беларускага ТБ

Прыйсці на здымкі праграмы «Адзін супраць усіх» у майцы з голым пупком можна, але не варта. «Пазбягайце кароткіх маек, — настаўляла па тэлефоне рэдактар Галіна, — можа стацца так, што перадачу пакажуць узімку. Не апранайце касцюмы ў палоску і адзенне з брэндамі і рэкламай. За дзень пішам тры перадачы: першыя дзве — адразу. Затым перапынак і запіс трэцяй». Падабраўшы нейтральную вопратку і прагартаўшы энцыклапедычны даведнік па біялогіі (на ўсякі выпадак), я быў гатовы да штурму інтэлектуальнага шоу, у якім, калі верыць рэкламе, кожны можа зарабіць сваім уласным розумам.

ЗДЫМКІ праходзілі ў Палацы спорту. Перасовачныя камеры, здаравенная дэкарацыя, безліч вялікіх і малых свяцільняў, кіламетры правадоў. Вось ніколі не скажаш, што яшчэ ўчора на гэтым месцы гулялі ў хакей.

Адміністратары папярэдзілі, каб мы сходзілі ў прыбіральню: «Чатыры гадзіны запар вы не зможаце нікуды выйсці. Калі хтосьці ўстане і пойдзе, мы вымушаны будзем спыніць запіс праграмы і затым пачынаць усё наноў». У студыю нас запускалі групамі. Спачатку балельшчыкі, затым масоўка і толькі пасля мы — 50 удзельнікаў, якім пашчасціла прайсці адбор на сайце АНТ.

Не пазяхай і крычы «гуляй»

Каб дайсці да свайго месца, давялося ў прамым сэнсе адчуць сябе чапляй. Мы падымаліся па адмысловых металічных прыступках, высока задзіраючы ногі, і моцнай хваткай трымаліся за парэнчы. Вышыня — не жартачкі. Мне, напрыклад, давялося сядзець на вышыні ў шэсць метраў ад падлогі.

Я быў зусім наіўны і думаў, што неўзабаве да нас выйдзе Калдун-вядучы і казка пачнецца. Але Жора выйшаў толькі праз паўгадзіны — увесь гэты час ішла настройка камер і праводзіўся інструктаж. Спачатку кропкі над «і» расставілі масоўцы: рукою твар не падпіраць, у камеру не пазяхаць і не пацягвацца. Накладалася табу на жуйкі і вібрацыю тэлефонаў. «Усміхаемся і падтрымліваем галоўнага гульца, — уводзіла ў курс адказная за масоўку. — Памятайце, ваша мантра — бадзёрасць і весялосць.» Для кіравання эмоцыямі гледачоў у зале быў нават асобны чалавек. Калі ён падымае таблічку з выявай далоняў — трэба пляскаць. Калі там літара «у» — трэба выказаць абурэнне, даючы зразумець, што пытанне лёгкае, а чалавек, не ведаючы адказу, вагаецца. Калі ж у гульца спытаюць: «Гульня ці грошы?» — усю масоўку прасілі хорам крычаць слова «гуляй!».

Дазвалялася рабіць і фотаздымкі, адзінае — прасілі, каб іх мы рабілі ў перапынках паміж здымкамі. Таксама ўсім было растлумачана, што рабіць, калі камусьці з нас раптам стане дрэнна.

Адзін супраць пяцідзесяці

Прайшло яшчэ хвілін пятнаццаць, пакуль нам патлумачылі, як карыстацца пультамі для адказаў. Яшчэ хвілін пяць здымалі агульны план: камера «ездзіла» каля нас і фіксавала, як мы націскаем кнопкі — гэта каб пазней не здымаць па некалькі разоў адно і тое ж дзеянне. Дадаткова мы адрэпеціравалі крычаць слова «ўсіх» — момант, калі вядучы агучвае назву перадачы.

У нас на сталах, акрамя парадкавага нумара і запаветнай кнопкі, больш нічога няма. А вось пад сталом — у каго што. У аднаго — сумка, у другога — бутэлька мінералкі, у мяне — кавалак шакаладкі.

Адлегласць паміж гульцамі — метр. Збоку на кожнага з нас быў накіраваны пражэктар, які ярка свяціў у твар, і часам здавалася, што мы ў салярыі. Але варта было памыліцца з адказам, як «салярый» адразу патухаў і мы ўраз адчувалі сябе «цёмнымі» людзьмі.

Удзельнікі — ад высокіх і хударлявых да нізкіх і паўнаватых. Нават цяжка было вызначыць, каго тут больш — мужчын ці жанчын. Адны сядзелі як Эйнштэйн, чым нагадвалі шасцікласнікаў на алімпіядзе па гісторыі, іншыя — прыветліва азіраліся па баках, шукаючы, з кім бы пагаварыць.

Вядучы Георгій Калдун усміхаўся і, як заўсёды, шмат жартаваў. Калі б не яго аптымізм, мы, напэўна, ад суму б скіслі. Часта падводзіла тэхніка: то камп'ютар з пытаннямі завісаў, то каму-небудзь з удзельнікаў мянялі батарэйку ад пульта. Калі над першым гульцом — пенсіянеркай Галінай Пятроўнай — варажылі грымёры, гадзіннік паказваў, што мы прасядзелі тут ужо гадзіну і пятнаццаць хвілін. А запіс, па сутнасці, нават і не пачынаўся.

Калі над першым гульцом — пенсіянеркай Галінай Пятроўнай — варажылі грымёры, гадзіннік паказваў, што мы прасядзелі тут ужо гадзіну і пятнаццаць хвілін. А запіс, па сутнасці, нават і не пачынаўся.

Статуя Свабоды і «Маскоўскі дворык»

Галіна Пятроўна аказалася моцным арэхам і з дапамогай джокераў дайшла да сёмага ўзроўню складанасці. Разам з ёй туды дайшло яшчэ дванаццаць з пяцідзесяці. У тым ліку і карэспандэнт «Звязды».

Калі вядучы спытаў у пенсіянеркі пра аўтара карціны «Маскоўскі дворык», я зразумеў, што, гартаючы даведнік па біялогіі, трошку памыліўся з выбарам. З прапанаваных варыянтаў — Паленаў, Сурыкаў і Верашчагін — мне чамусьці прыглянуўся апошні. Але той, як высветлілася, карцін з такой назвай не пісаў. У выніку — пражэктар згас як нада мною, так і яшчэ над дзевяццю ўдзельнікамі. Шчаслівая Галіна Пятроўна не магла нарадавацца: яна будзе гуляць адна супраць дваіх.

Аднак азарт кабету падвёў. На пытанне, якія з помнікаў архітэктуры ўваходзяць у спадчыну ЮНЕСКА, пенсіянерка выбрала Астанкінскую тэлевежу ў Маскве, лічачы, што якраз гэта вежа, а не Парыжская Эйфелева ці статуя Свабоды ў ЗША, уключаны ў знакаміты спіс. Чым кіравалася Галіна Пятроўна? Яна паглядзела, як адказалі тыя двое гульцоў ў зале. Пабачыўшы, што ніводзін з іх не выбраў вежу ў Маскве, вырашыла рызыкнуць. Калі б яе варыянт аказаўся правільным, яна б забрала ўсе грошы адна.

Рызыка не апраўдалася, і выйгрыш перайшоў да трэнера па боксе, які, па яго прызнанні, варыянт пра статую Свабоды выбіраў інтуітыўна.

Для кіравання эмоцыямі гледачоў у зале быў нават асобны чалавек. Калі ён падымае таблічку з выявай далоняў — трэба пляскаць. Калі там літара «у» — трэба выказаць абурэнне, даючы зразумець, што пытанне лёгкае, а чалавек, не ведаючы адказу, вагаецца. Калі ж у гульца спытаюць: «Гульня або грошы?» — усю масоўку прасілі хорам крычаць слова «гуляй!».

Музыка, хімія і... Біблія

Далей — больш. Вы яшчэ не пераглядзелі савецкія мульцікі пра Папялушку, «Ну, пачакай» і Шчаўкунчыка? А класіку амерыканскага джаза і рока пераслухалі? Вельмі раю, бо пытанні з гэтай сферы ў перадачы чамусьці ў фаворы. Але загадваць наперад — рэч няўдзячная.

Нават калі вам удасца адрозніць голас Папялушкі ад голаса «якойсьці» дзяўчынкі са «Шчаўкунчыка», школьны курс хіміі нехта можа і не ўзгадаць. У нашай гульні пыталіся, як адрозніваць балык ад кумпяка і хто быў першым мінскім князем. Здараліся і неспадзяванкі: на другім пытанні, пераблытаўшы на экране люцікі

Селішча не было для Купалы шчаслівым.
Але без яго не было б Купалы.

У ПОШУКАХ КУПАЛАЎСКІХ ХУТАРОЎ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Селішча, Калдукоўка, Міхалішкі і Ляўшова, Радзькоўшчына, Прытыкі, Шкоды і Парабкі... Цяпер гэтыя назвы з'яўляюцца толькі моўным абазначэннем урочышчаў у штодзённых стасунках мясцовых жыхароў. Можна выпадкова апынуцца ў месцы, дзе жылі прататыпы герояў вядомых нам купалаўскіх твораў (напрыклад, тая ж славутая Паўлінка з вядомай камедыі), і нават не здагадвацца пра гэта.

Блукаць па лесе, не ведаючы дарог, — марная справа. Без правадніка не абысціся. Мне пашанцавала на знаўцу мясцовасці. Віктар Радкевіч нарадзіўся і жыве ў Харужанцах. Нягледзячы на ўзрост — яму толькі 45 гадоў — ведае ўсе навакольныя куточкі і ўрочышчы і можа, што называецца, з заплюшчанымі вачыма прывесці ў любы з іх. Спачатку мы выпраўляемся ў Селішча.

На Лагойшчыне ёсць некалькі вёсак з гэтай назвай. Але Селішча, якое ў лёсе Купалы было самай трагічнай старонкай, знаходзіцца паміж вёскамі Вялікія і Малыя Бясяды, недалёка ад скрыжавання на Аскрышава. Добрым арыенцірам якраз можа паслужыць вялікая звалка смецця. Як гэта ні дзіўна і сорамна. Якраз за ёю і адкрываецца від на Селішча. Ніякіх указальнікаў, на жаль, там няма. Выходзім на край поля. Віктар паказвае кудысь убок — туды, дзе над зялёнай рунню ўзвышаецца курганок з купінай дрэў.

Селішча — гэта і калыска Купалы-паэта. Менавіта тут ён напісаў свой самы першы верш у жыцці (няхай сабе і на польскай мове), які прысвяціў сястры.

Перад намі поле, на якім калісьці праліваў пот бацька Купалы — Дамінік Ануфрыевіч Луцэвіч. Апошняе поле яго жыцця.

— Хутчэй за ўсё хата, скляпы і хлявы стаялі ніжэй — там, дзе цяпер лес. Там быў і сад, — дзеліцца меркаваннямі Віктар. — У нізкім месцы цякла ручаіна, біла крыніца. Зручна было насіць ваду ў хату і паіць свойскую жывёлу. На гары была пуня.

Мінула больш за сто гадоў, краявід моцна змяніўся, але там, дзе калісьці працавалі Луцэвічы, поле па-ранейшаму жывое, хлебадайнае. Сёлета на ім расце авёс. І нічога не сведчыць пра вялікую трагедыю. Толькі цёмныя хмары спяшаюцца ўтварыць на небе чарговую навальніцу і праліцца дажджом.

У Селішча Луцэвічы пераехалі ў 1895-м. Вясною 1902 годзе ва ўзросце 56 гадоў тут памёр бацька. Янку ішоў дваццаты год. Увосень здараецца яшчэ большая бяда: літаральна за тыдзень паміраюць дзве малодшыя сястры і брат. Чатыры смерці за адзін год — занадта вялікая страта для адной сям'і. Зямлю, узятую ў арандатарства, трэба было даглядаць, і Янка застаецца на гаспадарцы за старэйшага.

Родных ён пахаваў у вёсцы Корань — за 20 кіламетраў ад Селішча. Дарога на могілкі вяла праз Янушкавічы, Гайну, Слабаду. Трагедыя абудзіла ў душы маладога паэта сумныя думкі: «Мая доля, дык вось доля, каб ты лопнула была!» — узгадваюцца радкі першага верша Купалы на беларускай мове. «З Селішча Купала часта хадзіў у Малыя Бясяды ў маёнтак пана Чаховіча па кнігі, бо там была добрая бібліятэка» — успамінаў колішні тутэйшы жыхар Ф. Гінтаўт. Дарога вяла праз Калдукоўку.

Каб трапіць у яе, перасякаем кавалак лесу з рэліктавымі елкамі, крадзёмся паўз высахлую ручаіну, абмінаем забалочаную выспачку з лёжкамі дзікоў. Напэўна, для лясных насельнікаў тут спакойнае месца. Віктар дакладна ведае, дзе трэба збочваць, каб не прамінуць урочышча. Спускаемся ўніз, пераскакваем яшчэ не перасохлы струмень вады і выныраем на паляну, поўную кветак. Гэта і ёсць Калдукоўка. Праз траву ў рост чалавека прабіваемся на вяршыню пагорка. Адчуваецца, даўно тут не працавала дзедава каса.

— Здаецца, зусім нядаўна гэты куток служыў сенакосам вяскоўцам, а цяпер гэта — непатрэбная зямля, — зазначае мой спадарожнік.

На ускрайку паляны пад кустом каліны ляжыць металічная ёмістасць — схованка для паляўнічых. Жывёлы тут дастаткова, водзіцца казуля, распладзіўся алень. Вядома, паляўнічыя не прымусілі сябе чакаць.

Па ўспамінах паэта, ён добра ведаў гаспадара Калдукоўкі — апалячанага беларускага шляхціча Павэлка Ваяводскага, ведаў ягоныя звычкі і норавы. Некаторыя даследчыкі мяркуюць, што фанабэрысты Ваяводскі стаў прататыпам галоўнага персанажа камедыі «Паўлінка» — Адольфа Быкоўскага.

Шкада, што ні Селішча, ні Калдукоўка не ўключаны ў турыстычныя маршруты, не з'яўляюцца часткаю музейнай экспазіцыі. Але найбольш шкада, што яны наогул знікаюць з нашай памяці.

— У Акопы раней вяла іншая дарога, — кажа Віктар і просіць спыніць аўто. — Яна праходзіла там, дзе цяпер стаіць зарослы лесам бетонны «дот». Гэта быў шлях з Карпілаўкі на Лысую Гару.

Перад вайной з мэтай умацавання памежжа Савецкай Беларусі шмат дзе ўзводзіліся ўзмоцненыя агнявыя кропкі. Адзін з дотаў быў узведзены якраз насупраць зямлі Луцэвічаў. Але ні маці, ні сам Купала ў той час у Акопах ужо не жылі. Пасля раскулачвання, каб не патрапіць у Сібір, Бянігна Іванаўна ад сваёй гаспадаркі адмовілася.

Не з першай спробы Віктар знаходзіць колішнюю агнявую кропку, нагэтулькі яна «замаскіравалася» пад лес. Нам удаецца праціснуцца ў цёмнае сырое памяшканне і зрабіць агледзіны. І нават некалькі здымкаў. З часу выходу з кропкі вайскоўцаў у бетонным склепе мала што змянілася. Адно іржою пашкоджана жалеза.

Але наш шлях да ўрочышчаў Рубеж і Моцеўшчына. Яны ў адным ад Акопаў кірунку. Вядома, што, гасцюючы ў маці ў Акопах, паэт часта наведваў гэтыя засценкі, да якіх было кіламетр з хвосцікам.

У Рубяжы жылі чатыры сям'і Давідовічаў і сям'я сваякоў Купалы Аўлачынскіх. Па дарозе на Рубеж мы трапляем на колішні хутар з назваю Кантора, знаходзім у высокай траве помнік брату і сястры Канцавікам, забітых немцамі за дапамогу партызанам.

— Некалі я пасвіў тут вясковых кароў, — зазначае Віктар і шукае месца, дзе стаяў дом, хлявы, студня, лазня. Знаходзім штучны ставок.

— Дарога была добрая, сена вазілі на калёсах. Цяпер нават не прайсці.

Як і ў Калдукоўцы і ў Селішчы, у Рубяжы таксама ёсць лагчына з крыніцаю. І ставок дагэтуль «стаіць». Растуць старыя клёны, бэз, яблыні. Але галоўныя сведкі мінулага — рэшткі падмуркаў. Даўжыня аднаго — каля дваццаці крокаў. Парачка вялізных ліп сведчыць пра месца ўезду на былы хутар. Сапраўдным асілкам падаецца дуб, да якога, не сумняваюся, дакраналіся і далоні паэта.

Крыху ў баку ад Селішча і Калдукоўкі захаваліся абрысы старога Даўгінаўскага гасцінца, абсаджанага ліпамі.

Рубеж цікавы найперш тым, што адна з дачок Аўлачынскіх, Ядвіга, стала прататыпам Паўлінкі. Бацька Ядвігі — Гіляры Аўлачынскі — у камедыі названы Сцяпанам Крыніцкім. Дарэчы, адзін з эпізодаў п'есы, калі Паўлінка ўцякае да настаўніка праз акно, а яе бацька страляе з паляўнічай стрэльбы, — гістарычны факт. Адбыўся ён ў засценку Ляўшова.

Рубяжоўскі ўзгорак цяпер засаджаны маладымі хвойкамі, але за імі яшчэ відаць поле колішняй Моцеўшчыны. Праз некалькі гадоў лес паглыне і гэтыя рэшткі памяці.

Калі пайсці ад Акопаў у супрацьлеглы бок, патрапіш у Рубяжок. Дарога на Лысую Гару, куды Купала асабліва часта наведваўся падчас летніх прыездаў, прывядзе на былы хутар Навасады. А калі браць кірунак на Сухую гару, напаткаеш Галубоўшчыну.

Пазней бацька майго спадарожніка, Фелікс Мацвеевіч Радкевіч, скажа, куды падзеліся ўсе гэтыя «футары».

— У 1939-м аднаасобнікаў сталі сцягваць у калгас, і паміж колішнімі засценкамі Айчызна, Ляўшова, Міхалішкі і Харужанцы ўтварылася вёска з аднайменнай назвай. А музей знаходзіцца якраз на тэрыторыі колішніх Міхалішак, апошняй гаспадыняй якіх была сястра Купалы.

А яшчэ стары Радкевіч прыгадаў, што ў гэтых мясцінах было шмат ваўкоў.

— Сядуць на гары і выюць.

Пасля гэткіх успамінаў харужанца міжволі падумалася: ці не тут нараджаліся купалавы радкі для паэмы «Курган»: «У піпіпаўку воўк нема вые»?

Фелікс Радкевіч і ягоны сын Віктар жывуць якраз на месцы старых Харужанцаў. Янка Купала любіў прыязджаць сюды на фэсты і кірмашы. Тут у яго было шмат сяброў, тут падглядаў тыпажы і характары, «падслухоўваў» жыццёвыя гісторыі, запісваў вясёлыя байкі. Напэўна, каб дзядзька Фелікс жыў у тыя часы, то абавязкова стаў бы адным з каларытных тыпажоў, з якіх Купала змалёўваў партрэты сваіх герояў. Бо гэткі ж дасціпны і гаваркі, як многія асобы славутых твораў.

Віктар Радкевіч працуе ў музеі ў якасці рабочага. Косіць траву, сочыць за парадкам. Нядаўна ў Акопах зрабіў новую агароджу. Магчыма, якраз яму і давядзецца вяртаць з нябыту лясныя сцежкі да Купалы.

Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.

Лагойскі раён.

Нарэшце на месцы сядзібы Ядвігіна Ш. у Карпілаўцы з'явіўся ахоўны знак.

«БЕЛАРУСЬКАЛІЙ»: НІЯКАЙ ПАГРОЗЫ ЗАТАПЛЕННЯ РУДНІКА НЯМА

Ніякай пагрозы затаплення рудніка другога рудаўпраўлення ААТ «Беларуськалій» няма. Аб гэтым паведаміў 28 ліпеня журналістам галоўны інжынер прадпрыемства Уладзімір Шпакоўскі, перадае БЕЛТА.

Нагадаем, 24 чэрвеня на руднік другога рудаўпраўлення ААТ «Беларуськалій» было выяўлена выдзяленне расолаў у вырабатку. У Беларусі была сфарміравана міжведамасная камісія для кантролю сітуацыі на рудніку пад кіраўніцтвам першага віцэ-прэм'ера Уладзіміра Сямашкі. У склад камісіі ўвайшлі прадстаўнікі розных міністэрстваў і ведамстваў.

«Сітуацыя з расолапраяўленнем на другім рудніку пастаянна маніторыцца, штодзень працуюць штабы пад кіраўніцтвам генеральнага дырэктара, а таксама кожны тыдзень праводзяцца нарады пры першым віцэ-прэм'еры Уладзіміры Сямашку», — адзначыў галоўны інжынер. Ён паведаміў, што такая нарада прайшла 27 ліпеня. Уладзімір Сямашка спусціўся ў шахту і праверыў ход выканання работ па лакалізацыі расолапраяўлення. «Работы, якія вядуцца, прызнаны правільнымі, намечаны планы да наступнай нарады. Сітуацыя кіруемая і прагназуемая», — сказаў Уладзімір Шпакоўскі.

Ён адзначыў, што цяпер руднік і другое рудаўпраўленне працуюць у звычайным тэхналагічным рэжыме, выконваюцца запланаваныя паказчыкі.

«На работу рудніка такі прыток расолаў не паўплываў і не паўплывае», — сказаў галоўны інжынер. Уладзімір Шпакоўскі адзначыў, што многія калійныя рудні ў свеце працуюць з намнога большымі прытокамі расолаў. «Расолы ў калійнай шахце не страшныя, паколькі яны нічога не раствараюць. Гэты расол на рудніках адпампоўваюць і працуюць», — растлумачыў ён. Для таго, каб кантраляваць колькасць солі ў расолах і выключыць магчымасць наяўнасці прэснай вады, чатыры разы на дзень праводзіцца адбор проб і іх хімічны аналіз.

Гаворачы аб прычынах расолапраяўлення ў рудніку другога рудаўпраўлення, Уладзімір Шпакоўскі падкрэсліў, што размова ідзе, як мяркуецца, аб утварэнні ў саляноснай залежы карсту з вонкавых порыстых пародаў, у якіх ёсць расолы, а не аб наяўнасці падземнага возера. Такім чынам, ніякіх правалаў паверхні не можа быць, тым не менш сітуацыя знаходзіцца пад пастаянным кантролем спецыялістаў.

Фота БЕЛТА.

Уладзімір Шпакоўскі праінфармаваў, што праяўленне расолаў у рудніку другога рудаўпраўлення было выяўлена ўпершыню за 50 гадоў пры распрацоўцы радовішча. Для таго, каб прааналізаваць сітуацыю і выпрацаваць меры для лакалізацыі прытоку расолаў, былі запрошаны спецыялісты профільнага інстытута «Белгорхімпрам», іншых інстытутаў. Таксама «Беларуськалій» звярнуўся да польскіх спецыялістаў, якія маюць вопыт ліквідацыі такіх расолапраяўленняў на шахтах Польшчы. Акрамя таго, будзе праводзіцца аналіз, каб выключыць магчымасць такой сітуацыі ў будучым.

На дарогах гіне ўсё больш...

З пачатку года за парушэнні правілаў дарожнага руху супрацоўнікамі ДАІ прыцягнуты да адказнасці звыш мільёна чалавек. У першым паўгоддзі ў Беларусі зарэгістравана 2361 ДТЗ, у якіх 454 чалавекі загінулі і 2546 атрымалі раненні.

Паводле звестак упраўлення інфармацыі і грамадскіх сувязяў МУС, у параўнанні з аналагічным леташнім перыядам колькасць загінулых вырасла на 55 чалавек. Найбольшы рост зафіксаваны ў Брэсцкай і Гомельскай абласцях. Асноўнымі прычынамі гібелі людзей у ДТЗ па віне вадзіцеляў сёлета былі лабавыя сутыкненні. У сувязі з такой сітуацыяй супрацоўнікі ДАІ працягваюць несці службу ва ўзмоцненым рэжыме. Акрамя таго, актыўна праводзяцца прафілактычныя мерапрыемствы пад умоўнымі назвамі «Фільтр» і «Павуцінне», падчас якіх правяраецца фізічны стан вадзіцеляў, адпрацоўваюцца найбольш аварыйныя ўчасткі вулічна-дарожнай сеткі з выкарыстаннем сучасных тэхнічных сродкаў.

Святлана БАРЫСЕНКА.

ЗАВЕРЕНО
Директор Департамента по ценным бумагам
Министерства финансов Республики Беларусь
Гальперин А.Л.
29.07.2011 г.

CREDEX BANK

УТВЕРЖДЕНО
Наблюдательным Советом
ЗАО «Кредэксбанк»
18.07.2011, протокол № 29

КРАТКАЯ ИНФОРМАЦИЯ
об открытой продаже облигаций ЗАО «Кредэксбанк» седьмого выпуска

1. Полное наименование эмитента облигаций (на русском и белорусском языках).
На русском языке:
полное – Закрытое акционерное общество «Кредэксбанк»;
сокращенное – ЗАО «Кредэксбанк».
На белорусском языке:
полное – Закрытае акцыянернае таварыства «Крэдэксбанк»;
сокращенное – ЗАТ «Крэдэксбанк».

2. Дата и номер государственной регистрации эмитента как юридического лица, наименование регистрирующего органа.
Закрытое акционерное общество «Кредэксбанк» (далее – Банк) зарегистрировано Национальным банком Республики Беларусь в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей 27.09.2001 за № 807000030.

3. Место нахождения эмитента, телефон, факс, электронный адрес (E-mail).
Юридический и почтовый адрес: 220068, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Некрасова, дом 114, тел./факс (017)388-50-70, электронный адрес: mail@credexbank.by.

4. Сумма зарегистрированного уставного фонда.
Размер зарегистрированного уставного фонда составляет 55 835 208 000 (Пятьдесят пять миллиардов восемьсот тридцать пять миллионов двести восемь тысяч) белорусских рублей.

5. Наименование периодического печатного издания, в котором ежегодно будет публиковаться бухгалтерская отчетность эмитента, и сроки ее публикации.
Периодическое печатное издание – газета «Звязда».
Сроки опубликования – не позднее 25 апреля года, следующего за отчетным.

6. Место, время и способ ознакомления с более подробной информацией (проспектом эмиссии).
Ознакомиться с подробной информацией о выпуске облигаций можно начиная с даты публикации в средствах массовой информации текста краткой информации об открытой продаже облигаций:
- в ЗАО «Кредэксбанк» по адресу: г. Минск, улица Некрасова, дом 114 с 9.00 до 13.00 и с 13.50 до 16.00,
- на сайте www.credexbank.by.

7. Дата принятия решения о выпуске облигаций и наименование органа, принявшего это решение.
Решение о выпуске облигаций принято Наблюдательным Советом ЗАО «Кредэксбанк» 22 июня 2011 года, протокол № 25.

8. Номера расчетных счетов, на которые будут зачисляться средства, поступающие при открытой продаже облигаций:
№ 4940000000209 в ЗАО «Кредэксбанк», код 273, УНП 807000030 (для индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, не являющихся банками);
№ 4940000000300 в ЗАО «Кредэксбанк», код 273, УНП 807000030 (для банков).

9. Наименование депозитария, обслуживающего эмитента, (далее-депозитарий эмитента) его место нахождения, дата и номер государственной регистрации и наименование органа, его зарегистрировавшего, номер специального разрешения (лицензии) на осуществление профессиональной и биржевой деятельности по ценным бумагам, срок действия лицензии.
ЗАО «Агрокапитал», расположенное по адресу: 220004, г. Минск, пр. Победителей, дом 5, пом. 23, лицензия Министерства финансов Республики Беларусь № 02200/0385573 от 29.07.2007, срок действия лицензии до 29.07.2012.

10. Цель выпуска облигаций.
Привлечение свободных денежных средств юридических лиц и индивидуальных предпринимателей для формирования ресурсной базы Банка.

11. Место и время проведения открытой продажи облигаций.
Облигации размещаются путем открытой продажи юридическим лицам и индивидуальным предпринимателям – резидентам и нерезидентам Республики Беларусь.
Дата начала продажи – 1 августа 2011 года.
Дата окончания продажи – 30 апреля 2012 года.
Период обращения облигаций – с 1 августа 2011 года по 1 августа 2013 года (731 день).
Открытая продажа облигаций осуществляется:
- на внебиржевом рынке по адресу: 220068, г. Минск, ул. Некрасова,114 ежедневно в течение банковского дня на основании договора первичного размещения облигаций;
- на биржевом рынке в торговой системе ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа» в соответствии с регламентом торгов.
Дисконтные облигации продаются по цене ниже номинальной стоимости. Цена продажи одной облигации устанавливается ежедневно.
Юридические лица и индивидуальные предприниматели, изъявившие желание приобрести облигации на внебиржевом рынке, обязаны перечислить Банку денежные средства в безналичном порядке в соответствии с договором первичного размещения облигаций.
Расчеты при открытой продаже облигаций на биржевом рынке проводятся в соответствии с регламентом расчетов в ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа».
При расчете количества дней срока обращения (до погашения) день открытой продажи и день погашения облигаций считаются одним днем.

12. Форма выпуска и вид облигаций, объем эмиссии, количество, номинальная стоимость облигаций, срок обращения, период проведения открытой продажи облигаций, дата погашения облигаций.

Параметры	7 выпуск
Форма и вид облигаций	Именные, дисконтные, в бездокументарной форме
Валюта	Белорусский рубль
Объем эмиссии	30 000 000 000 (Тридцать миллиардов)
Количество облигаций (шт.)	300 000 (Триста тысяч) штук
Серия, номера облигаций	КР07 000001-300000
Номинальная стоимость	100 000 (Сто тысяч)
Дата начала продажи	1 августа 2011 года
Дата окончания продажи	30 апреля 2012 года
Срок обращения облигаций	с 1 августа 2011 года по 1 августа 2013 года (731 день)
Дата погашения	1 августа 2013 года

13. Условия и размер выплаты дохода по облигациям, и порядок его определения.
Доходность по размещаемому выпуску облигаций – 25 (Двадцать пять)% годовых при размещении по цене, установленной в первый день продажи. В последующие дни цена одной облигации в период открытой продажи устанавливается эмитентом ежедневно из расчета указанной доходности к погашению.
Доход по облигациям (дисконт) – разница между номинальной стоимостью облигации и фактической ценой ее продажи.
При расчете доход начисляется за каждый календарный день года.
Выплата дохода по седьмому выпуску осуществляется единовременно при погашении облигаций.
Доходность по дисконтным облигациям рассчитывается по следующей формуле:

$$П = \frac{(Н - Ц) \times 100}{Ц} / (\frac{Т365}{365} + \frac{Т366}{366}),$$

где:
П – доходность по дисконтным облигациям (процентов годовых);
Н – номинальная стоимость дисконтных облигаций (белорусских рублей);
Ц – цена продажи дисконтных облигаций (белорусских рублей);
Т365 – количество дней до погашения дисконтных облигаций, приходящееся на календарный год, состоящий из 365 дней;
Т366 – количество дней до погашения дисконтных облигаций, приходящееся на календарный год, состоящий из 366 дней.

Цена продажи дисконтной облигации рассчитывается по формуле:

$$Ц = \frac{100 \times Н}{П \times (Т365/365 + Т366/366) + 100},$$

где:
Ц – цена продажи дисконтной облигации;
Н – номинальная стоимость дисконтных облигаций (белорусских рублей);
П – доходность по дисконтным облигациям (процентов годовых);
Т365 – количество дней до погашения дисконтных облигаций, приходящееся на календарный год, состоящий из 365 дней;
Т366 – количество дней до погашения дисконтных облигаций, приходящееся на календарный год, состоящий из 366 дней.
Цена продажи облигаций на первичном рынке в первый день составляет 66667 (Шестьдесят шесть тысяч шестьсот шестьдесят семь) белорусских рублей (минимальная цена продажи).

Текущая стоимость дисконтных облигаций рассчитывается по формуле:

$$С = Ц + \frac{Ц \times П}{100} \times (\frac{Т365}{365} + \frac{Т366}{366}),$$

где:
С - текущая стоимость дисконтных облигаций;
Ц - цена дисконтных облигаций, определенная эмитентом в первый день продажи (белорусских рублей);
П – доходность по цене облигаций, (25 %);
Т365 – количество дней обращения облигаций, приходящееся на календарный год, состоящий из 365 дней;
Т366 – количество дней обращения облигаций, приходящееся на календарный год, состоящий из 366 дней.
При определении текущей стоимости и цены продажи облигации, расчет дохода производится по каждой облигации с точностью до одного рубля.

14. Порядок погашения облигаций.
Погашение облигаций производится по адресу: г. Минск, ул. Некрасова, 114 ЗАО «Кредэксбанк» с 09.00 до 16.00 в рабочие дни, начиная с даты погашения.
При погашении владельцам выплачивается номинальная стоимость облигаций.
Погашение облигаций осуществляется в отношении лиц, указанных в сформированном реестре владельцев облигаций, путем перечисления в безналичном порядке причитающихся денежных средств по реквизитам владельцев в день погашения облигаций. Погашение облигаций производится денежными средствами в сумме и валюте номинала облигаций.
Владельцы облигаций обязаны прекратить все сделки с облигациями за 5 рабочих дней до наступления срока погашения.
В случае отсутствия в реестре владельцев облигаций данных о счетах владельцев облигаций, а также в случае, если реестр содержит ошибочные банковские реквизиты, сумма, подлежащая выплате, выплачивается путем депонирования на счете Банка до непосредственного обращения владельца облигации. Проценты по депонированным суммам не начисляются и не выплачиваются.
При погашении облигации выплата части номинала облигации не производится.

15. Дата, на которую формируется реестр владельцев облигаций.
Реестр владельцев облигаций с целью их погашения формируется за 5 рабочих дней до наступления срока погашения облигаций.

16. Срок возврата средств при отказе от выпуска облигаций (запрете выпуска облигаций Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь).
Эмитент производит возврат средств не позднее 10 рабочих дней со дня отказа от выпуска облигаций или со дня запрета или приостановки выпуска облигаций.

17. Порядок перехода прав собственности на облигации на вторичном рынке ценных бумаг, условия и порядок досрочного погашения облигаций.
В период обращения облигаций эмитент может осуществлять приобретение (выкуп) облигаций у любого их владельца в сроки и по цене, установленные соглашением между владельцем облигаций и эмитентом.
Приобретение облигаций осуществляется эмитентом на внебиржевом рынке на основании договора купли-продажи, заключенного между владельцем облигаций и эмитентом, и/или на биржевом рынке в соответствии с правилами ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа».
Эмитент имеет право совершать следующие операции с выкупленными облигациями:
продавать на вторичном рынке по договорной цене;
досрочно погашать с прекращением обязательств по облигациям в силу совпадения должника и кредитора в одном лице согласно статье 383 Гражданского кодекса Республики Беларусь;
иные операции, предусмотренные законодательством Республики Беларусь.

18. Условия обеспеченности займа.
Облигации выпускаются в соответствии с п.1.8. Указа Президента Республики Беларусь № 277 от 28.04.2006г. «О некоторых вопросах регулирования рынка ценных бумаг» по согласованию с Национальным банком Республики Беларусь. Размер обязательств по облигациям не превышает 80 процентов нормативного капитала.

19. Дата и номер государственной регистрации облигаций.
Облигации седьмого выпуска зарегистрированы в Государственном реестре ценных бумаг Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь «29» июля 2011 г.
Регистрационный номер облигаций седьмого выпуска 5-200-02-1168.
Зам. Генерального директора В.В. Кашко
Заместитель главного бухгалтера Л.Н. Брухнова

Асоба

«Нам не трэба Левітан, бо ў нас ёсць Ілья Курган!..»

Кажуць, нібыта гэтае выслоўе прамовіў сам Левітан — пра беларускага калегу, дыктара Ілью Кургана. Яго часам і называлі «беларускім Левітанам». Але падаецца, параўнанні не заўсёды бываюць дарэчы. Таму што Курган — гэта наша легенда сярод дыктараў і вядучых. Чалавек, які ўмеў даносіць словы так, што яны траплялі менавіта куды трэба — ці то ў розум, ці то ў сэрца. Як яму гэта ўдавалася? На гэтае пытанне адказвае ён сам, яго сябры, знаёмыя ў кнізе «Залаты голас Беларусі. Ілья Курган», якую падрыхтавала адна з былых вучаніц Алена Мінчукова, якая схавалася за псеўданімам «Дэльфіна».

Ілья Курган — гэта цэлая эпоха на беларускім радыё, майстар слова, амаль 40 гадоў гучаў у эфіры яго аксаміцісты голас: у навінах, рэпартажах з важных мерапрыемстваў, у літаратурных праектах. І нават калі ён сышоў з радыё напрыканцы 80-х гадоў, то застаўся ў страі: у яго, як выкладчыка сцэнічнай гаворкі (у Акадэміі мастацтваў і ва Універсітэце культуры) вучыліся амаль 80 працэнтаў акцёраў краіны.

Таму не дзіва, што кнігу пра Ілью Львовіча напісала менавіта адна з былых вучаніц, прычым кніга ўбачыла свет якраз у год 85-годдзя героя! Аднак калі чатыры гады таму Алена зрабіла яму такую прапанову, то настаўніка давялося ўгаворваць, прызналася яна на прэзентацыі кнігі, на якую сам герой, на жаль, не прыйшоў: не вельмі добра сябе адчуваў у гарачы летні дзень. Усё-такі Курган перанёс за жыццё тры інфаркты... Аднак застаецца неверагодным жыццялюбам і жартаўніком. Напрыклад, расказваюць такую гісторыю: пасля аперацыі на сэрцы ў яго было нешта накшталт клінічнай смерці, стаяў ледзь не на парозе жыцця, аднак ачуняў. І вось прыходзіць у палату ўрач, а Курган яго сустракае: «Прабачце, я без гальштука...»

Валерый Анісенка, рэжысёр, сябра:

— Ён рэдкі чалавек, цудоўны, тонкі. Ілья Курган — гэта выдатная з'ява беларускай культуры. У 50-я гады, як я прыехаў з Талачына і стаў студэнтам, нас вучылі, што гісторыю творыць народ, а асоба — нішто. Мне трэба было пражыць жыццё, каб зразумець, што ўсё наадварот. Ёсць асобы, якія напаўняюць жыццё сэнсам, дабрынёй. Адзін з тых людзей, хто дапамог мне гэта зразумець, — Ілья Курган. Ён ведаў шмат выдатных асоб. І мала хто так, як ён, цэніць настаўніка. І гэта ў свае 85 гадоў! Ён быў выпускніком першага набору тэатральна-мастацкага (яшчэ тады) інстытута. Я лічу, што гэтая кніга — унікальная. Таму што герой адзін, але мы, хто пра яго гаворыць, — розныя. Да розных пакаленняў належым. Я з ім 50 гадоў. Але сённяшнія яго вучні зусім маладыя. Усе, хто яго ведае, разумеюць, чаму ён увесь час папраўляе, калі хто няправільна ставіць націск у словах. Калі не папраўляць, не паказваць, як правільна, то ўсе падумаюць, што так трэба. У яго цудоўнае адчуванне мовы, дакладнасць маўлення. Так беларускае і рускае слова мала хто ведае.

Пра патрабавальнасць Ільі Кургана да мовы з задавальненнем расказваюць тыя, хто яго ведае. Неяк у яго спыталі: «Вы, напэўна, уздрыгваеце, калі чуеце няправільную гаворку?» Ён спакойна адказаў: «Я ўздрыгваю, калі чую правільную...» Яго асабіста раніць, калі нехта гаворыць няправільна. Для яго гэта было справай гонару — гаварыць дакладна, як таго патрабуюць нормы мовы. І пры гэтым — прыгожа, каб слова сапраўды даходзіла да чалавека.

Алена Унукава, актрыса, бізнэс-лэдзі:

— Шмат гадоў таму я сышла з тэатра, хоць па прафесіі з'яўляюся актрысай тэатра і кіно. Так лёс распарадзіўся, што я стала займацца бізнэсам. Нейкім цудам я адчула покліч любові. Яна сыходзіла ад Алены Мінчуковай, з якой я сустрэлася падчас працы над спектаклем «Мачаха». Яна ж аўтар п'есы «Эдзіп», якая пастаўлена ў тэатры імя Горкага, дзе я іграю ролю. У Алены я ўбачыла нявыдадзеную кнігу пра Ілью Кургана, які, можна сказаць, таксама чалавек любові і распаўсюджвае гэтую любоў з неверагоднай сілай. Я адчувала гэта са студэнцкіх гадоў. Насамрэч, школа Кургана ўва мне, як у актрысе, моцна сядзіць. Памятаю ўсе ўрыўкі, якія мы рэпеціравалі разам, усе інтанацыі, якія ён пяшчотна, ласкава ў мяне ўкладаў. Для мяне было справай гонару пастарацца і дапамагчы, каб гэтая кніга выйшла. Знайшліся грошы, кніга ўбачыла свет...

Па словах Дэльфіны (Алены Мінчуковай), у кнігу не ўвайшло тое, што Ілья Львовіч не захацеў сказаць сам. Аднак аўтарцы ўдалося прыадкрыць гэтую таямніцу: 24 гады таму памерла яго жонка, і з тых часоў Курган жыве адзін, хоць кажуць, што шмат прыгожых жанчын рабіла яму прапановы. Але ён — прыклад сапраўднай «лебядзінай вернасці». Ідэаліст і рамантык. Пры гэтым — вельмі сціплы чалавек. Які быў і з'яўляецца сапраўднай зоркай Беларусі.

Ларыса ЦІМОШЫК.

АПОШНІ ПРЫТУЛАК ДЛЯ МУРКІ І ШАРЫКА

У Бабруйску мяркуюць, ці патрэбны гораду могілкі хатніх жывёл.

Сёння ў Бабруйску ўтварыліся стыхійныя могілкі хатніх жывёл, якія моцна ўражваюць непадрыхтаванага чалавека. За пажарнай часцю невялікія магілы, прычым (не паверыце!) на некаторых з іх ёсць нават крыжы?! Аднак на большасці — помнікі і таблічкі з партрэтамі любімых катоў і сабак, іх мянушкамі і ўзростам. Можна пачытаць эпітафіі кшталту «Мы памятаем і любім» ды «Спі спакойна, верны сабака», і ўбачыць на магілах штучныя кветкі.

Вядома, за пахаванне жывёл на гэтых несанкцыянаваных могілках можна атрымаць штраф. Аднак гарадскія ўлады пакуль не прадугледжваюць стварэнне афіцыйных могілак для хатніх жывёл: гэтая справа патрабуе грошай.

Можа, гэтай справай могуць заняцца грамадскія арганізацыі? У Бабруйску дзейнічае мясцовая арганізацыя па ахове жывёл «Дабрачыннасць». У прыватнасці, усяму гораду вядомыя акцыі, дзе актывісты аддаюць у добрыя рукі бабруйчан бяздомных катоў і сабак, якіх падабралі і вылечылі.

Аднак у грамадскай арганізацыі таксама нестае грошай: ужо колькі часу «Дабрачыннасць» спрабуе арганізаваць паўнавартасны прытулак для жывёл. Могілкі хатніх жывёл — справа патрэбная, але пакуль не выпадае заняцца ёй.

Камунальныя службы Бабруйска цяпер прапануюць аддаваць памерлых жывёл у спецаўтапрадпрыемства, якое ўтылізуе парэшткі бадзяжных сабак і катоў. Аднак гэты адзіны сёння законны спосаб задавальняе далёка не ўсіх гаспадароў жывёл, якія хочуць для сваіх хатніх любімцаў іншага і, калі можна так сказаць, больш людскага апошняга шляху і прытулку.

Алена КАЗЛОВА.

«ЦУКРОВЫ» «МЕРСЕДЭС»

На дарозе Мінск — Віцебск у Бешанковіцкім раёне а дзясятай гадзіне вечара супрацоўнікі міліцыі затрымалі «Мерседэс-Бенц», на якім жыхар Віцебскага раёна, рабочы, вёз 2,4 тоны цукровага пяску на суму каля 10 мільёнаў рублёў.

Адпаведныя суправаджальныя дакументы на цукар адсутнічалі. Міліцыянеры высветлілі, што цукар належыць жыхарцы Віцебска, індывідуальнай прадпрымальніцы. У дачыненні да вадзіцеля склалі адміністрацыйны пратакол. Пакараюць і прадпрымальніцу. Цукар канфіскавалі.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ИЗВЕЩЕНИЕ

о проведении открытого аукциона 01.09.2011 в 11.00 по адресу: 230015 г. Гродно, ул. Горького, 87 А, каб. № 204 по продаже права заключения договора аренды недвижимого имущества сроком на три года для использования в целях для размещения офисов, производственных площадей (за исключением вредных производств), складских помещений, осуществления торговли

Адрес арендуемого имущества	№ Лота	Площадь, кв.м	Коэффициент от 0,5 до 3,0	Начальная цена продажи	Размер задатка	Характеристика
1		2	3	4	5	6
Капитальное строение, здание специализированное связи, здание АТС-2, 3-й этаж, часть помещения, отдельные помещения, г. Лида, б-р князя Гедимина, 3.	Лот №1	47,3	1,5	413 875	41 388	Помещения расположены на 3-м этаже четырехэтажного здания в центральной части города. Здание имеет удобные подъездные пути. В помещениях имеется естественное освещение, водоснабжение, центральное отопление, электроснабжение, телефонизированы. Указанные площади будут выставляться на продажу права заключения договоров аренды 5 лотами.
	Лот №2	13,3	1,5	116 375	11 638	
	Лот №3	70,4	1,5	616 000	61 600	
	Лот №4	41,2	1,5	360 500	36 050	
	Лот №5	8,4	1,5	73 500	7 350	
Капитальное строение, здание специализированное связи, здание АТС-2, 4-й этаж, отдельное помещение, г. Лида, б-р князя Гедимина, 3.	Лот №6	9,5	1,5	83 125	8 313	Помещение расположено на 4-м этаже четырехэтажного здания в центральной части города. Здание имеет удобные подъездные пути. В помещении имеется естественное освещение, водоснабжение, центральное отопление, электроснабжение, телефонизировано. Указанная площадь будет выставляться на продажу права заключения договоров аренды 1 лотом.

Порядок проведения и оформления участия в аукционе определены Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды зданий, сооружений и помещений, находящихся в республиканской собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 №1049.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору следующие документы: заявление на участие в аукционе, заявление об ознакомлении с документами, порядком проведения аукциона, соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, копию платежного документа о перечислении задатка, документ, удостоверяющий личность (для физических лиц, для представителей физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица), доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) (для представителей физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица), копию свидетельства о государственной регистрации (для индивидуальных предпринимателей и юридических лиц резидентов Республики Беларусь), легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения (для юридических лиц нерезидентов Республики Беларусь). Копии документов предоставляются без нотариального засвидетельствования.

Задаток перечисляется на субсчет 3012000000225 в филиале 426 АСБ «Беларусбанк», код 199, УНП 500826567, Гродненский филиал РУП «Белтелеком».

Победителем аукциона признается участник, предложивший наивысшую цену за предмет аукциона. Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) в течение 3 рабочих дней со дня его проведения обязан в установленном порядке перечислить на субсчет арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка, а также возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение. Договор аренды по результатам аукциона заключается в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Прием документов на участие в аукционе осуществляется по адресу: 230015 г. Гродно, ул. Горького, 87 А, каб. 202 с 01.08.2011 по 31.08.2011 включительно в рабочие дни (с 9.00 до 16.00). Документы, поданные после 16.00 31.08.2011, не рассматриваются.

Телефоны для справок: (0152) 43 25 71, 48 65 95, факс (0152) 72 02 07.

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

извещает о проведении повторного аукциона по продаже имущества

ЛОТ 1	
Наименование	**Характеристика**
Склад №2 и сооружения	Капитальное строение с инвентарным номером 400/С-4291, наименование – склад №2, 1981 г.п., фундамент – бетон, стены – кирпич, перегородки кирпичные, блочные, перекрытия – ж/б плиты, крыша совмещенная рулонная, полы бетонные, электроснабжение – скрытая проводка, площадь застройки 1032 м.кв., объем здания 6502 м.куб., общая площадь здания 1220,2 м. кв., инвентарный № 10009; Навес 1981г.п., площадь застройки 120 м.кв. Рампа 1981 г.п., площадь застройки 125 м.кв.; Часть железобетонного ограждения протяженностью 180,6 м.п., инвентарный № 20124; Часть асфальтобетонного покрытия 1968,6 м.кв.,инвентарный № 20104
Местонахождение объекта	г. Гродно, ул. Карского, 35
Земельный участок	Кадастровый номер 440100000001003593, площадь 0,6572 га, назначение – для обслуживания склада
Начальная цена продажи	450 000 000 белорусских рублей с учетом НДС
Сумма задатка	22 500 000 белорусских рублей
Продавец	ОАО «Гроднооблавтотранс» Филиал «Автомобильный парк №3 г. Гродно», г. Гродно, ул. Карского, 35, тел. 74-68-14
Организатор торгов	Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 41-98-32, 41-98-34
Условия аукциона	Покупатель обязан установить ограждение по периметру своего земельного участка, граничещего с земельным участком продавца и организовать индивидуальное электроснабжение здания от городских электросетей в течение года со дня передачи ему недвижимости
Условия оплаты	По договоренности сторон
Срок заключения договора купли-продажи	Не позднее 10 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов
Номер р/сч для перечисления задатка	Р/с 3012286350011, отделение № 201 г. Гродно ГФ по Гродненской области ОАО «Белинвестбанк», код банка 152101705, УНП 500833225
Аукцион состоится 10 августа 2011 г. в 11.00 по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209	
Информация о первом аукционе была опубликована в газете «Звязда» №115 от 22.06.2011 г. Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209 с 8.30 до 17.30. Последний день приема заявлений – 09 августа 2011 г. до 15.00.	
Телефон для справок: 41-98-32, 41-98-34 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки». Дополнительная информация: www.ino.by	

ФЭН-ШУЙ ГАРАСКОП

НЯДЗЕЛЯ, 31 ЛІПЕНЯ

Спрыяльны для малітвы і рэлігійных рытуалаў. Старайцеся не жаліцца, не выхваляцца, не паводзіць сябе ганарыста.

ПАНЯДЗЕЛАК, 1 ЖНІЎНЯ

Спрыяльны для збору даўгоў. Неспрыяльны для любых важных спраў.

АЎТОРАК, 2 ЖНІЎНЯ

Не наклікайце на сябе праблемы з законам, уладамі, начальствам і супрацоўнікамі, не ўвязвайцеся ў сваркі, пазбягайце агрэсіі і разбурэння сувязяў.

СЕРАДА, 3 ЖНІЎНЯ

Дзень спрыяе гарманічнаму, спакойнаму вядзенню спраў і мірным, ураўнаважаным зносінам, пазітыўным зменам, паляпшэнню якасці жыцця. Падыходзіць для будаўніцтва, пачатку паездкі.

ЧАЦВЕР, 4 ЖНІЎНЯ

Неспрыяльны для пачатку судовага разгляду, любой дзяльбы, размеркавання, як і складання завяшчання, праявы агрэсіі, празмернай актыўнасці або, наадварот, поўнай бяздзейнасці — усё неабходна ўраўнаважыць.

ПЯТНІЦА, 5 ЖНІЎНЯ

Спрыяльны для вяселля, пачатку будаўніцтва, адкрыцця бізнэсу. Неспрыяльны для пераезду ў новы дом, вандраванняў.

СУБОТА, 6 ЖНІЎНЯ

Спрыяльны для вяселля, наладжвання сувязяў, грамадскай дзейнасці, дзелавых перамоў, узаемавыгаднага супрацоўніцтва, падпісання кантрактаў.

Навуковыя сустрэчы: археалогія

ШТОДЗЁННЫЯ ПОШУКІ НОВЫХ АДКРЫЦЦЯЎ

ДАЎНО мінулі тыя гады, калі ў беларускай археалогіі важнейшыя адкрыцці рабіліся летам — у звыклы для раскопак час. Ужо амаль каля 10 гадоў палявы сезон у археолагаў практычна не перарываецца: вядуцца раскопкі важнейшых помнікаў археалогіі для вырашэння фундаментальных праблем станаўлення і развіцця грамадства ў старажытныя часы, шырокамаштабныя даследаванні аб'ектаў археалогіі ў зонах новабудоўляў, абследаванні асобных рэгіёнаў краіны ў межах інавацыйных праектаў. Таму зараз, у ліпені 2011 года, мы ўжо можам расказаць як пра пэўныя поспехі і новыя адкрыцці, так і пра спадзяванні і мары, з якімі супрацоўнікі трох аддзелаў археалогіі (першабытнага грамадства, сярэдневяковага перыяду, захавання і выкарыстання археалагічнай спадчыны) Інстытута гісторыі НАН Беларусі накіраваліся ў розныя рэгіёны Беларусі для археалагічных даследаванняў.

У 30-я гады мінулага стагоддзя на Віцебшчыне былі адкрыты так званыя «мокрыя» паселішчы неаліту і бронзавага веку каля вёскі Асавец (тэрыторыя Крывінскага тарфянніку). Перыядычныя раскопкі і выяўленыя на іх матэрыялы далі падставу для сцвярджэння — гэта ўнікальныя для Цэнтральнай і Усходняй Еўропы археалагічныя помнікі, у культурным пласце якіх захоўваюцца арганічныя рэчы. Менавіта таму вось ужо 11 сезон запар (з 2000 года) **Максім Чарняўскі** і даследуе тарфянікавыя паселішчы Асавец-2 і Асавец-7. За час раскопак атрыманыя, акрамя прылад з каменю і крэменю, разнастайнага посуду, сотні вырабаў з косці і рогу, дрэва, бурштынавыя ўпрыгажэнні. Спадзяванні ёсць і на гэты палявы сезон, які, магчыма, прыняце новыя знаходкі і адкрыцці. Касцяныя падвескі і наканечнікі стрэл, рагавыя сякеры, музычныя інструменты, рэшткі пахаванняў і пабудоў — непасрэдныя сведкі багатага духоўнага жыцця і разнастайнай матэрыяльнай культуры насельніцтва паўночнабеларускай археалагічнай культуры.

«Белавежская пушча». Ужо за першыя два гады комплексных даследаванняў былі атрыманы новыя матэрыялы, якія пакладзены ў аснову шэрагу артыкулаў, навуковай манаграфіі, знайшлі адлюстраванне ў шыкоўным і ўнікальным фотаальбоме, а таксама, што вельмі важна, экспануюцца ў новым музеі. Першапачатковая карта археалагічных помнікаў Белавежскай пушчы з кожным годам дапаўняецца адкрытымі падчас разведак розначасовымі помнікамі ад каменнага веку да эпохі сярэднявечча. На многіх з іх праводзяцца раскопкі. Праз некалькі дзён пачынаецца яшчэ адна экспедыцыя, у якой прымуць удзел і студэнты-гісторыкі Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.С. Пушкіна. Стаянкі з матэрыяламі неаліту і бронзавага веку каля вёсак Селішча Вялікае, Камянюкі, Плянта, Шышова — вось тыя помнікі, на якіх будуць весціся навуковыя пошукі **(В. Лакіза, А. Ткачоў).** У тым ліку і там, дзе, магчыма, праз некаторы час можа з'явіцца «Археалагічны музей пад адкрытым небам».

Археалагічныя знаходкі з раскопак на Замчышчы і на тэрыторыі былога бернардзінскага манастыра ў Мінску.

Археалагічныя знаходкі з даследаванняў помнікаў археалогіі ў зоне будаўніцтва Беларускай АЭС.

Для рэканструкцыі сярэднявечных пахавальных звычаяў і асаблівасцяў духоўнай культуры вялікае значэнне маюць праведзеныя **Алегам Іовам** раскопкі на курганным могільніку X—XI стст. у вёсцы Пастаўчы Старадарожскага раёна. Археолагам пры падтрымцы мясцовай улады і з удзелам школьнікаў былі даследаваны 3 курганныя насыпы з частковым трупаспаленнем. У 2 курганах пахавальны інвентар адсутнічаў, а вось у трэцім каля касцяка была знойдзена жалезная баявая сякера і срэбны драцяны пярсцёнак. Такія рэчы дазваляюць не толькі датаваць курганы, але і адносіць іх да дрыгавіцкага насельніцтва.

Працягваюцца даследаванні і на гарадзішчы ў вёсцы Свіслач Асіповіцкага раёна **(Вадзімам Кошманам).** Менавіта на гэтым помніку, які быў у эпоху Старажытнай Русі ўмацаваным замкам, знаходзілі першыя матэрыяльныя сведчанні нападаў мангола-татараў на землі Беларусі ў 1237—1240 гады (узбраенне, дэталі амуніцыі і рыштунку качэўнікаў побач з прадметамі ўзбраення мясцовага насельніцтва).

Пачынаючы з 2007 года, не спыняюцца археалагічныя пошукі на тэрыторыі Нацыянальнага парка Расіі ад часоў фарміравання да Першай сусветнай вайны і мае шэраг узнагарод. Верагодна, знак быў страчаны афіцэрам палка, які з'яўляўся дэлегатам у Дваранскага сходу Віцебска. Магчыма, падчас пошукаў у архівах можна будзе знайсці прозвішча ўладальніка знака.

Участак будаўніцтва кавярні на вуліцах Леніна і Талстога размешчаны на тэрыторыі Узгор'я. Гэтая тэрыторыя непасрэдна прымыкае за месца, дзе ў 16—17 стагоддзях была прыстань на рацэ Віцьба. Ад гэтай прыстані тавары прывозіліся да плошчы з гандлёвымі радамі (каля ратушы). І зараз тут знаходзіцца прычал з катамаранамі.

Падчас археалагічных раскопак былі знойдзены рэшткі цаглянай пабудовы 19 стагоддзя — каменны дом купца Бейнуса Вітэнберга — на рагу вуліц Смаленскай (зараз Леніна) і Падзвінскай (зараз Талстога) паблізу ратушы і каменнага моста цераз Віцьбу. Дом быў упрыгожаны арачнымі вокнамі на другім паверсе і меў адкрытую галерэю з ажурнай металічнай рашоткай. Тут знаходзіўся атэль Хрысціяна Хрысціянавіча Брозі, дзе быў першакласны рэстаран з рускай і французскай кухнямі, а таксама кегельбан і більярд.

Акрамя атэля, тут былі і крамы (ювелірная, кандытарская, мэблевая, мастацкай фатаграфіі) і кватэры. Так, тут жыў будучы цесць М. Шагала (ювелір Шмуль-Невух Розенфельд). Дачка Шмуля (будучая жонка М. Шагала) у сваіх успамінах апісвае багатыя інтэр'еры ювелірнай крамы свайго бацькі.

Частка пабудовы была пазней разбурана, і падчас археалагічных раскопак знойдзены розныя дэталі інтэр'еру (жалезныя дзверы, жалезная ёмістасць у выглядзе кошыка; фрагменты кафляў з клеймамі завода Лісоўскага і плітак на падлогу вытворчасці горада Рыгі, якія датуюцца 19 — пачаткам 20 стагоддзя, а таксама шкляны і гліняны посуд. Усе знаходкі рыхтуюцца для перадачы ў музей Марка Шагала, каб у экспазіцыі можна было паказаць, як жылі жыхары горада Віцебска ў тыя часы.

Вольга ЛЯЎКО,
загадчык Цэнтра гісторыі даіндустрыяльнага грамадства Інстытута гісторыі НАН Беларусі, дацэнт.

АРХЕАЛАГІЧНЫЯ ЗНАХОДКІ АДКРЫВАЮЦЬ НОВЫЯ СТАРОНКІ ГІСТОРЫІ ВІЦЕБСКА

У маі—чэрвені 2011 года ў час падрыхтоўкі юбілейнага фестывалю «Славянскі базар» у гістарычным цэнтры Віцебска праводзіліся працы па добраўпарадкаванні горада (устаноўка фантана ў скверы Пушкіна, будаўніцтва кавярні «Князь Альгерд» на Узгор'і). Падчас работ быў выяўлены культурны слой са знаходкамі і пабудовамі 18—19 стагоддзяў.

Добраўпарадкаванне ў скверы Пушкіна праводзілася каля драмтэатра на абшары былога сярэднявечнага Верхняга замка. З поўначы да ўчастка прымыкае мост цераз раку Віцьбу (па якой і атрымаў сваю назву славуты беларускі горад), з поўдня — вуліца Замкавая (такія назвы маюць адны з самых старажытных вуліц нашых гарадоў). Раней падчас даследаванняў было ўстаноўлена, што тут таўшчыня культурнага слоя дасягала 11 м (самы лепшы вынік сярод усіх старажытнарускіх гарадоў Усходняй Еўропы). У канцы 1970-х гадоў ва ўсходняй частцы парка была выяўлена драўляная забудова. Тут планавалася стварэнне такога ж музея, як у старажытным Брэсці. У 16 стагоддзі тут быў выкапаны штучны вадаём для забеспячэння жыхароў горада вадой падчас аблог, які меў пратоку да ракі Віцьбы. Гэтае азярцо было засыпана толькі на мяжы 19—20 стагоддзяў.

Падчас даследаванняў на тэрыторыі фантана і яго камунікацый было знойдзена шмат гістарычных артэфактаў, сярод якіх варта адзначыць юбілейны знак у гонар 100-годдзя 98-га пяхотнага Юр'еўскага палка. Полк быў сфарміраваны 13 снежня 1763 года і меў розныя назвы (Тамбоўскі, затым 98 Дэрпцкі і Юр'еўскі). Ён прымаў удзел ва ўсіх войнах Расіі ад часоў фарміравання да Першай сусветнай вайны і мае шэраг узнагарод. Верагодна, знак быў страчаны афіцэрам палка, які з'яўляўся дэлегатам у Дваранскага сходу Віцебска. Магчыма, падчас пошукаў у архівах можна будзе знайсці прозвішча ўладальніка знака.

Участак будаўніцтва кавярні на вуліцах Леніна і Талстога размешчаны на тэрыторыі Узгор'я. Гэтая тэрыторыя непасрэдна прымыкае за месца, дзе ў 16—17 стагоддзях была прыстань на рацэ Віцьба. Ад гэтай прыстані тавары прывозіліся да плошчы з гандлёвымі радамі (каля ратушы). І зараз тут знаходзіцца прычал з катамаранамі.

Падчас археалагічных раскопак былі знойдзены рэшткі цаглянай пабудовы 19 стагоддзя — каменны дом купца Бейнуса Вітэнберга — на рагу вуліц Смаленскай (зараз Леніна) і Падзвінскай (зараз Талстога) паблізу ратушы і каменнага моста цераз Віцьбу. Дом быў упрыгожаны арачнымі вокнамі на другім паверсе і меў адкрытую галерэю з ажурнай металічнай рашоткай. Тут знаходзіўся атэль Хрысціяна Хрысціянавіча Брозі, дзе быў першакласны рэстаран з рускай і французскай кухнямі, а таксама кегельбан і більярд.

Акрамя атэля, тут былі і крамы (ювелірная, кандытарская, мэблевая, мастацкай фатаграфіі) і кватэры. Так, тут жыў будучы цесць М. Шагала (ювелір Шмуль-Невух Розенфельд). Дачка Шмуля (будучая жонка М. Шагала) у сваіх успамінах апісвае багатыя інтэр'еры ювелірнай крамы свайго бацькі.

Частка пабудовы была пазней разбурана, і падчас археалагічных раскопак знойдзены розныя дэталі інтэр'еру (жалезныя дзверы, жалезная ёмістасць у выглядзе кошыка; фрагменты кафляў з клеймамі завода Лісоўскага і плітак на падлогу вытворчасці горада Рыгі, якія датуюцца 19 — пачаткам 20 стагоддзя, а таксама шкляны і гліняны посуд. Усе знаходкі рыхтуюцца для перадачы ў музей Марка Шагала, каб у экспазіцыі можна было паказаць, як жылі жыхары горада Віцебска ў тыя часы.

Вольга ЛЯЎКО,
загадчык Цэнтра гісторыі даіндустрыяльнага грамадства Інстытута гісторыі НАН Беларусі, прафесар.

1. Юбілейны знак у гонар 100-годдзя 98-га пяхотнага Юр'еўскага палка.



2, 3. Фрагменты кафляў з клеймамі завода Лісоўскага і плітка на падлогу вытворчасці горада Рыгі (19 – пач. 20 стагоддзя).

Жыццё па анекдоце

Як нас дураць

Вы калі-небудзь пазнавалі ў анекдотах сябе? Як вы думаеце, ці можна знайсці чалавека, які б ніколі не зведаў, што такое падман? Асабіста я ў гэтым ужо не ўпэўнена. Ва ўсякім разе, такіх не знайшлося сярод з больш за дзясятак апытаных мной людзей. Адных паддурылі, другія дурылі самі. Нехта нават і не адразу зразумеў, што яго проста раскруцілі на грошы, навязалі непатрэбныя пакупкі, паслугі альбо ўсунулі нешта па завышаным кошце.

БУДЗЬЦЕ ЗДАРОВЫ!

Відаць, не проста так узнік падобны анекдот: **Галоўная задача платнай медыцыны — перавесці востры боль у хранічны.**

Што гатовы пацвердзіць Алег Сідараў — мануальны тэрапеўт, які раней працаваў у платных медыцынскіх цэнтрах. Да бясспрэчнай перавагі платнай медыцыны, на думку Алега, можна аднесці толькі адну — камфорт прыёму. Безумоўна, няма чаго тут і параўноўваць паход у звычайную паліклініку, дзе гадзінамі даводзіцца праседжваць у чэргах і дзе ўрач вам выдзяляе не больш чым 5 хвілін, з паходам у платны цэнтр, дзе ветлівы доктар удзеліць вам дастаткова часу. Але ці будзе ваша лячэнне іншым у параўнанні з тым, якое вы атрымалі б у звычайнай паліклініцы? Тут я маю на ўвазе ўжо не камфорт, а вынік і карысць для вашага здароўя.

Справа ў тым, што ў многіх платных цэнтрах прыём вядуць многія з тых урачоў, што кансультуюць бясплатна.

І не здзіўляйцеся, калі ў вас пачнуць адкрываць цэлы букет хвароб. Расчулены ўвагай (ці запужаны сваім дрэнным станам) кліент гатовы будзе на ўсё, што яму прапануюць. «Пацыенту прызначаюць здаць пэўныя аналізы, зрабіць УЗІ, кардыяграмы, здымкі — прычым не толькі тыя, што звязаны з яго хваробай, але і з разраду «на ўсялякі выпадак». Пасля прызначэцца лячэнне. Яно толькі пачалося, а вас адразу ж могуць выправіць рабіць прамежкавыя аналізы, здымкі і г.д. быццам бы для таго, каб паглядзець, як ідзе лячэнне», — распавядае Алег. Прычым, паводле яго слоў, вельмі часта клиенты нават і не заўважаюць, як іх проста раскручваюць на грошы, і таму ён раіць шукаць не платны цэнтр, а ўрача, прычым менавіта спецыяліста па той хваробе, якая вас непакоіць.

А вось яшчэ анекдот з жыцця:

— Скажыце, доктар, гэтыя таблеткі маюць пабочны эфект?

— Маюць, ад іх заўважна худзее кішэня.

Гэта як пра Ганну Захарэвіч напісана, дарэчы — пра тое, як ёй навязалі біядабаўкі.

— Часам да цябе могуць звярнуцца нават добрыя знаёмыя, людзі, якім ты дагэтуль давяраў. І самае крыўднае, калі яны, каб зарабіць грошы, ціснуць на твае слабыя бакі, — заўважае Ганна.

Жанчына прывяла сына ў садок пасля чарговага бальнічнага і ў раздзявальні разгаварылася з яшчэ адной маці. Знаёмая пашкадавала малога і сказала, што ведае пра лекі, дзякуючы якім можна вылечыць хлопчыку адэноіды. Яшчэ ў якасці прыкладу прывяла дзяўчынку, што жыве ў суседнім двары, у якой была трэцяя ступень адэноідаў, але за год дзякуючы прэпаратам малую вылечылі.

Узрадаваная магчымасцю нарэшце пазбавіць сына ад бясконцых сопляў і кашлю Ганна набыла тыя прэпараты. Абышліся яны ў 70 долараў, і гэта, як аказалася, быў толькі пачатак лячэння. «Жанчына, якая прадавала лекі, мяне папярэдзіла, што гэта біядабаўкі і што іх плюс у параўнанні з лекамі відавочны — яны не шкодныя, не маюць ніякіх пабочных эфектаў. І гэта, паводле яе слоў, як абавязковае харчаванне, насычанае вітамінамі для ўмацавання імунітэту, і яны дапамагаюць арганізму пазбавіцца ад хваробы. Толькі прымаць іх трэба пастаянна», — узгадвае Ганна. Але ад прыёму тых дабавак сын Ганны не стаў хварэць менш. А праз некаторы час яна пазнаёмілася з мамай быццам цудам вылечанай дзяўчынкі з суседняга двара, якая, аказалася, так і ходзіць са сваімі адэноідамі. А маці дзяўчынкі распавяла, што яна набыла тыя дабаўкі яшчэ і для сябе, і для хворага бацькі. Прычым усім — і малой і дарослым — «прапісалі» адну і тую ж дабаўку і абяцалі, што яна дапаможа справіцца з абсалютна рознымі хваробамі.

ХТО НА «ЧАЙНІКА»?

У аўтамайстэрні жанчына пытаецца:

— Ну, што з маёй машынай?

— Пакуль магу толькі сказаць, што ключ і попельніца ў поўным парадку.

Невыпадкова я абрала анекдот менавіта пра жанчыну, бо якраз іх у аўтамайстэрнях часцей і «раскручваюць». Але і мужчыну, калі прачуюць, што той пра аўтамабіль ведае толькі, як на ім ездзіць, таксама могуць прымусіць патрациць.

Прычым падмануць вас могуць па-рознаму. Вам патрэбна замяніць пэўную дэталь — і, «на ваша шчасце», вам не прыйдзецца ехаць на рынак, бо ў механіка такая ёсць. Прычым вам усунуць тую дэталь па значна большым кошце, чым калі б вы яе самі набывалі. Часам вытрасаюць грошы за выпраўленне паломак, якіх насамрэч не было, і за замену дэталяў, якія і не трэба было мяняць. Вы набылі добрыя свечкі для аўтамабіля, але не факт, што вам не паставяць замест іх больш простыя і танныя. Запэўніваюць, што вам памянялі масляны фільтр, а насамрэч ніхто гэтага не рабіў. Спрактыкаваныя кіроўцы раяць ставіць меткі на тых дэталях, якія вам павінны памяняць, і прасіць вяртаць усе замененыя дэталі. Не плаціць наперад, пакуль не ўбачыце выніку, прасіць адразу распавесці, што механікі збіраюцца рабіць з вашым аўтамабілем, і абавязкова ўзгадняць усё з вамі.

ПА ПАКУПКІ

Да прадаўца падыходзіць жанчына і просіць узважыць скрутак.

— Тут роўна кіло дзвесце, а што ў вас там?

— Два кіло мяса, якія я ў вас купіла дзесяць хвілін таму.

Слова «падман» у большасці з апытаных мной людзей асацыюецца менавіта з гандлем. Пра тое, што іх абважылі, узгадалі, напэўна, усе. Як заўважыла Аліна Міронава, яе неяк паспрабавала абважыць на рынку нават тая прадавачка тварагу, у якой Аліна з'яўляецца пастаянным кліентам. Многія з маіх суразмоўцаў узгадалі таксама і пра тое, што іх дурылі ў крамах. Самая распаўсюджаная з'ява: на цэнніку стаіць адзін кошт, а на касе прабіваюць іншы, больш высокі. Прычым мае суразмоўцы называлі самыя розныя крамы. Калі набываеш шмат прадуктаў, розніцу ў кошце можаш і не заўважыць, тым больш калі яна ў межах тысячы. Так, на цэнніку можа стаяць 4200, а ў касе праб'юць 4470. Многім не хочацца губляць час і псаваць настрой з-за капеек. Калі ж людзі пачынаюць разбірацца, то чуюць адказ: «Цэны памяняліся, не паспелі змяніць цэннікі». Аляксандр Жукаў злавіў прадаўца і на такім падмане: яму прабілі не той кошт, на колькі цягнуў яго 500-грамовы кавалак каўбасы, а кошт кілаграма гэтага прадукту. Сярод частых падманаў і такі — калі вы закупляеце многа тавару, нейкі прадукт могуць прабіць двойчы. Васіль Харытончык набываў 10 творожных сыркоў, а яму прабілі 11. А вось Наталля Ваўчкова пра тое, што гандаль наш не без граху, можа аўтарытэтна распавесці: яна працавала і ў супермаркетах, і ў шапіку, і на рынку, і нават у кулінарыі. Прычым, менавіта ў кулінарыі Наталля змагла папрацаваць толькі тыдзень, больш сумленне не дазволіла. Мяняць этыкеткі з датай вытворчасці — гэта яшчэ самая «бязвінная» штука. Яе прымушалі разбаўляць сок вадой, а таксама гаварыць пакупнікам, што пазаўчарашнія булачкі свежыя. На рынку Наташа бачыла, як працуюць яе калегі: нехта закупляе тавар у звычайных крамах і развешвае сярод фірменных рэчаў, у выніку «піхае» звычайныя рэчы па больш высокіх цэнах. Часам сярод новенькіх фірменных рэчаў развешваецца і тавар, закуплены ў мінскіх сэканд-хэндах.

ЦУДА-ЗВЯРЫ

Ходзіць па кірмашы злосны чалавек з вялізным мядзведзем: «Вось бы мне знайсці таго мужыка, што мне год таму шчанюка прадаваў»... Здавалася, што так ужо наўрад ці надураць. Але і падобнае бывае.

Штогод на лета баба Наста выязджае на дачу, вядома ж, і хатнюю любіміцу Грэту (гэта вялікі каралеўскі пудзель) з сабой бярэ. У Грэты на лецішчы шмат кавалераў — дварнякоў. І сабаку радасць, і бабці прыбытак. Неяк гляджу, стаіць баба Наста на кірмашы і шчанюкоў Грэціных прадае.

Вось і першыя пакупнікі глядзяць на калматыя чорныя камочкі: — А што за сабачкі?

— Пудзель. Каралеўскі. Чыстая парода, — выдае бабка.

Праз некаторы час шчанюкамі захапіліся наступныя пакупнікі:

— Гэта ў вас спаніэль?

— Канешне, спаніэль. Бярыце, не пашкадуеце, — запэўнівае Наста. А калі бабця заўважыла, што на спаніэляў попыт большы, чым на пудзеляў, так пад «спаніэляў» усіх і прадала.

Часам людзі выкладваюць не адну сотню долараў за пародзістага звера, а атрымліваюць «ката ў мяху». Так і сям'я Івановых раскашэлілася на сваю мару — ката пароды майнкун (амерыканская янотавая кошка — адна з самых буйных у свеце), прычым усё як мае быць: кот дастаўся з дакументамі. І якое ж было расчараванне, калі праз год яны даведаліся, што іх гадаванец — звычайны дваровы кот, проста буйных памераў. І ў каціным пашпарце ў графе «парода» замест «майнкун» з'явіўся надпіс «любімы кот».

ПАШАНЦАВАЛА

«Вы выйгралі пуцёўку у Турцую». Калі мае бацькі пачулі гэта ў тэлефоннай трубцы, былі вельмі здзіўленыя. Але пагадзіліся схадзіць на сход для ўдзельнікаў конкурсу. Самае цікавае — для ўдзелу ў конкурсе трэба было проста запоўніць анкету ў адным са сталічных супермаркетаў, пры гэтым нават нічога не набываць. І вось яны на сходзе сярод тых, каму таксама выпаў шчаслівы білецік, усім выдаюць паперку з адрасам, куды прыходзіць па пуцёўку. А потым пачынаецца лекцыя пра пледы і паясы з шэрсці: маўляў, у вас ёсць магчымасць набыць іх па нізкім кошце. І як распавялі бацькі, некаторыя людзі, на эмоцыях, што ім выпала халява, ужо не шкадавалі грошай і на «танныя» пледы. Пазней высветлілася, што такія ж пледы ў магазінах каштуюць значна менш. Што ж дытычыцца Турцыі — высветлілася, што пуцёвак на ўсіх не хапіла. Між іншым, на паперках, што раздавалі будучым «турыстам», было пазначана, што бясплатнае ў пуцёўцы толькі пражыванне і экскурсіі (затое кошт харчавання быў пазначаны нерэальна высокі), плюс давалася прыпіска: «Спяшайцеся, колькасць пуцёвак абмежаваная».

МАЛЕНЬКІ ПАДМАН

Не магу я ў гэтай новай школе вучыцца, спісаць нічога немагчыма! — скардзіцца вучань бацькам.

— Што, настаўнікі злосныя?

— Да не, вучні нічога не ведаюць.

Ну, наконт нічога не ведаюць, гэта наўрад ці. Можа, проста не валодаюць інфармацыяй з падручнікаў. А вось навучыцца падманваць у дзяцінстве цалкам магчыма. Так мне і не ўдалося знайсці вучня, які б ні разу не падманаў сваю настаўніцу. А пра шпоры — заезджаная тэма. І адзнакі самі вучні выстаўляюць у класным журнале не ў адной школе, і дыктанты напярэдадні завучваюць з усімі знакамі прыпынку многія. Але бываюць і такія вучні, што нават не вучаць вершы на памяць, але здаюць іх. Так, у адной са школ дзеці проста пісалі тэкст верша на паперы, і з месца, адкуль настаўніца не заўважыць, свой чалавек паказвае лісты з тэкстам таму, хто «расказвае верш на памяць» ля дошкі.

Хто ведае: можа, з такіх маленькіх падманаў пасля вырастаюць і вялікія?

Ганна ТРОШЫНА.

P.S. Некаторыя прозвішчы змянены.

У Рагачове эвакуявалі з-за пажару 35 чалавек

У Рагачове пры пажары ў 9-павярховым шматкватэрным доме загінуў адзін чалавек, 35 жыхароў былі эвакуяваны ратавальнікамі. Аб гэтым паведамілі БЕЛТА ў дзяжурнай часці МНС.

Пажар на другім паверсе дома здарыўся ў 0.23, супрацоўнікаў МНС выклікалі суседзі. Жыхары суседніх кватэр былі эвакуяваны, загінуў сын гаспадыні, чыя кватэра загарэлася, 1987 года нараджэння. Папярэдняя прычына — неасцярожнасць пры курэнні. У МНС падкрэсліваюць, што гэта прычына застаецца самай распаўсюджанай. За мінулыя суткі менавіта з-за неасцярожнасці пры курэнні здарыўся пажар у прыватным доме ў Маларыцкім раёне Брэсцкай вобласці, у выніку якога загінула жанчына.

Муз-news

У лідарах амерыканец, а беларус пакуль дзявяты

Сёння ў Юрмале фінішуе «Новая хваля-2011»

Бываюць жа супадзенні! Беларускі канкурсант Юзары (Юрый Наўроцкі) на «Новай хвалі» ў Юрмале трэці конкурсны дзень запар будзе выступаць восьмым па ліку. Самае цікавае, што пасля выступлення беларус займае звычайна такія ж прыступкі...

За два дні вакальных спаборніцтваў у лідары пакуль выйшаў амерыканскі выканаўца Джэйдан Фелдар — 237 балаў, на другім месцы — украінка Маша Сабко, трэцімі ідуць дзяўчаты з гурта «Н. А. О. М. І». Беларус Юзары на момант падпісання газеты ў нумар у сваім багажы меў 220 балаў і займаў дзявятую прыступку.

Маша Сабко.

Пра Пугачову, зорных удзельнікаў і журы

Як стала вядома, не ўсе з удзельнікаў конкурсу з'яўляюцца навічкамі ў музыцы і шоу-бізнэсе. Украінка Маша Сабко была прызёрам забаўляльнага шоу «Украіна слязам не верыць», а яе суайчыннік Коля Серга — удзельнік украінскай «Фабрыкі зорак». Ад Расіі на «Новую хвалю» прыехалі сын спявачкі Любашы Андрэй Грызлі, а таксама саліст «Асарці», якія перад пачаткам конкурсу перайменаваліся ў «Н. А. О. М. І»...

Варта зазначыць, што геаграфію постсавецкіх краін, якія традыцыйна прымаюць удзел у конкурсе, сёлета разбавілі прадстаўнікі спякотнага Тога (Джэна Хоф пакуль на чацвёртым месцы) і халоднай Фінляндыі (трыа «Flute of Shame» на 11 прыступцы). Замыкае спіс з 14 удзельнікаў канкурсант з Бразіліі Roger Ricco, у якога 201 бал.

Ала Пугачова на конкурс усё ж прыехала. У суправаджэнні дачкі Крысціны і свайго вернага спадарожніка — Максіма Галкіна. «Жанчына, якая спявае» гэтым разам будзе не толькі спяваць, але і шмат гаварыць: Прымадонна будзе весці творчы вечар, прысвечаны вядомаму кампазітару Аляксандру Зацэпіну.

Чакаецца, што спецыяльны прыз ад Алы Барысаўны сёлета таксама будзе. «Журыць» канкурсантаў, як і ў папярэднія дні, сёння будуць Райманд Паўлс, Ігар Круты, Валерыя, Лайма Вайкуле, Філіп Кіркораў, Валерый і Канстанцін Меладзэ, Ігар Нікалаеў, Юрый Антонаў, Леанід Агуцін, Макс Фадзееў.

Юзары і «Лапці»


Юзары.

Сёння ў беларуса будзе апошняя магчымасць паўплываць на вынікі турнірнай таблiцы. У першы дзень Юзары не ўдалося скарыць журы кавер-версіяй на песню Стыві Уандэра «I Wish», у другі дзень конкурсу наш зямляк выконваў «хіт краіны» — «Лапці, мае лапці», што таксама не моцна ўразіла журы. Сёння канкурсанты «Новай хвалі» павінны будуць выконваць свае аўтарскія песні.

Беларус Юзары ў інтэрв'ю прэсе прызнаецца, што вельмі рады, што трапіў на конкурс якраз у 10-гадовы юбілей «Новай хвалі»:

— Сёлета конкурсу дзесяць гадоў... А дзесяць гадоў таму мне самому было 10 гадоў... Я спяваў харавую музыку, займаўся на фартэпіяна, гуляў у Робін Гуда, а ў школу прачынаўся пад песні Майкла Джэксана. Як змяніўся час!

Акцэнтуючы ўвагу на сваёй нацыянальнасці, журналістам артыст прызнаецца, што бліны — яго любімая страна.

Ілья ЛАПАТО.

Справа густу

ПЎНАЯ КУХНЯ

Ала МАЧАЛАВА

Вытанчаны келіх, слушная тэмпература падачы, багаты водар напою, бездакорна падабраная закуска. Калі вы думаеце, што размова ідзе пра элітарнае бардоскае шато з чатырохзначнай лічбай ля значка «еўра» ў цэнніку, вы будзеце здзіўлены. Эстэтыка не чужая і куды больш даступнаму па кошце напою — піву. Півавары гатовы прадаць душу за рэдкія гатункі дражджэй. Гурманы здольныя ацаніць іх намаганні — у слушным келіху і пад слушную закуску. Аматары па ўсім свеце калекцыянуюць піўную атрыбутыку і ператвараюць банальнае спажыванне ў сапраўдны цырыманіял. Нарэшце, ёсць міжнародна прызнаныя эксперты, якія літаральна прысвячаюць жыццё пеннаму напою. Сігрыд Стрэтквери — добры прыклад таму.

Яна працуе ў піўной індустрыі столькі, колькі я жыву, — 25 гадоў. За гэты час піўная дама паспела заснаваць Цэнтр піва Ringnes, які актыўна прывівае культуру спажывання ячнага напою, распрацаваць папулярныя адукацыйныя праграмы і перадаць свае веды многім шэф-кухарам рэстаранаў, гастранамічных школ і кулінарнай акадэміі ў сябе на радзіме. А тых, хто ўсё яшчэ сумняваецца ў вытанчанасці пеннага напою, пераканае яе кніга «Піва з нажом і вілкай».

— Прынята лічыць, што піва — напой для простых немудрагелістых страў. Сваёй кнігай я хацела паказаць, што піва можа смела канкурыраваць з вінам і стаць часткай высокай кухні, — прызнаецца аўтарка. — Піва здольнае цудоўна акампанаваць самым далікатным кулінарным творам, надаючы ім асаблівыя ноткі гучання.

Запрашэнне экспертаў такога ўзроўню ў Беларусь стала ўжо цікавосткай кампаніі «Аліварыя», якая ўваходзіць у склад Carlsberg Group. Сігрыд Стрэтквери прапануе беларускім аматарам самім прыгатаваць з піва... сіроп. Нам спатрэбяцца 100 мл цёмнага піва, 100 мг цукру, сок і цэдра лайма, перац чылі ды ваніль па гусце. Змешваем і падагреваем на невялікім агні да загусцення. Атрыманы незвычайны сіроп піўная гуру раіць падаваць з ванільным марозівам ці мяккімі гатункамі сыру (бры, напрыклад).

Дарэчы, пра сыр. Піўны эксперт прызнаецца, што доўгі час сыр на дух не пераносіла. Ажно да той пары, пакуль не пакаштавала яго з... удала падабраным гатункам піва. Так што перафразуючы знакамітыя жарт, мы можам усім, хто не любіць нейкія прадукты, сказаць:

«Вы проста не ўмееце іх спалучаць»

Удала камбінаваць дражджавы напой з узорамі той ці іншай кухні дапамогуць некалькі базавых парад прафесіянала:

● Піва з высокім узроўнем хмелю лепш каштаваць з тлустымі стравамі — яно будзе абмываць ротавую поласць і дапаможа дасягнуць балансу ў смаку. Горыч піва будзе ўзмацняць горыч ежы — сырой гародніны, напрыклад. Таму варта не перастарацца. Калі ж гародніну вы прыгатуеце, — прапануе магчымае развіццё падзей эксперт, — то смак яе «змякчыцца і будзе лепш гарманіраваць з абраным півам».

● Цёмны портар лепш не спалучаць з лёгкай рыбай. «Вы папросту заб'яце смак рыбы», — тлумачыць Стрэтквери. «А вось піва з фруктовымі ноткамі будзе падтрымліваць і адцяняць лёгкі смак рыбы», — абяцае карыфей.

● Салодкасць портару падтрымае салодкасць дэсертаў, таму можна смела падаваць яго з пірагамі і марозівам.

Мы павінны даць піву магчымасць здзівіць нас, кажа замежная госця. Бадай, лепшага базісу для імправізацый і не знойдзеш!

Назва «портар» пайшла ад таго, што такое піва пілі насільшчыкі, якія працавалі ў порце.

Вы проста не ўмееце іх каштаваць

Мала падабраць да піва гарманічны пачастунак, трэба яшчэ і належным чынам часцаваць. Пра «кухню» піўной дэгустацыі даведваемся з расповедаў Сігрыд Стрэтквери. Хочаце верце, хочаце не, але смак хмяльнога напою напрамую залежыць і ад таго, якім чынам яго дэгуставаць — якой тэмпературы і нават у якім келіху. А самае цікавае, што «на 80 адсоткаў смак залежыць ад убачанага», запэўнівае эксперт. Так што вочы — першая зброя піўнога гурмана. Ад цёмнага піва, маўляў, адны чаканні, ад светлага — іншыя. Ад сябе дадамо, што выклікаць апетыт часам здольная адна толькі пенная шапка — пухкая, лёгкая і густая. Ммммм... Рот, вядома ж, — таксама не апошні дарадца ў дэгустацыі. З півам, у адрозненне ад віна, галоўнае — яго праглынуць, бо смакавыя рэцэптары, якія распазнаюць горыч, знаходзяцца ля кораня языка. І калі пры дэгустацыі абысціся з пенным напоем, як з віном — выплюнуць яго, — вы рызыкуеце «недасмакаваць».

Тры асноўныя кампаненты, ад балансу якіх і залежыць піўная кампазіцыя, адказваюць кожны за сваё. Солад надае піву, зразумелая рэч, салодкасць, хмель — горыч, а дрожджы — смак садавіны. У піве, кажа Сігрыд Стрэтквери, больш як 800 разнастайных адценняў смаку. Яна прызнае, што распазнаць усе 800 — задача нялёгкая. І цяжкасць яе напрамую залежыць ад тэмпературы. «Піць халоднае піва — усё роўна што наведаць сімфанічны канцэрт у навушніках», — згадвае трапны выраз аднаго са сваіх калег спецыяліст і тлумачыць: «Халоднае піва асвяжае, але так цяжэй адрозніць адценні смаку». Трэба, відаць, «пастаянна і вельмі шмат трэніравацца», выказвае здагадку спадарыня Стрэтквери, «не толькі ў аб'ёме, але і ў разнастайнасці». Тады лагер можна падаваць не цяплейшым за 3 — 6 градусаў і абавязкова ў высокіх келіхах. Так напой дасягне патрэбных смакавых рэцэптараў і пакіне аб сабе належнае ўражанне. А цёмны портар, наадварот, лепш падаваць у посудзе больш шырокай формы. Падобным да келіхаў для каньяку ці чырвонага віна. І правілы для цёмнага піва аналагічныя: каштаваць нехалодным, саграваць келіх у руцэ.

— Так вы адчуеце больш адценняў смаку, — абяцае майстра і разадорвае асабістым прыкладам: — Мы з мужам ніколі не захоўваем цёмнае піва ў лядоўні — трымаем яго пры пакаёвай тэмпературы... у спальні!

Як вам такая закуска да піва? Эксперты кажуць ёй «так», пры ўмове... што ў вашым келіху портар.

Вы проста не ўмееце іх гатаваць

Хто сказаў, што піва нельга... есці?! Печыва ў выкананні маёй добрай знаёмай заўжды робіць фурор, а сакрэт ласунку просты: у цеста дабаўляецца піва. Не грэбуюць арыгінальным інгрэдыентам і віртуозы высокай кухні. «Гатаваць з півам вельмі весела», — кажа Сігрыд Стрэтквери. Хто б сумняваўся! «Заўжды адкрываеш новыя смакі», — удакладняе піўная знаўца. Яна звяртае ўвагу ўсіх, што забраўся пакулінарыць з півам, што яго, у адрозненне зноў жа ад віна, рызыкоўна дабаўляць у страву рана. «Піва змяшчае горыч, і, калі варыць яго доўгі час, ежа стане больш горкай». Пазбегнуць гаркавага прысмаку можна, дадаўшы піва на позніх стадыях гатоўкі, ці тады ўжо, наадварот, — варыць да пераможнага канца. Цягам трох гадзін, абяцаюць прафесіяналы, горыч вытыхаецца.

Кулінарны геній, знакаміты шэф-кухар Іньяцыа Роза сакрэты піўной кухні ведае назубок. Шэсць гадзін марынаваў селядзец у піве, перш чым ім пачалі ласавацца госці дэгустацыі ад «Аліварыі», якая імкнецца прывіць беларускаму аматару густ да піва. Вынікі яго старанняў удзельнікі вячэры ацэньвалі ў дуэце з «Экстрай» ці «Залатым». Мне, на ўзроўні ўспрыняцця, прыйшоўся даспадобы першы. У піўнога эксперта, спадарыні Стрэтквери, на гэта знайшлося прафесійнае тлумачэнне: больш сухі і горкі гатунак піва лепш асвяжае ротавую поласць, таму з ім страва ідзе лепш.

Парфумеры ведаюць, што захаваць непаўторнасць успрыняцця кожнага новага паху дапаможа кава. Кулінары ж раяць для гэтых мэт сарбета — салодкі пачастунак накшталт мяккага марозіва. Не паверыце, але яго таксама можна спалучаць з півам. Пададзенае разам з пенным напоем у высокім вузкім келіху, як шампанскае, яно не толькі радуе вока, але і рыхтуе гурмана да наступнай стравы.

Урокі рэлігіі — гэта, перш за ўсё, выхаванне самастойных асоб, якія здольныя крытычна разважаць.

Рэлігійная адукацыя дазволіла б умацаваць насельніцтва, зрабіла б яго больш упэўненым і дапамагла знайсці свой уласны шлях развіцця.

Семінар наведаў таксама **намеснік кіраўніка Амбасады ФРГ у Мінску Петер ДЭТМАР.**

— Для мяне вельмі важна магчымасць грамадзянскага дыялогу ва ўсіх яго формах, — сказаў ён. — Я лічу, што выкладанне рэлігіі з'яўляецца надзвычай важнай часткай нашага жыцця. Праз такія ўрокі мы перадаём пакаленню, якое падрастае, важны жыццёвы аспект. Вядома, маладыя людзі маюць права на ўласнае рашэнне. Ім вырашаць, што ў далейшым рабіць з тым, што яны набылі. Але якраз для таго, каб даць магчымасць выбару, мы і павінны пазнаёміць гэтых людзей з рэлігійнымі поглядамі.

БЕЛАРУСКІ ВОПЫТ

Зараз у Беларусі падпісана пагадненне Міністэрства адукацыі і Праваслаўнай царквы, згодна з якім у школах можа выкладацца рэлігіязнаўчы факультатыў, напрыклад, «Асновы праваслаўнай культуры» або падобны. Для гэтага трэба, каб бацькі напісалі калектыўную заяву, а кіраўніцтва школы іх падтрымала і ўставіла факультатыў у расклад заняткаў. Але гэта не ўсё. Патрэбны яшчэ праграмы, кадры і жаданне саміх вучняў.

Зацверджаная праграмы для такога факультатыву з першага па 11 клас пакуль няма. Ёсць праграмы для асобных класаў, у асноўным для старэйшых: «Асновы рэлігіязнаўства», «Рэлігія і культура», «Біблія і сусветная літаратура», якія закранаюць маральна-духоўныя пытанні. Ёсць яшчэ эксперыментальныя пляцоўкі ў школах і дзіцячых садках, дзе таксама праводзяцца ўрокі маральнага зместу, практыкуюцца і выхаваўчыя мерапрыемствы ў розных школах падчас класных гадзін з удзелам прадстаўнікоў царквы.

Знайсці настаўніка можа аказацца не проста. Важна, каб чалавек меў не толькі педагагічную адукацыю, веды ў галіне багаслоўя, быў зацікаўлены ў поспеху свайго курса, але і падаваў дзецям асабісты прыклад.

— Фарміраванне такіх кадраў — не толькі задача дзяржавы і Царквы, але і грамадства, — упэўнены **кіраўнік аддзела адукацыі і катэхізацыі Мінскай епархіі Беларускай праваслаўнай царквы протаіерэй Аляксандр ШЫМБАЛЁЎ.** — Але рух наперад у плане выкладання рэлігіязнаўчых дысцыплін у школе ёсць: колькасць дзяцей, якія жадаюць наведваць такія факультатывы, расце.

Кацярына Шахрай, настаўніца фізікі і астраноміі па адукацыі, выкладае «Асновы праваслаўнай культуры» ў 5-7 класах Калінкавіцкай сярэдняй школы № 2 ужо чатыры гады. Для выпускнікоў яна чытае курс «Сямейнае выхаванне». Яе факультатывы наведваюць амаль 100 працэнтаў вучняў. Яна расказвае, што бацькоў ёй пераконваць не даводзіцца, яны вельмі рады такой магчымасці. Галоўнае, каб захацелі самі дзеці.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА,
Мядзельскі раён.

РЭЛІГІЙНАЯ АДУКАЦЫЯ Ў ШКОЛЕ: КРОК НАСТУПНЫ

Умаі—ліпені мінулага года на старонках «Звязды» разгарнулася дыскусія вакол выкладання рэлігіі ў школе. Нагодай сталі XVI Міжнародныя Кірыла-Мяфодзьеўскія чытанні, арганізатарам і фундатарам якіх выступіў аднайменны Хрысціянскі адукацыйны цэнтр. Нядаўна свет убачыў зборнік матэрыялаў гэтых чытанняў, прысвечаных тэме рэлігійнай культуры ў кантэксце свецкай адукацыі. Яшчэ адным працягам тэмы стаў сёлетні Летні багаслоўскі інстытут (ЛБІ-2011), у рамках якога адбыўся семінар «Выкладанне асноў рэлігійнай культуры ў дзяржаўных школах. Вопыт Германіі і вопыт Беларусі». Арганізатары ЛБІ-2011 запрасілі журналіста «Звязды» да ўдзелу ў семінары.

Псіхатэрапеўт Уладзімір КАБАНАЎ (Светлагорск) чытае лекцыю, прысвечаную ўзаемаадносінам у сям'і ў Летнім багаслоўскім інстытуце-2011.

ІНТЭЛЕКТУАЛЬНЫ ПІР НА МЯДЗЕЛЬШЧЫНЕ

Летні багаслоўскі інстытут упершыню ў Беларусі быў арганізаваны ў 1999 годзе па ініцыятыве Біблейска-багаслоўскага інстытута імя св. Апостала Андрэя (Масква) і Хрысціянскага адукацыйнага цэнтра імя святых Мяфодзія і Кірылы (Мінск). З таго часу кожны год ён збірае на некалькі тыдняў тэолагаў, студэнтаў, журналістаў, урачоў, настаўнікаў і хрысціянскую моладзь, а апошнім часам у ім бяруць удзел таксама скептыкі і людзі, якія не вызначыліся ў пытаннях веры, але жадаюць павысіць узровень сваіх ведаў у тэалогіі і складзі ўяўленне аб стане сучаснай багаслоўскай думкі.

ЛБІ адбываецца, як правіла, на ўлонні прыроды, у пэўнай ізаляцыі не толькі ад гарадской мітусні і звыклага жыцця, але і ад людзей старонніх. Звычайна гэта — невялікія базы адпачынку ў маляўнічай мясцовасці. Лекцыі часта чытаюцца проста пад адкрытым небам. Гэта дазваляе слухачам літаральна пагрузіцца ў атмасферу інтэлектуальнага піру, пэўны час жыць разам і мець зносіны з вучонымі, гісторыкамі, аднадумцамі і апанентамі, у спрыяльнай і добразычлівай атмасферы весці дыскусіі, абменьвацца вопытам, пашыраць і сістэматызаваць свае веды.

— Сёлетняя праграма Інстытута складалася з дзвюх сесій, — расказаў «Звяздзе» кіраўнік аргкамітэта ЛБІ-2011, **кіраўнік Цэнтра Міжнародных сувязяў і развіцця багаслоўскай адукацыі Інстытута тэалогіі БДУ Рыгор ДАЎГЯЛА.** Галоўнай асаблівасцю стаў семінар, на які мы ўпершыню запрасілі не толькі настаўнікаў рэлігіязнаўчых прадметаў, але і свецкіх чыноўнікаў з Беларусі і Германіі, у сферу інтарэсаў якіх уваходзіць супрацоўніцтва з рэлігійнымі арганізацыямі.

Удзельнікі семінара сышліся ў меркаванні, што цікавым быў не толькі нямецкі вопыт, але і магчымасць даведацца пра вопыт выкладання факультатыўнага курса «Асновы праваслаўнай культуры» ў розных рэгіёнах Беларусі.

— Мы пакуль што варымся ва ўласным соку, — заўважыла **метадыст Брэсцкага абласнога інстытута развіцця адукацыі Алена БАГАЦЮК.** — Выкладанне рэлігіі ў школе — вельмі малады напрамак, таму мне цікава было пазнаёміцца з людзьмі, якія працуюць у гэтай сферы. Тое, што дзяржава і Царква ўвялі такі факультатыў, несумненна, добра. Але агульнай методыкі няма. Немцам прасцей: у іх ёсць заканадаўчая база, шматгадовы вопыт. Цяпер, пасля ўдзелу ў семінары, я лепш уяўляю, якім павінна быць выкладанне рэлігіі і каму гэта варта даручаць.

НЯМЕЦКІ ВОПЫТ

Выкладанне рэлігіі ў школах Германіі знаходзіцца пад кантролем дзяржавы і адбываецца ў адпаведнасці з прынцыпамі канкрэтнай рэлігійнай абшчыны. Такія заняткі ўваходзяць у склад абавязковых прадметаў ва ўсіх школах, больш за тое, гэта — адзіны гарантаваны прадмет у канстытуцыі.

— Мы жывём у краіне, дзе дзяржава і Царква, таксама як і ў Беларусі, аддзеленыя адно ад аднаго, — патлумачыў журналісту **д-р Вольфрам фон МОРЫЦ, кіраўнік аддзела па пытаннях адукацыі і школ епархіі Евангелісцка-Лютэранскай царквы зямлі Паўночны Рэйн-Вестфалія (г. Білефельд).** — Але ва ўсіх школах рэлігійныя ўрокі з'яўляюцца абавязковымі. Пакуль дзіцяці не споўніцца 12 гадоў, рашэнне аб наведванні такіх урокаў прымаюць бацькі, з 12 да 14 гадоў — дзеці і бацькі разам, а з 14 гадоў дзеці самастойна вырашаюць, слухаць курс далей альбо не. Аднак выкладанне рэлігіі мае ў нас такую высокую папулярнасць, што адмаўляюцца адзінкі — толькі 5 адсоткаў усіх вучняў. Такія дзеці і падлеткі выбіраюць іншы прадмет, у якім апавядаецца пра тыя ж самыя каштоўнасці, напрыклад, этыку альбо філасофію.

Яшчэ адна агульная рыса нашых краін — шматканфесійнасць і прынцып роўнасці перад законам. Кіруючыся гэтым прынцыпам, Германія імкнецца даць магчымасці для выкладання рэлігійных заняткаў прадстаўнікам усіх веравызнанняў. Акрамя евангелісцкіх і каталіцкіх курсаў, існуюць таксама праваслаўныя ўрокі на нямецкай мове, завяршаецца распрацоўка канцэпцыі ісламскіх заняткаў.

— Я выкладаю евангелісцка-лютэранскі курс, — расказала **пастар і выкладчык вучылішча ў горадзе Дортмунд Андрэа АУРАС-РАЙФЭН.** — Мы імкнёмся навучыць школьнікаў самастойна прымаць рашэнні і знаходзіць уласны адказ на пытанне пра сэнс жыцця. Асноўная ідэя — даць чалавеку арыенціры ў грамадстве і жыцці, навучыць яго разбірацца ў шматлікасці рэлігійных арганізацый. Размова ідзе пра выхаванне ўласнай ідэнтычнасці. У Германі

Сумеснае таварыства з абмежаванай адказнасцю «Марко»:

20 ГАДОЎ СТАБІЛЬНАСЦІ НА АЙЧЫННЫМ РЫНКУ

За 20 гадоў прафесійнай дзейнасці на абутковым рынку Беларусі і за яе межамі брэнд «Марко» заваяваў трывалыя пазіцыі. Галоўныя перавагі абутку «Марко» — адпаведнасць сучасным тэндэнцыям абутковай моды, якасць, камфорт.

Сёння асноўная дзейнасць кампаніі — выраб і рэалізацыя мужчынскага, жаночага, дзіцячага мадэльнага абутку, а таксама абутку спартыўнага асартыменту і для дамашняга карыстання.

З гісторыі

Прадпрыемства «Марко» заснавана ў 1991 годзе як прыватная кампанія. Праўда, абутковую спецыялізацыю фірма набыла двума гадамі пазней: тут была наладжана вытворчасць высакаякаснага абутку з натуральнай скуры на падэшве з поліўрэтанавых кампазіцыйных матэрыялаў. Не дзіўна, што ўжо першыя мадэлі аб'ядналі ў сабе лепшыя абутковыя характарыстыкі: камфорт, зручнасць, значны тэрмін эксплуатацыі і знешнюю прывабнасць.

Першай парай абутку, якая сышла з канвеера «Марко», стаў мужчынскі паўчаравік мадэлі 4351. Гэтая мадэль да гэтага часу выпускаецца на прадпрыемстве і карыстаецца павышаным попытам у пакупнікоў.

Спатрэбілася ўсяго толькі некалькі гадоў, каб у вытворчасць былі запушчаны дзіцячыя і падлеткавыя мадэлі. А калі ў 1997 годзе быў асвоены клеявы метад мацавання, то мадэльны рад мужчынскага, жаночага і дзіцячага абутку «Марко» самых розных накірункаў і цэнавых катэгорый прыйшоўся даспадобы многім моднікам і модніцам.



Маладыя мастакі — мадэльеры Юлія ПЕТРАЧЭНКА і Вольга ДОЛАТАВА — занятыя стварэннем чарцяжоў дэталяў новых вырабаў. Рабочыя месцы стваральнікаў новых мадэляў размешчаны ў новым прасторным памяшканні.

Сёння СТАА «Марко» — гэта перадавыя высокатэхналагічныя працэсы вытворчасці з прымяненнем сучаснага абсталявання і новых тэхналогій

Колькасць калекцый абутку «Марко» ўражвае:

● **«Marko Prestige»** — яркі, модны жаночы абутак, які выдзяляецца;

● **«Marko Premier»** — абутак гэтай мужчынскай калекцыі вызначае строгасць і элегантнасць класічных формаў, высокая якасць матэрыялу.

Не менш папулярныя класічныя калекцыі — жаночая **«Marko Elegant»** і мужчынская **«Marko Classic»**, — калекцыя зручнага і практычнага абутку **«Marko Comfort»**.

Калекцыя **«Marko Comfort»** — мужчынскі і жаночы абутак павышанага камфорту, ідэальны варыянт на кожны дзень. Значнай папулярнасцю карыстаецца абутак калекцыі **«Marko Comfort»** ліццявога метаду мацавання. Вызначальнай рысай гэтага абутку з'яўляецца шырокая калодка, падэшва павышанай трываласці, мяккія ўнутраныя швы, прадуманыя ўстаўкі для рэгулявання паўнаты і вышыні пад'ёму. Акрамя таго, у асартыменце калекцыі прысутнічаюць «вялікія памеры» — мужчынскі да 48, жаночы — да 42.

Добры абутак — гэта важная дэталь паўсядзённага жыцця дзіцяці. Мадэлі дзіцячай калекцыі **«San Marko»** распрацаваны ў адпаведнасці з анатамічнай будовай дзіцячай і падлеткавай ступні, адпаведны фасон верху забяспечвае добрую фіксацыю нагі ў абутку. У 2009 годзе асарымент дзіцячага абутку «Марко» папоўніўся мадэлямі дзіцячага абутку з 23 па 27 памер.

Устойлівым попытам карыстаецца і абутак добра знаёмых спажыўцу абутковых калекцый для актыўнага адпачынку **«Marko Active»**, **«Marko Sport»** і **«Marko Boots»**, а таксама калекцыя дамашняга абутку **«Home Marko»**.

Для найбольш поўнага задавальнення зменлівых патрэб пакупнікоў кампанія пастаянна ўдасканальвае і абнаўляе асартымент абутку. Так, у 2010 годзе з'явіліся мадэлі новай калекцыі моднага абутку для гарадскога асяроддзя **«Marko Relax»**, вызначальнай рысай якога з'яўляецца выкарыстанне высокакамфортных і якасных матэрыялаў, наяўнасць гнуткай і лёгкай падэшвы.

Генеральны дырэктар Мікалай МАРТЫНАЎ з 25-мільённай парай абутку.

Колькасць калекцый абутку «Марко» ўражвае

У мэтах задавальнення попыту спажыўцоў кампаніяй «Марко» была распрацавана калекцыя абутку **«Optima»**. Гэта прадукцыя з сінтэтычных матэрыялаў, якая вызначаецца павышанай зручнасцю і практычнасцю, а таксама невысокім коштам — ён дасягаецца без урону для трываласці і зносастойкасці. Выпуск гэтай калекцыі наладжаны на вытворчых плошчах ААТ «Чырвоны Кастрычнік». Калекцыя карыстаецца павышаным попытам у спажыўцоў.

У 2010 годзе ўбачыла свет новая гандлёвая марка **Bravo** — гэта ўвасабленне мары самага запатрабавальнага і адмысловага пакупніка, які сочыць за моднымі тэндэнцыямі на абутковым рынку не толькі нашай краіны, але і далёка за яе межамі. Такі абутак вызначаецца павышай якасцю скураных матэрыялаў, найбольш эксклюзіўным аздабленнем тавару рознымі аксесуарамі. Абутак маркі **«Bravo»** з самымі лепшымі італьянскімі традыцыямі, разлічаны на людзей, якія могуць сабе дазволіць не эканоміць на супермодным высакаякасным абутку.

Успорце кажуць, што стабільнасць — прыкмета майстэрства. Відавочна, што для вытворчасці гэты журналісцкі штамп таксама падыходзіць вельмі дакладна і найлепшым чынам характарызуе любую кампанію ці арганізацыю ва ўсяляких, і асабліва экстрэмальных, умовах. У поўнай меры такія аптымістычныя ноткі адносяцца да сумеснага таварыства з абмежаванай адказнасцю «Марко», якое вось ужо два дзясяткі гадоў «прапісана» ў Віцебску і працяглы час з'яўляецца заканадаўцам моды на абутковым рынку краіны. Прадпрыемства на працягу ўсёй прафесійнай дзейнасці вызначаецца стабільнасцю, выпускаючы шырокі асартымент высакаякаснай і даступнай прадукцыі.

Якія рэкламныя слоганы пры цесным знаёмстве з СТАА «Марко» не нараджаліся ў галовах пакупнікоў і партнёраў! Адзін з іх надзвычай арыгінальны: «Будзеш ісці па жыцці шпарка — набывай абутак «Марко». Што зусім глумачыцца проста. Прадукцыя «Марко» адрозніваецца разнастайнасцю мадэляў, шырокай колеравай гамай, камфортам, якасцю і даступнасцю па цане ботаў, чаравікаў, басаножак, сандалетаў, макасін, красовак, дамашніх тапак... Летась кампанія выйшла на міжнародны рынак з новым брэндам элітнага жаночага і мужчынскага скуранога абутку — «BRAVO». Станоўчай дынаміцы, па якой развіваецца прадпрыемства, можна толькі па-добраму пазайздросціць.

У фірменным магазіне.

Апрацоўшчык дэталяў верху абутку Віктар ЛОВІКАЎ.

Нашы рэквізіты:
Рэспубліка Беларусь
210033, г.Віцебск, пр-т Фрунзе, д.85
Тэл.(+375 212)-24-86-18, 24-58-18
Факс:(+375 212)-24-17-41
E-mail: post@marko.vitebsk.by
www.marko.by

Загадчыца фірменнага магазіна «Марко» Наталля БАДРЫЦКАЯ і прадавец Крысціна МАРУДАВА.

ТАА «МАРКО-СЭРВІС»

Калекцыя мадэляў «Марко» налічвае звыш 1000 узораў мужчынскага, жаночага, падлеткавага і дзяцячага абутку. Як разабрацца ў тым, што неабходна сёння пакупніку, як спрагназаваць попыт? Вырашыць гэтыя пытанні дапамагае фірменны гандаль.

Першы ўласны магазін кампаніі «Марко» з'явіўся ў 1994 годзе. Ён поўнасцю апраўдаў надзеі кіраўніцтва «Марко»: штодзённыя кантакты з пакупнікамі, змяненне попыту на тую ці іншую мадэль, штодзень «жывыя» грошы, якія ідуць на развіццё вытворчасці. Дзякуючы гэтым фактарам вытворчасць абутку на прадпрыемстве «Марко» набыло неабходную гібкасць, фінансавую ўстойлівасць, а самае галоўнае — высокую папулярнасць сярод пакупнікоў. Развіваць брэнд «Марко» на «людзях» было даручана новаму прадпрыемству «Марко-сэрвіс», якое ўжо паспяхова праіснавала паўтара дзясятка гадоў. Зараз ТАА «Марко-сэрвіс», на якім працуе больш за 300 чалавек, уключае ў сябе 25 фірменных магазінаў і здзяйсняе транспартнае абслугоўванне прадпрыемстваў «Марко».

За першае паўгоддзе 2011 года праз фірменную гандлёвую сетку рэалізавана каля паўмільёна пар абутку. Аўтапарк ТАА «Марко-сэрвіс» налічвае каля 40 адзінак грузавых і легкавых аўтамабіляў.

Магазіны СТАА «Марко» размешчаны ва ўсіх абласных і буйных раённых гарадах Беларусі. Толькі ў сталіцы іх чатыры, якія адкрыліся крыху больш чым за год.

У перспектыве «Марко» збіраецца ахапіць сваёй фірменнай сеткай усе беларускія гарады з колькасцю насельніцтва звыш 20 тысяч чалавек.

Фірменныя магазіны «Марко» — непасрэдныя ўдзельнікі рэкламных акцый і арганізатары шматлікіх выставак-продажаў

Фірменныя магазіны СТАА «Марко»:

г. ВІЦЕБСК
● Гандлёвы Дом «Марко-Стыль», вул. Талстога, 5, тэл. (+375-212)-37-63-80
● Гандлёвы Дом «Марко», вул. Чарняхоўскага,10, тэл. (+375-212)-22-78-00
● цэнтр абутку «Марко», пр-т Людніка ва, 16, тэл. (+375-212)-24-09-70
● магазін-салон «Марко», пр-т Маскоўскі, 8, тэл. (+375-212)-27-71-42
● павільён «Марко», тэл. (+375-212)-36-58-21

г. МІНСК
● вул. Казлова, 2, тэл. (+375-17)-2-849-154
● вул. Кашавога, 35, тэл. (+375-17)-2-307-303
● вул. Чкалава, 35. тэл. (+375-17)-2-190-297
● пр-т Незалежнасці, 43, тэл. (+375-17)-2-847-992

г. БАБРУЙСК
● вул. Мінская,15, тэл. (+375-17)-58-03-91

г. ПОЛАЦК
● вул. Камуністычная, 28, тэл. (+375-2144)-4-56-66

г. НАВАПОЛАЦК
● вул. Маладзёжная, 71, тэл. (+3752145)-3-24-88

г. БРЭСТ
● пр-т Маскоўскі, 332, тэл. (+375-162)-42-45-01
● пр-т Машэрава, 39. тэл. (+375-162)-20-30-05

г. ГОМЕЛЬ
● вул. Перамогі, тэл. (+375-232)-77-63-66

г. ЖЛОБІН
● мікрараён-1, 1, тэл. (+375-2334)-5-07-91

г. МАГІЛЁЎ
● вул. Ціміразеўская, 36, тэл. (+375-222)-32-75-95
● вул. Першамайская, 40, тэл. (+375-222)-28-74-90

г. МАЛАДЗЕЧНА
● вул. Б.Хмяльніцкага, 22А, тэл. (+375-1773)-5-35-97

г. ОРША
● вул. Леніна, 23, тэл. (+375-2162)-1-16-42

г. СВЕТЛАГОРСК
● м-н Першамайскі, 3А, тэл. (+375-2342)-2-31-33

г. САЛІГОРСК
● вул. Казлова, 26А, тэл. (+375-1710)-5-05-26

г. БАРАНАВІЧЫ
● вул. Савецкая,105А, тэл. (+375-0163)-41-03-84).

Фірменны гандаль СТАА «Марко» — не толькі гонар прадпрыемства, але і неад'емная частка бізнэсу.

СТАТЫСТЫКА СВЕДЧЫЦЬ...

За перыяд з 1994 года выпуск абутку павялічыўся больш чым у 20 разоў. За 2010 год аб'ём вытворчасці трох абутковых фабрык кампаніі «Марко» — СТАА «Марко», прыватнае прадпрыемства «Сан Марко» і ААТ «Чырвоны Кастрычнік» — склаў 3 мільёны 900 тысячы пар абутку, што на 450 тысяч больш, чым летась. Сённяшнія магутнасці дазволяць выпускаць каля 4,2 мільёна пар абутку ў год.

За час работы прадпрыемства «Марко» ўжо выпушчана каля 32,4 мільёна пар высакаякаснага абутку.

Абнаўляльнасць мадэльнага рада ў год складае прыкладна 80 працэнтаў. За гэты перыяд мастакі-мадэльеры распрацоўваюць звыш 1000 мадэляў мужчынскага, жаночага і дзіцячага абутку, з якіх прыкладна палова запускаецца ў вытворчасць.

СТАА «Марко»: 20 гадоў на абутковым рынку

● **1991 год** — арганізавана фірма «ЛМ+МК». Пачаўшы свой шлях як гандлёва-закупачная кампанія, яна хутка пачала развівацца як вытворчая фірма;

● **1993 год** — уведзена лінія па вытворчасці мужчынскага абутку з натуральнай скуры на поліўрэтанавай падэшве;

● **1995 год** (4 лістапада) — упершыню на «Марко» сталі выпускаць падлеткавы і дзіцячы абутак;

● **1996 год** (красавік) — выпушчаны першы мільён пар абутку з таварным знакам «Марко»;

● **1996 год** — створана ТАА «Марко-Сэрвіс»;

● **1996 год** (верасень) — здадзены ў эксплуатацыю асноўны адміністрацыйна-вытворчы корпус фабрыкі «Марко», здзейснены пераход вытворчасці на ўласныя рэйкі;

● **1997 год** — асвоены клеявы метад мацавання, што дазволіла «Марко» пачаць вытворчасць жаночага мадэльнага абутку;

● **1997 год** (люты) — адкрылася ПУВП «ВітМа». На прадпрыемстве пачалася вытворчасць аксэсуараў: сумак, кашалькоў, паясоў, рамянёў;

● **1999 год** (лістапад) — зарэгістравана сумеснае беларуска-германскае прадпрыемства «Вікоп-Фагус», якое не мае аналагаў у Беларусі. На гэтым прадпрыемстве наладжаны выпуск абутковых калодак;

● **2003 год** (красавік) — з канвеера СТАА «Марко» сышла 10-мільённая пара абутку;

● **2003 год** (ліпень) — адкрылася прыватнае прадпрыемства «Сан-Марко»;

● **2003 год** — асвоены новы від зімовага абутку тыпу «унты», у якіх сучасныя модныя тэндэнцыі ўдала зліліся з традыцыйнымі для паўночных раёнаў матывамі;

● **2005 год** (сакавік) — пачалася вытворчасць спартыўнага і прагулачнага абутку «Марко-спорт»;

● **2005 год** (ліпень) — у продаж паступіла піва «Николаевское», выпушчанае на СТАА «Дзвінскі бровар»;

● **2006 год** (люты) — на СТАА «Марко» выпушчана 15-мільённая пара абутку.

● **2007 год** — прадпрыемства сертыфікавала вытворчасць на адпаведнасці сістэме якасці ISO-9001.

● **2008 год** — СТАА «Марко» асвоіла вытворчыя плошчы на фабрыцы «Чырвоны Кастрычнік»;

● **2008 год** (жнівень) — пачатак будаўніцтва новых гандлёвых плошчаў у Віцебску;

● **2008 год** (9 кастрычніка) — з канвеера прадпрыемства сышла 20-мільённая пара абутку;

● **2008 год** — пачатак будаўніцтва гандлёва-забаўляльнага комплексу «Бізнэс-цэнтр «Марко-Сіці», тэрміны завяршэння якога вызначаны графікам — канец 2011 года;

● **2009 год** — вытворчасць кампаніі «Марко» за год дасягнула 4 000 000 пар абутку, у тым ліку на ААТ «Чырвоны Кастрычнік» — 1 000 000 пар;

● **2010 год** — на прыватным прадпрыемстве «Сан Марко» асвоены і ўкаранёны ў вытворчасць прынцыпова новы абутковы напрамак — выпуск элітнага скуранога абутку гандлёвай маркі «Bravo»;

● **2011 год** — выпуск 25-мільённай пары абутку. Усяго трыма прадпрыемствамі кампаніі да гэтага часу выпушчана больш 30 мільёнаў пар абутку;

● **2011 год** — 20-я гадавіна з дня ўтварэння кампаніі «Марко».

Асенні дзіцячы абутак упрыгожаны ўсімі фарбамі вясёлкі — гэта справа рук зборшчыцы верху абутку Алены АФАНАСЬЕВАЙ.

Там, дзе няспынна рухаецца канвеер, працуе зборшчыца Наталья ТРАПЯНОК.

ГЭТА ЦІКАВА ВЕДАЦЬ...

Паводле статыстыкі зараз кожны чацвёрты жыхар Беларусі мае ў сваім гардэробе пару абутку «Марко». У юбілейным для сябе 2011 годзе «Марко» мае намер вырабіць кожную трэцюю пару абутку ў краіне: з 13 мільёнаў пар, запланаваных да выпуску ў Беларусі, 4,2 мільёна пар будуць адзначаны таварным знакам «Марко».

За першае паўгоддзе 2011 года прадпрыемствамі кампаніі «Марко» было выраблена і паспяхова рэалізавана звыш 1 800 000 пар высакаякаснага абутку.

Прадпрыемствы кампаніі «Марко» валодаюць высокім экспартным патэнцыялам: больш за 50 працэнтаў прадукцыі, што вырабляецца, экспартуецца. Асноўны замежны рынак — Расійская Федэрацыя.

За час існавання прадпрыемства «Марко» інвеставала ў развіццё прадпрыемстваў і аб'ектаў сацыяльна-культурнай сферы звыш 40 мільёнаў долараў.

Дворык ля «Залатога льва» — адно з папулярных месцаў адпачынку. Усіх гасцінна сустракае бармен Алеся ПАЛЯКОВА.

СТАА «Марко — гэта больш чым абутковае прадпрыемства. Гэта своеасаблівы холдынг, у склад якога ўваходзяць шэсць прадпрыемстваў:

● **Прыватнае прадпрыемства «Сан Марко».** Даччынае прадпрыемства з 2003 года. Тут, акрамя «дарослага» мужчынскага і жаночага абутку, вырабляецца дзіцячы і падлеткавы. А сёлета на прадпрыемстве **«San Marko»** павінен значна пашырыцца дзіцячы асартымент абутку — з канвеера сыдзе разнастайны абутак, пачынаючы з 20-га памеру.

● **СТАА «Вікоп-Фагус».** Для таго, каб ствараць камфортны абутак, зручны для айчынных вытворцаў, з лістапада 1999 года на «Марко» арганізавана прадпрыемства «Вікоп-Фагус». Сёння гэта адзіная на тэрыторыі Беларусі вытворчасць, якая займаецца вырабам абутковых калодак.

● **Прыватнае ўнітарнае вытворчае прадпрыемства «ВІТМА».** Вядома, што модны стыль стварае не толькі добры модны абутак, але і спадарожнікі-аксесуары. На прадпрыемстве «ВІТМА» пачалі перапрацоўваць адходы асноўнай абутковай вытворчасці і шыць з іх партманеты, футляры для ачкоў, ключоў і інш.

● **СТАА «Дзвінскі бровар».** Піваварэнае прадпрыемства «Дзвінскі бровар» пачало сваю гісторыю ў 2004 годзе, калі на тэрыторыі колішняга прадпрыемства «Віцебскае піва» пачалося будаўніцтва новай вытворчасці. Годам пазней аматары пеністага напітку змаглі па заслугах ацаніць піва «Николаевское», а потым квас «Дзвінскі». Іх галоўнае адрозненне ад іншых марак у тым, што іх вараць па арыгінальнай рэцэптуры, якая на працягу многіх стагоддзяў прыносіла поспех вытворцам квасу і перавагу баварскім піваварам.

● **ААТ «Чырвоны Кастрычнік».** Прадпрыемства «Чырвоны Кастрычнік» — адно са старэйшых на абутковым рынку Рэспублікі Беларусь, якое вядзе свой вытворчы адлік з 1923 года. Сёлета тут запланавана выпусціць каля 1 200 000 пар камфортнага і недарагога абутку.

● **ТАА «Марко-Сэрвіс».** Зараз тут працуе больш за 300 чалавек. Яно ўключае ў сябе 25 фірменных магазінаў і здзяйсняе транспартнае абслугоўванне прадпрыемстваў «Марко».

СТАА «Марко» працуе, зыходзячы з прынцыпу: «Паспяховы айчынны вытворца — апора стабільнасці беларускай эканомікі». Штодня сваё імкненне да лідарства прадпрыемства даказвае на практыцы.

Прызнаннем заслуг кампаніі з'яўляецца перамога ў шматлікіх конкурсах і намінацыях. У 2011 годзе па выніках міжнароднага фестывалю-конкурсу «Выбар года» сёмы раз запар кампанія «Марко» пацвердзіла высокае званне «Айчынны вытворца абутку №1». «Высокай адзнакі ўдастоіўся і дзіцячы абутак «Марко», у чарговы раз пацвярджаючы званне «Дзіцячы абутак №1 у Беларусі».

Па выніках 2010 года кампанія «Марко» стала пераможцай спажывецкай намінацыі прафесіянальнага конкурсу БРЭНД ГОДА 2010 і ўладальнікам звання БРЭНД-ЛІДАР у гандлёвай групе «Абутак».

У 2010 годзе кампанія «Марко» прымала ўдзел у прафесіянальным конкурсе БРЭНД ГОДА ўжо ў пяты раз і ўладальніцай двух залатых і двух сярэбраных медалёў у прафесіянальнай намінацыі.

Гэтыя ўзнагароды па-сапраўднаму можна лічыць прызнаннем бездакорнасці дзелавой рэпутацыі і эфектыўнасці работы кампаніі.

СТАА Марко» гэта:

● першае прадпрыемства Беларусі, якое атрымала статус «добрасумленнага ўдзельніка знешнеэканамічнай дзейнасці»;

● удзельнік прэстыжных прафесійных рэспубліканскіх і замежных выстаў;

● лаўрэат конкурсаў «Лепшыя тавары на рынку РБ» і «Лепшыя тавары Рэспублікі Беларусь на рынку Расійскай Федэрацыі»;

● «Прэмія Урада ў вобласці якасці».

УНП 300237279
Матэрыялы рэкламна-інфармцыйнай старонкі падрыхтаваў Уладзімір ЗДАНОВІЧ, фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Гандлёва-забаўляльны комплекс «Бізнес-цэнтр Марко-сіці» і выява льва сталі новай прыкметай архітэктурнага аблічча Віцебска сёння.

Адкрыты сёлета ў Віцебску помнік шаўцу дзядулю Марко ўвасобіў рысы ўмелага майстра, які ў далёкія часы выраблял абутак для дзятвы і дарослых. Каля гарадской знакамітасці сфатаграфаваліся прадаўцы размешчанай побач кавярні «Мікалаеўскі хутарок» Алена КРАЎЧАНКА і Таццяна ТЫЧУК.

Мікалай МАРТЫНАЎ, генеральны дырэктар СТАА «Марко»:

«МЫ ЯШЧЭ МОЖАМ АТРЫМАЦЬ СЯДЗЯЧЫЯ МЕСЦЫ Ў ПАРТЭРЫ СУСВЕТНАЙ ЭКАНОМІКІ, А НЕ АКАЗАЦЦА НА ЯЕ ЗАДВОРКАХ»

Без сумненняў, эканамічны крызіс і валютны голад, які наша краіна пачала адчуваць з сакавіка 2011 года, парадзіў у шэрагах айчынных прадпрымальнікаў, бізнэсменаў і людзей з камерцыйнай жылкай нямала сумненняў наконт далейшага іх лёсу. Што зусім не дзіўна, бо спадарожнікамі сапраўднаму бізнэсу былі і застаюцца шматлікія фактары: змяншэнне плацежаздольнасці кліентаў, больш жорсткія ўмовы работы з банкаўскімі структурамі, змяншэнне колькасці дзелавых партнёраў, якія маглі б на высокім прафесійным узроўні весці справу, і яшчэ шмат чаго іншага.

Між тым, як паказвае жыццё, такія эканамічныя ўзрушэнні макрамаштабу для многіх людзей бізнэсу з'яўляюцца сапраўднай праверкай на трываласць і здольнасць супрацьстаяць форс-мажорным абставінам у лепшых традыцыях выжывання. Сярод такіх глыб, якія застаюцца плаваць у вірлівым акіяне праблем, можна лічыць кіраўніка сумеснага таварыства з абмежаванай адказнасцю «Марко» Мікалая МАРТЫНАВА, які ўжо два дзясяткі гадоў упэўнена вядзе абутковы бізнэс у Віцебску.

Даўно адзначана, што роля асобы ў гісторыі можа быць даволі значнай, а падчас і ключавой. Фігура Мікалая Васільевіча — выдатны таму прыклад. Ён не толькі не пасуе перад рознымі цяжкасцямі і перашкодамі, але, нягледзячы ні на што, штогод прыўносіць на абутковы рынак модныя свежыя цячэнні і новыя ўзоры прадукцыі «а-ля Заходняя Еўропа».

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

— Мікалай Васільевіч, сёлетні год для прадпрыемства «Марко» асаблівы: нядаўна з канвеера сышла 25-мільённая пара абутку, а некалькі дзён таму прадпрыемства адзначыла 20-ю гадавіну з дня ўтварэння. Добрая кампанія — як дарагое вытрыманае віно: ад пражытых гадоў становіцца толькі мацней і ярчэй. Гэта выдатная падстава азірнуцца на пройдзеныя шлях, успомніць важнейшыя этапы развіцця аднаго з буйнейшых айчынных абутковых брэндаў.

— Дзякуй за камплімент і цёплыя словы. Сапраўды, праз два дзясяткі гадоў пасля доўгіх пошукаў шчасця на ніве бізнэсу, заснавання фірмы і яе паспяховага развіцця ў далейшым зараз можна ненадоўга і спыніцца, а больш часу не дадуць канкурэнты, каб раскласці ўсе гэтыя гады па паліцах. Колькі часу патрачана і ўкладзена сіл, каб знайсці сябе ў жыцці, стаць на ногі і ў рэшце рэшт набыць на айчынным і замежных абутковых рынках належную вагу!

Адных толькі крызісаў колькі было! Не ў якасці выхвалення скажу, што мы іх паспяхова адолелі, бо былі гатовы да самых экстрэмальных умоў працы. Цяпер існуюць пэўныя складанасці на валютным рынку краіны. Але ж пакуль нам удаецца спраўляцца з рознымі форс-мажорамі і сюрпрызамі, якія спадарожнічаюць бізнэсу.

— Самы час ганарыцца такімі дасягненнямі: на дварэ крызіс, а ў нас — яго рэха...

— Зорная хвароба не для нас. Да таго ж можа здарыцца так, што сёння ты адчуваеш сябе шчаслівым, на сёмым небе ад радасці, а заўтра можа быць сумны настрой. У любым бізнэсе гэта як закон. Таму для сябе ўжо даўно ўзяў за правіла: калі хочаш працаваць з поспехам надалей — умяцца сённяшнімі вытворчымі поспехамі ці красавацца перад люстэркам з надутымі шчокамі нельга. Гэта жыццё.

— Што ставіце на першы рад у бізнэсе?

— Думаю, што не буду арыгінальным, калі адкажу, што сумленнасць, адказнасць і прыстойнасць. Кіруючы дробнай фірмай ці буйным прадпрыемствам, трэба ўмець браць на сябе вялікія абавязацельствы, адказваючы за паспяховасць і стабільнасць работы калектыву, арганізуючы камфортныя ўмовы працы і забяспечыўшы дастойную зарплату. А для таго, каб гэтыя абавязацельствы выконваць, трэба самому быць сумленным і адказным.

— На чым заснавана пастаяннае імкненне да лідарства?

— На асабістым памкненні быць першым. А па-іншаму і нельга. Не мной прыдумана, што дрэнны той салдат, які не марыць стаць генералам. Можна сказаць, што я фарміраваўся як прадпрымальнік, кіруючыся менавіта гэтай народнай мудрасцю. Думаю, што такі шлях і ў іншай дзелавой эліты нашага грамадства. Але чаго ўтойваць: дарога на вытворчы алімп не ўсеяна ружамі. Пакуль дабярэшся наверх — столькі шышак наб'еш сабе.

— На ваш погляд, бізнэс-асяроддзе сёння стала іншым, чым тады, калі вы пачыналі?

— Горш не стала — гэта дакладна. Несумненна, у кожнага дзелавога чалавека, які мае свае планы ў бізнэсе, свае погляды на праблемы ў гэтай сферы. Я маю на ўвазе заканадаўства ў мытнай сферы, падаткаабкладанні, банкаўскай дзейнасці і г.д. Праўда, а хто сказаў, што будзе лёгка?

— Зараз вы так упэўнена сцвярджаеце, як з пазіцыі бізнэсмена, так і з пазіцыі сенатара. Як-ніяк, а пачынаючы з 2004 года — вы член Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.

— Паверце, што вытворчых праблем ад таго, што я працую яшчэ і ў вышэйшым заканадаўчым органе краіны, менш не стала. Паўсюды бюракратычныя сілкі, папяровая валакіта. Безумоўна, праца ў верхняй Палаце парламента прымусіла па-іншаму паглядзець на рашэнні многіх вытворчых пытанняў і праблем не з пункту гледжання асабістага інтарэсу, а з пазіцыі карысці для грамадства і дзяржавы.

— Вы хочаце сказаць, што апошнім часам адносіны да прадпрымальніцтва з боку ўлад сталі лаяльнымі і даюць магчымасць развіцца?

— Безумоўна. Вазьміце прэзідэнцкую Дырэктыву №4 «Аб развіцці прадпрымальніцкай ініцыятывы і стымулявання дзелавой актыўнасці ў Рэспубліцы Беларусь». Пакуль праўда, шмат дэкларатыўных заяў і чыноўніцкай абыякавасці да разумнай ініцыятывы. Але ж, каб пераадолець гэта, патрэбен час. Каб запрацаваў прагрэсіўны механізм, заснаваны на законах рынку. Паўтаруся, што ў цэлым бізнэс-асяроддзе ў нашай краіне мяняецца да лепшага.

— Што гэта можа азначаць для прадпрымальных беларусаў?

— Каб не толькі прыватнік, але і дырэктар унітарнага прадпрыемства ці акцыянернага таварыства сёння стаў добрым прадпрымальнікам. Напрыклад, ён павінен ведаць, што адзін са складовых поспеху — свабоднае фарміраванне цэн. Беларусь цяпер знаходзіцца ў працэсе інтэграцыі з сусветнай эканомікай. Мы яшчэ можам атрымаць сядзячыя месцы ў партэры сусветнай эканомікі, а не аказацца на яе задворках. Беларусы — народ высокаадукаваны, працалюбівы, у яго ёсць усе прадпасылкі да поспеху.

— Наколькі для патэнцыяльнага бізнэсмена важная такая рыса, як рызыка? Вы — чалавек рызыкоўны?

— Не я гэта прыдумаў, што той, хто не рызыкуе — не п'е шампанскае. Па жыцці вельмі шмат неабходна было, ды і зараз даводзіцца рызыкаваць. Ды што там казаць: бізнэс — гэта таксама рызыка, у многім фартуна. Ды і проста ў жыцці даводзілася нешта ставіць на вагі і казаць сабе: «Калі не рызыкну — не бачыць мне ўдачы». Праўда, рызыка таксама павінна быць разумнай.

— За два дзясяткі гадоў вашай работы ў ролі кіраўніка многаму прыйшлося навучыцца, у тым ліку і пазбягаць перашкод?

— У ідэале гэта так. Успомніце, напрыклад, чарговую народную мудрасць: «Не памыляецца той, хто нічога не робіць». Гэтую прымаўку можна чытаць і наадварот: хто робіць — той памыляецца. Вядома, зараз якіх-небудзь элементарных пралікаў не дапусціш ці правільна пралічыш сітуацыю на абутковым рынку. Але ж у вытворчым жыцці ёсць яшчэ пастаянныя паказчыкі па нарошчванні аб'ёмаў вытворчасці, шматлікія справаздачы, ледзь не штодзённыя каштоўныя ўказанні айчынных чыноўнікаў накшталт таго як табе працаваць, што вырабляць і г.д. Паверце, што гэта вельмі прыкра на сабе адчуваць, і ты падчас не ведаеш, як змагацца з бюракратыяй і чыноўніцтвам.

— Вы згодны з тым меркаваннем, што любы крызіс, у тым ліку і валютны дэфіцыт, — якраз той час, калі можна на ўнутраным рынку прасунуць менавіта айчынную прадукцыю?

— У чымсьці можна з вамі пагадзіцца. Крызіс — гэта паняцце адноснае. Гэта своеасаблівая праверка на моц. Хоць, вядома, нейкі адмоўны пасыл ён нясе. Прагнозы аналітыкаў збываюцца: у няпростыя часы пакупнік аддае перавагу айчынным таварам. І тлумачыцца гэта проста: прадукцыя беларускіх вытворцаў бліжэй і танней. Да таго ж беларускія часта пераўзыходзяць імпартныя аналагі па якасці, намнога спрашчаюцца пытанні, звязаныя з гарантыйным абслугоўваннем. Ды і цана зараз адыгрывае далёка не апошнюю ролю. Пакупнікі сочаць за сваімі расходамі і стараюцца не эксперыментаваць, выбіраючы гандлёвыя маркі, праверэныя часам. Праўда, пагадзіцеся, што ніякія абставіны не прымусяць народ купляць няякасныя ці нязручныя ў карыстанні тавар з надпісам «Зроблена ў Беларусі», няхай нават вельмі танны. Таму, аб чым гаворыцца на кожным кроку, якасць — перш за ўсё. У дачыненні да абутку — гэта яшчэ і адпаведнасць модзе, камфорт. Несумненна, не апошняя роля ў паспяховых продажах адводзіцца і цане. Але ў нашым выпадку гэта не дамінанта.

— Традыцыйна жнівень вы сустракаеце з сардэчным хваляваннем. Кожнае першае чысло гэтага месяца падказвае, што вы сталі на адзін год багацейшым. З улікам гэтага скажыце, наколькі цяжкая гэтая ноша — гады і што адчуваеце пасля кожнага дня народзінаў?

— Думаю, што ў кожнага чалавека на гэты конт свае ўражанні. Мне ж падаецца, што я стаў больш адказны за бізнэс, работу калектыву і ўмовы яго працы. А яшчэ адчуваеш, што становішся больш мудрым: імкнешся берагчы нервы, больш спакойна вырашаць шматлікія вытворчыя пытанні. Хоць падчас падумаеш, што ты яшчэ шмат чаго не ведаеш і мог зрабіць у гэтым жыцці намнога больш. Ведаеце, што ў 19 гадоў, што ў 50 з «хвосцікам» — амаль ніякай розніцы для сябе, акрамя ўзросту па пашпарце, не адчуваю. Унутры я застаюся тым жа чалавекам, калі пачынаў сваю справу прадпрымальніка. Толькі са значна большым жыццёвым вопытам. Галоўнае, на мой погляд, не гады, а ўнутраны стан чалавека. Хоць, чаго скрываць, кожнаму чалавеку хочацца заўсёды быць маладзейшым. Тым не менш, паўтаруся: мая жыццёвая філасофія — быць маладым душой. А цела падтрымліваць у належнай форме праз актыўны лад жыцця — заняткі спортам, прагулкі на свежым паветры.

Гутарыў Уладзімір ЗДАНОВІЧ.

Усходні гараскоп на наступны тыдзень

У РЫБ МОЖА З'ЯВІЦЦА НОВАЕ ЗАХАПЛЕННЕ, А Ў ЛЬВОЎ НАСПЯВАЮЦЬ ПЕРАМЕНЫ

ВАЕН. Давядзецца папрацаваць у поўную сілу і ў «палявых умовах». Вынікі могуць быць уражлівымі. І не звяртайце ўвагі на тых, хто займае чакальную пазіцыю або карыстаецца плёнам вашых намаганняў. Цяпер вы працуеце на перспектыву, і галоўнае — умацаванне ўласных пазіцый і рост прафесіяналізму. Займіцеся пытаннямі здароўя. Добры момант для таго, каб зрабіць тое, што адкладалася, пераадолець няноту і інертнасць. Можна пачынаць цыкл трэніровак або працэдур, якія дапамогуць цудоўна выглядаць і добра сябе адчуваць.

ЦЯЛЕЦ. Вашы матэрыяльныя пазіцыі ўмацоўваюцца, але весці справы пажадана энергічна, улічваючы адразу некалькі кірункаў прыкладання сіл. Трэба выконваць абяцанні і плаціць па рахунках (і ў прамым, і ў пераносным сэнсе), ясна і выразна вызначаючыся з намерамі. Пашырайце кантакты з сябрамі і магчымымі фундатарамі; прафесійныя інтарэсы шмат у чым вызначаюцца сферай зносін і інфармацыяй, якую вы можаце атрымаць. Вы лёгка зарыентуецеся ў любым становішчы і хутка знойдзеце патрэбнае рашэнне.

БЛІЗНЯТЫ. Упартасць і прынцыповасць можа прывесці да нечаканых вынікаў, павароту сітуацыі на 180 градусаў, праліку ў добра выбудаванай камбінацыі. Сачыце за нюансамі, якія могуць падказаць, якія падзеі і настрої наспяваюць. Цяпер вы адчувальныя да энергетычных пасылаў іншых людзей, але здольныя патраціць на «старыя граблі», калі не справіцеся з жаданнем атрымаць тое, што не ўдалося раней. Спрыяльны час, каб пазбавіцца ад шкодных звычак. Арганізм сам падкажа, як гэта зрабіць.

РАК. Ёсць магчымасць пачаць новую справу, якая будзе паспяховай і прыбытковай. Уважліва падумайце, якія магчымасці ў вас ёсць і каго можна прыцягнуць у якасці партнёраў. У дзелавых адносінах цяпер на першым месцы ўзаемавыгада. Вас не павінна бянтэжыць меркантыльнасць і ашчаднасць навакольных. Сумесныя справы маюць шанц на хуткае развіццё. Каб вытрымаць напружаны рытм дзейнасці, паспрабуйце арганізаваць свой адпачынак, насыціўшы яго станоўчымі эмоцыямі і забавамі.

ЛЕЎ. У вашым асяроддзі наспяваюць перамены. Тыдзень будзе напоўнены навінамі, якія маюць значэнне большае, чым падасца на першы погляд. Каханне, сэкс, грошы могуць выклікаць пэўныя перажыванні, якія прымушаюць нешта прадпрымаць, змяняць (прынамсі, сваю пазіцыю). Можаце вельмі засмуціцца, калі згубіце ўладу ў нейкай з гэтых сфер. Магчыма, вам патрэбныя гэтыя выпрабаванні, каб пазбавіцца ад прэсінгу.

ДЗЕВА. Актыўнасць павышаецца, але можа выклікаць дыскамфорт пастаяннае напружанне. Карысная фізічная актыўнасць, заняткі спортам. З'явіцца запатрабаванне ў пашырэнні сувязяў і ўласнага ўплыву на акружэнне. Цяпер вам гэта не складана; ваша меркаванне можа фарміраваць праграму дзейнняў калектыву або блізкіх людзей. Але павялічваецца і адказнасць. Рыхтуйцеся да складанай інтэлектуальнай працы, дзе неабходныя свежыя ідэі і натхненне.

ШАЛІ. Спрыяльны час для дасягнення пэўнага фармальнага выніку. Лепш не разлічваць на спад напружання ні ў прафесійнай дзейнасці, ні ў блізкіх адносінах. Але з'явіцца больш магчымасцяў зрабіць нешта істотнае, выйсці за межы сваіх магчымасцяў, дасягнуць мэты. Можна вырашаць юрыдычныя пытанні, весці перамовы. Можна набываць матэрыялы для асабістых захапленняў.

СКАРПІЁН. Расходы павялічваюцца, і вы адчуеце запатрабаванне ў большым заробку, але адначасова можаце думаць аб эканоміі. Каб заставацца ў звыклай каляіне, вам патрабуецца кантроль над усімі акалічнасцямі, хоць цяпер гэта можа суправаджацца ціскам на навакольных. Павышаецца працоўная нагрузка. Давядзецца ўзяць на сябе новыя абавязацельствы, прыступіць да перабудовы той структуры, якая перастала быць эфектыўнай. Не перастарайцеся і не цісніце на навакольных: не ўсе знаходзяцца ў такім жа баявым настроі.

СТРАЛЕЦ. Тыдзень энергічны і насычаны дзейнасцю. Магчыма, давядзецца працаваць адразу ў некалькіх кірунках. Інтэлектуальны бок і здольнасць да дэталёвага аналізу цяпер з'яўляецца вашым наймацнейшым аргументам у любых спрэчках. Пачуцці і эмоцыі адыходзяць на другі план там, дзе задзейнічаны матэрыяльныя інтарэсы. Актыўнасць па-за сценамі ўласнага дома не вызваляе ад неабходнасці надаваць увагу хатнім пытанням. Нешта перабудаваць давядзецца абавязкова — альбо ў адносінах з роднымі, альбо непасрэдна ў доме.

КАЗЯРОГ. Важна весці актыўны лад жыцця, рыхтаваць новыя справы, «праціскаць» ідэі і праекты, якія вас цікавяць. Павярхоўнае стаўленне да працы недапушчальнае — патрабуецца пільная увага да дэталяў. Плануйце пасядзець над чымсьці складаным, ад чаго і вы, і навакольныя чакаеце прыкметнага эфекту. Канец тыдня падыходзіць для прагулак па крамах, рамонтных работ. Трымайце пад кантролем здароўе; знайдзіце час адпачыць і заняцца чымсьці прыемным.

ВАДАЛЕЙ. Арыентуйцеся на паўсядзённую працу, якая патрабуе ўвагі і засяроджанасці. Імкніцеся да якаснага выканання асобных этапаў працы, звяртайце ўвагу на дэталі, сістэматызуйце інфармацыю. Самы час разабрацца з бязладзіцай, якую вы адчуваеце ў справах і адносінах. Можна весці перамовы з начальствам, займацца пытаннямі працаўладкавання. Канец тыдня — добры час для дыет, разгрузкі, касметычных ачышчальных працэдур.

РЫБЫ. Практычныя пытанні цяпер павінны займаць першае месца. Магчыма, надышоў час перагледзець некаторыя планы і праекты. Партнёр можа падштурхнуць вас да гэтага тым або іншым спосабам. Падумайце аб выкарыстанні новых магчымасцяў для развіцця праектаў, якія ўжо працуюць. Нечакана ў вашым жыцці можа з'явіцца новае захапленне. У асабістым жыцці набываюць значэнне рытуалы заляцання. Надавайце ўвагу нюансам, якія могуць упрыгожыць ваша ўзаемадзеянне з каханым чалавекам. «Дробязь — але прыемна» — гэта зараз актуальна.

ЯБЛЫНЯ

Па паданнях нашых продкаў, гэтае дрэва з'явілася на зямлі ў час стварэння свету і злучае ў сабе тры пачаткі: неба, зямлю і падземны свет. Біблейскім дрэвам спазнання дабра і зла служыла менавіта яблыня. Менавіта смак яблыка спазналі Адам і Ева, за што былі выгнаны з раю і сталі жыць на зямлі.

● Ва ўсходнеславянскіх народаў яблыня стала знакам вечнага жыцця і бессмяротнасці. У паданнях і казках менавіта маладзільныя або райскія яблычкі прыносілі здароўе і ўдаласць старому, надзялялі волатаўскай сілай баязліўца, рабілі прыгажуняй непрыгожую. Але дастаць гэтыя самыя маладзільныя яблыкі было няпроста: неабходна было вытрымаць нямала выпрабаванняў.

● У сямейна-абрадавых традыцыях усходніх славян яблыня выступае як знак урадлівасці і сямейнага дабрабыту. Даволі часта яе выкарыстоўваюць у абрадавай магіі:

● Ваду пасля першага рытуальнага купання хлопчыка неабходна было выліць пад яблыню, каб хлопец працягваў свой род па мужчынскай лініі.

● Калі ў сям'і памераў прадстаўнік мужчынскага роду, патрабавалася высекчы самую прыгожую і пладаносную яблыню — «зрабіць ахвяру». Тым самым старыя людзі раілі перасцерагчы сад ад заўчаснага высыхання і вымірання.

● У той жа час, калі без відавочных прычын у садзе высыхала яблыня, гаварылі, што ў сям'і памрэ хтосьці па мужчынскай лініі, і першым чынам хваляваліся за гаспадара сямейства.

● Паўсюдна існавала прымета: калі са стала скаціўся яблык — чакай прыходу каханага.

● Знахары раілі выкарыстоўваць яблыкі ў якасці прысушкі. Для гэтага трэба пакласці ў разрэз яблыка паперку з імем каханага (каханай), а затым выставіць такі яблык на сонцапёк. Па меры таго, як яблык будзе высыхаць, у сэрцы каханага будзе зараджацца каханне.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Ну і ну!

І ГРОШЫ ПРЫСВОЙВАЎ, І ЗДЗЕКАВАЎСЯ

Пасля таго, як супрацоўнікі ўпраўлення па раскрыцці цяжкіх эканамічных злачынстваў УУС Магілёўскага аблвыканкама затрымалі майстра Магілёўскага гарадскога прадпрыемства рытуальных паслуг, выручка на прадпрыемстве вырасла на 40 працэнтаў, а па дапамогу да следства звярнуліся ў межах расследавання крымінальнай справы звыш 200 пацярпелых.

Майстар магілёўскага КУП «Прадпрыемства рытуальных паслуг» на працягу 2009-2011 гадоў злоўжываў службовымі паўнамоцтвамі і даваў указанні сваім падначаленым збіраць з грамадзян грошы за аказаныя паслугі «міма касы», пасля чаго грашовыя сродкі прысвойваў сабе. Такім чынам майстар пазбавіў прадпрыемства больш як 12 млн рублёў. Падазроны таксама здзекаваўся са сваіх падначаленых. Так, аднойчы ён даў указанне двум работнікам па чарзе легчы ў труну, пасля чаго іншыя работнікі павінны былі забіць труну і апусціць у яму на тэрыторыі прадпрыемства. Таксама ўстаноўлена, што за адмову перадаць грошы і не выхад на работу ў законны выхадны мужчына збіваў супрацоўнікаў. У дачыненні да былога майстра заведзена 12 крымінальных спраў.

Святлана БАРЫСЕНКА.

19 августа 2011 г. в 16.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Сантехэлектромонтаж»

Повестка дня:

1. О приобретении акций ОАО «Сантехэлектромонтаж» на баланс Общества.

2. Об оказании безвозмездной (спонсорской) помощи.

Собрание будет проходить по адресу: г. Гомель, ул. Троллейбусная, 8-А. Начало регистрации участников собрания: 15.30.

УНП 400052115

ЛЁГКАЕ СЕНА

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Жыхар Веткаўскага раёна Уладзімір МЕНДЗЕЛЕЎ на нарыхтоўцы сена.

Дзве даты

30 ліпеня

1975 год — у Хельсінкі пачалася Нарада 33 еўрапейскіх краін, а таксама ЗША і Канады па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе. Ідэя склікання нарады належыць СССР і іншым сацыялістычным краінам. Прапанова аб скліканні нарады ўпершыню была выкладзена ў «Дэкларацыі аб умацаванні міру і бяспекі ў Еўропе», прынятай у 1966 годзе ў Бухарэсце Палітычным кансультатыўным камітэтам Варшаўскага дагавора. Па меры пазітыўных зрухаў, якія адбываліся на міжнароднай арэне, прапанова аб скліканні нарады была падтрымана Францыяй, а затым іншымі заходнімі дзяржавамі. Значны ўклад у падрыхтоўку і правядзенне нарады ўнёс урад Фінляндыі.

Нарада паклала пачатак новаму этапу разрадкі напружанасці, пацвердзіла непарушнасць межаў, якія склаліся ў Еўропе, стварыла спрыяльныя ўмовы для захавання і ўмацавання міру на ўсім кантыненце, стала важным крокам на шляху зацвярджэння на міжнароднай арэне мірнага суіснавання і наладжвання адносін раўнапраўнага супрацоўніцтва паміж дзяржавамі з розным грамадскім ладам.

1815 год — нарадзіўся Іосіф Антонавіч Гашкевіч. Ураджэнец Мінскай губерні, дыпламат, вучоны-моваznаўца, даследнік Далёкага Усходу, натураліст. Першы іншаземец, якому было дазволена выехаць за межы японскай сталіцы і здзейсніць падарожжа па краіне. Выдаў першы ў Расіі «Японска-рускі слоўнік» (1857), адзначаны медалём Пецярбургскай АН і Дзямідаўскай прэміяй — адной з самых ганаровых навуковых узнагарод Расіі

Цытата дня

«Маўчанне — асаблівае мастацтва гутаркі».

Уільям Хэзліт (1778—1830), англійскі крытык і філосаф.

Апавяданне

Віктар СУПРУНЧУК

ХАЛОДНАЕ ПОЛЕ

ПЕРАД вачыма белы-белы снег. Ён ляжыць на вуснах, на вачах, на твары. Ён — усюды. Халодны і бясконцы. Здаецца, снег нават на сэрцы, на душы. Калі яна ёсць. Белая прастора, цішыня, у якой няма берагоў і нават далягляду. На вейках снег, і яны вельмі цяжкія, немагчыма ўзняць, каб штосьці ўбачыць, адчуць свет, дзе ён зараз. А ці ёсць у яго рукі і ногі? Ці ёсць ён сам? Белы свет адкуль плыве ў яго вочы? Значыць, ён пакуль жывы... Неба, зямля?.. Дзе ён?

Зусім механічна, таму што так было заўжды, выпрасталіся рукі, пальцы і пачалі грэбсці па цвёрдай і белай скарынцы, яшчэ не разумеючы дзеля чаго. Інстынкт жыў у ім, ён спрабаваў парушыць цішыню і спакой, якія з кожнай хвілінай усё мацней авалодвалі ім. Было холадна альбо цёпла — незразумела. Нейкая бясконцая далячынь, у якой не адчувалася жыцця. Быў проста так званы космас. Пра які ён неаднойчы думаў і не змог спасцігнуць, зразумець, паспрабаваць на зуб. Гэтыя думкі раптам выплылі аднекуль здаля, калыхнулі яго, прымусілі расплюшчыць вочы і зірнуць перад сабой.

Былі холад і зіма, якая даўно ўладарыла на зямлі, а ён зусім пра гэта забыў. Колькі часу мінула з той хвіліны, што ляжыць на гэтым полі на белым снезе пад чорным небам. І няма свету з ніякага боку, толькі зрэдку нешта пярэстае мігціць і знікае ўдалечыні.

Правая рука рухалася — гэта Уладзік адчуў, калі вырашыў пачасаць патыліцу, так захацелася, што ўсё цела, бы ў яшчаркі, выгнулася і затрэслася на цвёрдай зямлі. Потым пальцамі правёў па твары, халодным і цвёрдым, як снег. Тады зразумеў, што пакуль яшчэ жывы.

Божа, дзе ён, што з ім? Чаму на гэтым халодным і бязмежным полі? А можа, ён даўно не чалавек?

Холад дайшоў да самага сэрца. І тады ўскалыхнулася памяць, замітусілася: старонка за старонкай пабеглі нейкія твары, дамы, машыны, вуліцы, сабакі. І ўсё гэта было перамешана, наязджала адно на адно, чорныя твары паўзлі на чырвоныя, зялёныя і белыя. Пераважна чорных і белых.

Рука стамілася, і твар зноў апусціўся ў снег, пакрыты зверху скарынкай. Дзіўна, але раптам ён адчуў боль, нібы хтосьці нажом правёў па скуры.

— Зіма... — сказаў сам сабе, памаўчаў і ледзь-ледзь выціснуў: — Холадна, кепска... Чаму так? Чаму?..

Вочы зачапіліся за белае поле, і ніводнага краю не было відаць на ім: толькі бязмежнасць, снег і далёка-далёка чорная паска. Трохі вышэй дамы, нібы ракеты, чапляюцца галовамі, мусіць, за неба. А вось дрэвы, зноў дрэвы. Таксама чорныя, да іх не дакрануцца рукой. Яны — не жывыя, як ён, не дыхаюць, стаяць. А ён ляжыць... Чаму ён ляжыць тут? І святло гарыць недзе, свеціць некаму і яму таксама. А моцы няма зусім... Няма...

Ён помніць, помніць. Вуліцу, дом, дзверы з дзіркаю замест замка. Пакой, у ім прадраная зялёна-жоўтая канапка і трохногі стол. Замест чацвёртай нагі кніжкі. Стос кніжак, які праз хвіліну абрушыцца на даўно не фарбаваную і ўжо паўгнілую падлогу. У кутку шчыльныя шэрагі пустых бутэлек з-пад віна, якое ён выжлукціў. Не, не выпіў, а выжлукціў, калі мучыла смага і не было ад яе паратунку, усё гарэла ў вантробах і хацелася заскуголіць сабакам, урэшце залезці пад гэтую недалэнгу-канапу.

І кожную раніцу разуменне, што ў кішэнях пуста, ніводнага рубля за душою. Брудная сталь над галавою і гнілая падлога пад нагамі. Толькі ў кранах пакуль яшчэ тугое халодная вада, бо цёплую даўно адключылі за доўг, пра які лепш не ўспамінаць.

І раптам узнікае голад, выварочвае страўнік, сціскае яго, потым выпросткае, цягне некуды, цягне. Немагчыма адчапіцца, схавацца, усё плыве перад вачыма. З апошніх сіл ён ускоквае на ногі і бяжыць да крана. Струмень вады залівае твар, плечы, а ён п'е і п'е, ніяк не спаталіць смагі, не можа спыніць таго звера, што рве яго страўнік.

Нарэшце боль паціху знікае і надыходзяць шчасце, радасць, свята, якія вяртаюць да жыцця, узнімаюць настрой. У кватэры святло, зззяюць шыбіны ў вокнах, некуды знікаюць прусакі, а на стале, як ні дзіўна, — скібка чорнага хлеба з рэштаю селядца. Лепшага падарунка на сненданне немагчыма прыдумаць. З халоднай вадою гэта такі прысмак, што пазайздросцяць аматары рэстаранаў. Лепш за чорную ці чырвоную ікру, якую ён ніколі не любіў. Альбо нават за вэнджаную кілбасу найвышэйшага гатунку.

— Як ты можаш так жыць? — Уладзік чуе гэты голас даўно, і зараз услед за ім выплывае з цемры твар, мужчынскі, са светлымі доўгімі вусамі, кароткай прычоскай. Смяецца, смяецца, а пасля зноў знікае, пакідаючы маленькую выцягнутую кроплю.

— Як ты можаш так жыць? — ужо іншы голас і зусім іншы твар, але тыя ж словы. І смех, смех, ад якога ўваччу гусцее цемра і холад забыць. Але мільгалі і чыстыя старонкі, вясёлыя і радасныя. Толькі іх было вельмі мала...

І зноў ён у кватэры з паўгнілой падлогай. Чуе тыя ж галасы і бачыць тыя ж мужчынскія твары. Ён даўно знаёмы з гэтымі людзьмі, яны добрыя і спагадлівыя да яго. Часам яны прыходзяць у кватэру з бутэлькай віна, з хлебам і каўбаскам сала, частуюцца разам. Весялей у кампаніі, і стол не пусты. Гавораць, гавораць... Госці, кожнаму адчынены дзверы, у якіх няма замка.

Так, аднаго з вусамі звалі Янка, Іван, а другога — Эдзік. У яго парык, таму што галава зусім лысая і блішчыць, бы наваксаваная. Ён прадпрымальнік, нечым гандлюе і ўвесь час хваліцца, што багаты. Голас у яго тонкі, бы ў Маруські, дванаццацігадовай суседкі. І непрыемны. Цяпер зразумела, што непрыемны, паганы. І ў Янкі паганы. А раней здаваўся шчырым і ласкавым...

— Як ты можаш так жыць? — гаворыць Янка, аглядаючы яго кватэру. — Гэта ж проста жах!

Эдзік ажно падскоквае на канапе, і Уладзік баіцца, што яна ад гэтых скокаў разваліцца. Голас у Эдзіка тонкі, але чалавек ён шыракаплечы, у целе. Што прыносіць у госці, амаль усё з'ядае.

— Як ты можаш так жыць?..

Канешне, жыве Уладзік горш за мыш у пустым пограбе, адкуль нельга выкараскацца. Але ён ведае, што пасля скажуць Янка і Эдзік. Яны шкадуюць яго, хочуць дапамагчы, а ён, бы ўпарты казёл, не прымае іхняй дапамогі. Яму жадаюць толькі дабра. У іх дзеці, жонкі, некалі будуць унукі. Гэта ж усё-ткі клопат, клопат... Уладзік жа адзін, думай толькі пра сябе. Вось так і думае: не працуе і жыве адным днём. Што госці прынясуць праз дзверы без замка.

...Рука пралезла ў кішэню штаноў і адразу знайшла тое, што шукала: паперка была на месцы. Уладзік баяўся згубіць яе. Яна была ахоўная граматай, пашпартам, якога даўно ў яго не было. Прапаў, калі Уладзік у чарговы раз, наглытаўшыся таннага віна, амаль без свядомасці блукаў, ці ляжаў невядома дзе.

Ён разумеў, што рана ці позна ягоная дарога прыйдзе на нейкае апошняе месца. Другога варыянта сабе не ўяўляў, дый не хацеў, бы загіпнатызаваны, нават не ішоў, а каціўся, гнаны спадарожным ветрам. І аднойчы, калі ачмурэнне трохі пакінула галаву, напісаў гэтую паперку. Ён доўга думаў над тэкстам, падрыхтаваў некалькі варыянтаў. Не хацелася пакрыўдзіць ніводнага слова, якое б адпавядала сутнасці малітвы, не ўспомніў. Дый ніколі не ведаў.

Ён ляжаў на заснежаным полі, і гэта быў канец. Ягоны фініш, да якога ішоў, бы жаба ў пашчу змяі. Нікчэмны, бязвольны чалавек. Усім быў добры: і Янку, і Эдзіку, і многім іншым. Дзверы былі без замка, і хто хацеў, мог да яго зайсці, перадыхнуць, пераначаваць, выпіць чарку і нават паляжаць з дзеўкай. Нікому ён не адмовіў. І вось апошні ягоны прытулак: халодная, цвёрдая і белая зямля. А побач ніводнай душы. І толькі вецер, вецер, які хутка выдзьме з яго апошнія кроплі жыцця...

Гэтая думка, што ціха, цягнучы свае паралітычныя ногі, прабегла ў паўзастылым мазгу, зрабіла штуршок па ўсім целе. Ён варухнуўся раз-другі і папоўз. Спярша не асэнсоўваючы гэтага, марудна, бы рыба, выкінутая на бераг, якая раптам адчула пах вады, а гэта значыць, свайго паратунку.

Уладзік зрушыўся з месца, пасунуўся яшчэ і яшчэ, і тады яму захацелася піць. Ён ухапіў зубамі снег, паспрабаваў адразу яго праглынуць і не змог. Жорсткая і халодная каша была горкая і кіслая. Спярша горкая, потым кіслая.

І ўсё-ткі стала лягчэй. Наблізіліся дамы, якія ўжо не датыкаліся неба. Дрэвы былі зусім побач. Уладзік успомніў, што сядзеў з нейкімі хлопцамі, частаваў іх, бо грошы былі ў яго: ад кватэры яшчэ тое-сёе засталося. Потым туман, холад, поле і — зіма, якой, здаецца, учора не было.

Ён папоўз. Поўз і плакаў. Ад жалю да сябе, да сваіх ног, рук, галавы. Яму было сябе вельмі шкада. Аднак у галаве нават не мільгала думка пра тое, што, магчыма, пашкадаваць трэба і некага іншага. Але каго? Увесь свет быў тут, на двух метрах замерзлай і белай ад снегу зямлі, панылай і сумнай для яго.

Ён — адзін, горш чым воўк, і прыхіліцца няма да каго. Сястра, што сястра?.. У яе сваё жыццё. Яны даўно не бачыліся, не размаўлялі. Ён чужы для яе, кузюрка, ад якой застанецца ёй тры тысячы даляраў. Яго апошняе «прабач»... Няхай купіць сабе ці дзецям тое, што пажадае. Муж яе пакінуў, нікчэмны быў чалавек. Нікчэмны...

І ўсё-ткі ён не ляжаў, а рухаўся, бы знакаміты Марэсьеў, якім захапляўся ў дзяцінстве, і нават хацеў стаць лётчыкам. Яшчэ трошкі

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	5.19	21.12	15.53
Віцебск —	5.03	21.07	16.04
Магілёў —	5.09	21.02	15.53
Гомель —	5.13	20.52	15.39
Гродна —	5.36	21.26	15.50
Брэст —	5.43	21.20	15.37

Месяц

Маладзік у 21.41.
Месяц у сузор'і Льва.

Імяніны

Пр. *Маргарыты, Марыны, Лазара, Леаніда.*

К. *Людмілы, Юліты, Леапольда, Пятра, Расціслава.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

РЫБЫ ВАДАЁМАЎ БЕЛАРУСІ

18 жніўня 2011 года Міністэрства сувязі і інфарматызацыі выпускае ў паштовае абарачэнне дзве маркі серыі «Рыбы вадаёмаў Беларусі». Мастак Аляксандр Міцянін.

СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.



АДКАЗЫ НА СКАНВОРД

Па гарызанталі: Дальнабойшчык. Ружжо. Ран. Дзёк. Укус. Гг. Сіцар. Яшма. Сын. Кагіф. Гарга. Ост. Жар. Арак. Бант. Ікт. Цыпата. Сназа. Кворум. Штаб. Найміт. Во-ка. Душа. Танаш. Шаша. Прагал. Мана. Ерэп. Гаргамэлот.

Па вертыкалі: Таксіст. Сейст. Адэмт. Кнап. Гар. Бэрнд. Шпана. Ёрш. Ляг. Док. Нерв. Нарды. Штамп. Рэпс. Рэйка. Кырпа. Цана. Табу. Сэжа. Шкіпер. Кнап. Акт. Вэкс. Абнова. Гарэра. Рог. Ан-тука. Плот. Фэкт. Мальвінт.

ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

АБАРАНІ СВОЙ ДОМ

Расліны-ахоўнікі

Кожная расліна валодае энергетыкай, якая здольная ўзаемадзейнічаць з энергіяй чалавека. Многія з іх можна выкарыстаць як ахоўнікі або талісманы.

Раней быў звычай саджаць побач з хатай рабінку, якая, як лічылі прадзеды, абараняла ад нападу нячыстай сілы. Пакладзіце галінку рабіны ў доме або офісе — і вось вы ўжо абаронены ад негатыўных уплываў; апусціце ў кішэнь — і «патрэбныя» людзі самі сустрэнуцца і прапануюць вам сваю дапамогу. Рабіна валодае выдатнымі дэзынфіцыруючымі, антымікробнымі ўласцівасцямі. У доме карысна вешаць некалькі гронак ягад, асабліва над дзіцячым ложачкам і ўваходнымі дзвярамі.

Побач з домам можна саджаць ярка-жоўтыя сланечнікі або аксаміткі, яны таксама валодаюць ахоўнымі ўласцівасцямі. На акне пастаўце герань або хрызантэмы.

У доме па кутах карысна развешваць сухія букецікі кветак святаянніку, верасу, піжмы, палыну і крапівы. Чысціць прастору ад негатыўнай энергетыкі ядловец, елка, кедр.

Можна паліць у доме галінкі ядлоўцу, якія зробяць чыстым не толькі энергетычную прастору, але і пазбавяць ваш дом ад мікробаў. Высушаную траву крапівы, святаянніку і верасу вы можна развешаць у кватэры. Гэтыя траўкі карысна насіць з сабой, паклаўшы расліны ў палатняны мяшочак, — яны абароняць ад уздзеяння чужой энергетыкі.

САЛОН ПРЫГАЖОСЦІ

Каб локці не былі шурпатымі

Мамы часта пужаюць сваіх дзяцей: будзеш ставіць локці на стол — будуць шурпатымі. Але ж шурпатыя локці — гэта зусім не расплата за няправільную застольнай позу.

Прычын шурпатасці локцяў з дзясятак — ад банальнага авітамінозу да эндакрынных парушэнняў, якія не паддаюцца ніякаму самалячэнню.

Грубая, патрэсканая, скура на локцях, якая яшчэ і лушчыцца, можа сведчыць аб непераносе спякоты або холаду, сінтэтычных тканін або касметычных сродкаў, аб парушэнні водна-салевага абмену і праблемах з імунітэтам…Так што расказаць доктару пра локці ніколі не пашкодзіць. У складаных выпадках ён прызначыць комплекснае шматступеннае лячэнне. А у простых — параіць звярнуцца да народных сродкаў.

Дапамагчы змогуць наступныя парады.

- Не мыйце локці мылам — масажуйце іх валасяной шчотачкай з пенай, у якую дададзена гліцэрына.
- Перад сном зрабіце кампрэс на ноч: цёплы аліўкавы або іншы раслінны алей нанясіце на ватны тампон, прыкладзіце да локця, не туга забінтуйце, кампрэсы чаргуйце з маскамі з варанай або сырой бульбы, змяшанай з мёдам.
- Двойчы ў тыдзень апрацоўвайце локці скрабам для цела: падыдуць смятана і марская соль, сумесь мёду і кававай гушчы. Пасля выкарыстання скрабу абавязкова наносьце крэм, які ўвільгатняе.
- Калі локці свярбяць, праціраўце іх ваткай, якая змочана ў рыбіным тлушчы.
- Пачырванелыя локці пратрыце долькай лімона, ваткай, якая змочана ў рысавым адвары або соку квашанай капусты.
- Уключыце ў рацыён белакачанную капусту, раслінны алей, шпінат, тлустую рыбу.

-2772-

ВАРТА ВЕДАЦЬ

Асаблівасці керамічнага посуду

Гліняны посуд валодае здольнасцю выцягваць з людзей негатыўную энергію і напаўняць той, якую ён атрымаў за доўгія стагоддзі, а то і тысячагоддзі, ад сонца, паветра, вады, зямлі — чатырох першаэлементаў і стыхій.

Керамічныя вырабы трэба ўжываць толькі па прызначэнні. Посудам для прыгатавання ежы можна карыстацца ў электрычных і газавых духоўках. Але пры гэтым рэкамендуецца ставіць керамічны посуд у мінімальна нагрэтую духоўку і паступова награваць да неабходнай тэмпературы.

Керамічныя вырабы не рэкамендуецца падвяргаць рэзкаму перападу тэмператур: посуд, у якім ляжаць замарожаныя або астуджаныя прадукты, не варта адразу з халадзільніка змяшчаць у гарачую духоўку.

Керамічны посуд трэба мыць у цёплай вадзе, выкарыстоўваючы сродкі для мыцця посуду. Ежа, прыгатаваная ў тэракотавым посудзе, вельмі карысная для здароўя, бо посуд зроблены з экалагічна чыстай чырвонай гліны, без усякіх дадаткаў (а як вядома, чырвоная гліна выводзіць шлакі з арганізма і лечыць шматлікія хваробы). Прыгатаваная ў такім посудзе страва набывае адмысловы смак і водар.

У простага керамічнага посуду маса карысных уласцівасцяў, якіх пазбаўлены вырабы з фарфору, фаянсу або крышталя. Структура керамікі такая, што яна спачатку ўбірае ў сябе вільгаць, а потым аддае яе. Керамічны посуд умее сам рэгуляваць тэмпературу і вільготнасць. Прычым робіць гэта не горш за тэрмас. Так, кампот, пакінуты ў керамічным збанку, застанецца прахалодным нават на сонцы, а гарбата або кава ў керамічным імбрычку будуць цёплымі на працягу некалькіх гадзін.

Ды і наогул, керамічны посуд ідэальна падыходзіць для захоўвання прадуктаў. Менавіта таму кераміка адвеку была папулярная ў вёсках. Малако ў гладышы магло стаяць і не кіснуць трое-чацвёра сутак, а варэнні і саленні захоўваліся ў керамічных гаршчках без вечкаў амаль год і не плеснелі. Калі засыпаць муку або крупы ў керамічны гаршчок, то жучкі ў іх не завядуцца. Акрамя таго, керамічны гаршчок выдатна можа замяніць каструлю. Фарфор і фаянс у духоўцы лопнуць, а вось кераміка толькі мацней стане.

ДРУГОЕ ЖЫЦЦЁ

Асвяжальнік паветра на кухні

Часам заходзіш у кухню і адчуваеш непрыемны пах, які ідзе са зліўной адтуліны ракавіны. Можна пазбавіцца ад гэтай праблемы, раз у тыдзень чысцячы зліўную трубу з дапамогай кававай гушчы.

Гэта робіцца так: у зліўную адтуліну высыпаецца прыкладна паўшклянкі кававай гушчы і тут жа заліваецца кіпенем аб'ёмам не меней за літр. Пасля гэтага прынамсі на тыдзень пра непрыемны пах можна забыць. Калі ж прычына паху невядомая, то асвяжыць паветра на кухні можна, прагрэўшы на патэльні невялікую колькасць молатай кавы або кававай гушчы.

Знішчальнік пылу

Калі ў вашым доме ёсць камін, то вы ведаеце, як нялёгка вычысціць з яго попел так, каб ён не разлятаўся воблакам навокал.

Праблему можна з лёгкасцю вырашыць: выкарыстаную кававую гушчу злёгку ўвільгатніце і асцярожна раскідайце па паверхні згарэлых рэшткаў у вашым каміне. Кававая гушча апусціць пыл, увабраўшы ў сябе некаторую яго частку. І камін можна вычысціць «без шуму і пылу».

-2773-

Паважаныя калегі, работнікі Гомельскага завода гандлёвага машынабудавання!

Вось ужо 36 гадоў наш калектыў адзначае сваё прафесійнае свята, пастаянна ўдасканальваючы вытворчасць, насычаючы рынак шырокім асартыментам прадукцыі і, вядома ж, паляпшаючы яе якасць.

І як не ганарыцца, што сёння мы вырабляем каля ста найменняў тавараў, так неабходных для шматлікіх спажыўцоў, што яны карыстаюцца попытам не толькі ў Рэспубліцы Беларусь, а таксама яшчэ ў 13 краінах, куды экспартуюцца.

Гэтыя і іншыя дасягненні — плён вашага старання, вашай ініцыятывы, творчых адносін да справы, самаадданай работы, за што я шчыра ўдзячны ўсім. Віншую калектыў з прафесійным святам — Днём работнікаў гандлю! Моцнага здароўя, новых творчых ідэй, энтузіязму, фінансавага дабрабыту, сямейнага шчасця! Няхай вам спадарожнічае ўдача ва ўсіх жыццёвых справах!

Дырэктар РУП «Гомельскі завод гандлёвага машынабудавання» Уладзімір СУВАЛАЎ.

Нягледзячы на тое, што ў 1974 годзе жанчынам зноў дазволілі станавіцца матадорамі, гэты від спорту не стаў традыцыйным — магчыма, таму, што карыда патрабуе поўнай самаадданасці.

Карыда — сумесь палявання і балета, дуэльнага паядынку і антычнага тэатра, поўная, паводле слоў Габрыэля Гарсія Лоркі, чароўнай геаметрыі. Па рызыцы яна параўнальная з таталізатарам, па эстэтыцы — з паэзіяй трубадураў, па градусе запалу і цырыманіяльнасці — з рыцарскім турнірам. Пачынаюць выступаць пешыя тарэадоры ў васямнаццаць — дваццаць гадоў, а вучацца з дзесяці. Ганарар знакамітага матадора на буйной арэне — сто тысяч долараў за адзін паядынак. Да сарака гадоў тарэадоры ўжо выходзяць на пенсію, а зорных сезонаў у іх жыцці бывае не больш за сем. Прычынай гэтага з'яўляецца часцей не ўзрост, а элементарны страх. Выбіраецца бізнэс спакайнейшы, напрыклад, недарагая нерухомасць.

Кар'ера коннага тарэадора пачынаецца пазней: спачатку трэба стаць дрэсіроўшчыкам, потым падрыхтаваць сваіх коней. Мужчыны-вершнікі сыходзяць з вялікай карыды ў шэсцьдзясят, жанчыны — у сорак гадоў. Галоўнае ў гэтым відзе спорту — высокая траўматычнасць...

За сваю кар'еру матадор атрымлівае ў сярэднім дваццаць раненняў. Карыда — небяспечны спорт, і не заўсёды пераможцам тут выходзіць чалавек. Паводле іспанскай статыстыкі, часцей за ўсё гінуць і атрымліваюць разнастайныя калецтвы навільера — маладыя тарэра, якія змагаюцца з неспрактыкаванымі бычкамі-трохгодкамі. Другімі ў гэтым спісе ідуць бандэрыльера, за імі — пікадоры, і толькі на чацвёртым месцы па колькасці трагедый — матадоры. З 1747 года, калі пачалася пісьмовая гісторыя карыды, загінула больш за 700 тарэра.

Ва ўсім свеце цяпер налічваецца не больш за дзесяць жанчын-матадораў.

ЖАНЧЫНЫ Ў СВЕЦЕ КАРЫДЫ

ЗДАВАЛАСЯ б, заваяваць з быком — справа зусім не жаночая. Між тым, забаранілі гэта «слабаму полу» толькі ў XX стагоддзі... іспанскія фашысты, якія прыйшлі да ўлады ў 30-х гадах, і гэтая забарона дзейнічала аж да 1974 года. Аднак дагэтуль у строгай каталіцкай Іспаніі жанчыны выходзілі на арэну нават дзвесце гадоў таму. Знакамітая жанчына-матадор канца XVIII стагоддзя Пахуэлера выступала на арэнах Мадрыда. А карыда 27 студзеня 1839 года ўвогуле ўвайшла ў гісторыю як чыста жаночая: усе ўдзельнікі — і пікадоры, і бандэрыльера, і матадор — былі маладымі жанчынамі...

Зорка арэны мінулага стагоддзя Марціна Гарсія была прынята ў матадоры ў 1948 годзе. А легендарная Канчыта Сінтрон, сяброўка Хемінгуэя, не змагла прайсці абрад пасвячэння: узлёт яе кар'еры прыпаў на 30-40-я гг. XX стагоддзя, калі франкісцкі рэжым наогул забараніў жанчынам выступаць. Канчыта паходзіла з багатай арыстакратычнай сям'і, і для яе зрабілі выключэнне — дазволілі быць конным тарэадорам. Але яна ўсё ж злазіла з каня і дабівала быка ў пешым баі: роля матадора была для яе пераважнай. Ніякага афіцыйнага статусу ў яе не было, але яе называлі ў ліку «пяці вершнікаў апафеозу» — лепшых конных тарэадораў краіны.

Увогуле, мастацтва карыды мае вельмі старажытныя карані. Яно зарадзілася ў нетрах культу Міната́ура, які антычныя гісторыкі лічылі спадчынай таямнічай Атлантыды. Для язычнікаў бык быў ахвярай, для першых хрысціян ён увасабляў д'ябальскі пачатак. Затым гэтыя знакі зліліся. Дзякуючы сінтэзу традыцый у карыдзе назаўжды захавалася нешта ад рыцарскага Сярэднявечча і ад паганскага абраду.

У Партугаліі карыда здаўна лічылася прывілеем шляхцічаў, на ёй яны адточвалі майстэрства, неабходнае для вайны і для рыцарскіх паядынкаў. Аднак у XVII стагоддзі падчас паядынку з быком загінуў пляменнік партугальскага караля, прычым адбылося гэта ў момант нанясення быку завяршальнага ўдару. Загінулі абодва — і чалавек, і жывёла. Пасля гэтага забойства быкоў было забаронена: уступіў у сілу так званы мемарандум Кампільо. З тых часоў партугальская карыда мае рэпутацыю гуманнай і амаль бяскроўнай. Гэта руйнуе яшчэ адзін міф — аб тым, што ў карыдзе ўся справа складаецца ў элементарным (хоць і небяспечным для матадора) забойстве быка. Правілы коннай партугальскай карыды дагэтуль будуюцца на падставе рыцарскага кодэкса гонару. Таму бык, хоць і незнаёмы з кодэксам, карыстаецца ўсімі прывілеямі рыцара, які ўступіў у паядынак з іншым рыцарам.

Але папулярнасць карыда набыла менавіта ў Іспаніі. Пры гэтым арыстакратычны шарм патроху цьмянеў і ператвараўся ў звычайную рызыку, характэрную для іпадрома або баксёрскага рынга. Збуджальнікамі такога ажыятажу служылі кроў і смерць на арэне. Але, як гаворыцца, грубіянскімі сродкамі не дасягнуць асалоды. Іспанскім матадорам цяжка далучыцца да «чыстага» мастацтва.

Вікторыя ЗАХАРАВА.

Кароткі слоўнік тэрмінаў:

Бандэрыльера — член каманды матадора, які ўтыкае бандэрылы (кароткія коп'і, упрыгожаныя кветкамі і стужкамі) у спіну быка і раз'юшвае апошняга.
Бурладэра — адмысловае сховішча для тарэра, драўляны шчыт ля агароджы арэны.
Капеадор — памочнік матадора, які дражніць быка яркім (традыцыйна чырвоным) плашчом.
Карыда — бой быкоў, у якім удзельнічаюць быкі ва ўзросце не менш за чатыры гады.
Квадрылья — каманда матадора ці навільера, члены якой дапамагаюць яму падчас бою быкоў.
Матадор — галоўны ўдзельнік іспанскай карыды, які забівае быка; у коннай карыдзе гэты персанаж называецца рэханеадор.
Навільера — тарэра-пачаткоўцы, якія б'юцца з бычкамі-трохгодкамі.
Пікадор — вершнік з кап'ём, мэта якога аслабіць мышцы шыі ў быка.
Тарэадор, тарэра — удзельнік бою быкоў.
Энсьера — іспанскі звычай: масавыя ўцёкі ад выпушчаных з загону кароў, быкоў або цялят. Распаўсюджаны і ў цяперашні час.
Эспантанэа — аматар, які адвольна выскоквае на арэну, каб выпрабаваць свае сілы ў бойцы з быком.

aquabel

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОДАЖЕ ПРАВ НА ЗАКЛЮЧЕНИЕ ДОГОВОРА АРЕНДЫ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА ПУТЕМ ПРОВЕДЕНИЯ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ

ЗАО «Выставочный центр «Аквабел» Минский район проводит аукцион по продаже прав на заключение договоров аренды следующего недвижимого имущества ЗАО «Выставочный центр «Аквабел» Минский район:

№ лота	Наименование объекта аренды	Адрес объекта аренды	Арендуемая площадь, м²	Начальная цена продажи права заключения договора аренды, бел. руб. с НДС	Размер задатка, бел. руб.
1.	Торговая площадь № 87 для установки павильона по ассортименту часов и аксессуаров к ним	Минский р-н, пересечение Логойского тракта и МКАД, Выставочный блок главного выставочного павильона (ТРЦ «Экспобел»)	10	10 000 000	3 000 000

Условия проведения аукциона:
Организатором аукциона и продавцом (арендодателем) является Закрытое акционерное общество «Выставочный центр «АКВАБЕЛ» Минский район, адрес: Минский район, пересечение Логойского тракта и Минской кольцевой автодороги, административное здание, комната 302.
Торги состоятся **16.08.2011 года в 10.00,** по адресу: Минский район, пересечение Логойского тракта и Минской кольцевой автодороги, административное здание, 1 этаж, зал совещаний.
Шаг аукциона – **5%** от начальной цены продажи права заключения договора аренды.
К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица любой формы собственности, а также иностранные инвесторы (иностранные государства, объединения, международные организации, иностранные юридические и физические лица, а также граждане Республики Беларусь, имеющие постоянное место жительства за границей).
Для участия в аукционе необходимо представить следующие документы:
заявление на участие в аукционе и об ознакомлении с объектом аренды;
заверенную банком копию платежного поручения, подтверждающего внесение задатка в белорусских рублях;
юридическими лицами – резидентами Республики Беларусь – доверенность представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), заверенные копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации;
представителями физических лиц – резидентов Республики Беларусь – нотариально заверенную доверенность;
юридическими лицами – нерезидентами Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть проведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения;
юридическими и физическими лицами – нерезидентами Республики Беларусь – документ о состоятельности, выданный обслуживающим его банком или иной кредитно-финансовой организацией, с заверенным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык;
представителями юридических и физических лиц – нерезидентов Республики Беларусь – легализованную в установленном порядке доверенность.
Обязательные дополнительные требования к претендентам на участие в аукционных торгах:
Претенденты на участие в торгах перед перечислением задатка обязаны связаться с организатором аукциона и представить материалы, свидетельствующие о том, что претендент соответствует указанным обязательным дополнительным требованиям. Если претендент соответствует этим обязательным дополнительным требованиям, то он получает согласие организатора торгов на перечисление задатка, а также может ознакомиться с объектом аренды.
Задаток перечисляется по безналичному расчету в белорусских рублях на расчетный счет **ЗАО «Выставочный центр «АКВАБЕЛ» Минский район»** № 3012000273011 в ф-ле ОАО «Приорбанк» ЦБУ № 115 г. Минск, ул. Кропоткина, 91, код 749, УНН 600438617.
Задаток возвращается всем участникам аукциона, кроме участников аукциона, выигравших торги, в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня проведения аукциона или с момента регистрации продавцом (организатором аукциона) отказа от участия в аукционе. Участнику аукциона, выигравшему торги, задаток не возвращается, а учитывается при окончательных расчетах.
Победитель аукциона должен не позднее дня, следующего за днем проведения аукциона, после окончания торгов подписать протокол о результатах аукциона. Протокол подписывается в двух экземплярах победителем аукциона и членами аукционной комиссии.
Оплата стоимости приобретенного права заключения договора аренды на объект недвижимости осуществляется по безналичному расчету в белорусских рублях в течение 3 (трех) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона с победителем аукциона.
Победитель аукциона заключает договор на аренду нежилого помещения в течение 5 (пяти) банковских дней с момента исполнения обязательств по оплате стоимости лота, согласовывает эскиз торгового павильона с администрацией ЗАО «Выставочный центр «Аквабел».
Срок договора аренды торговой площади – **1 (один) год**. Арендная ставка с НДС за один квадратный метр в месяц без эксплуатационных расходов на арендуемое помещение и без эксплуатационных расходов на помещения общего пользования: **ЛОТ № 1 – 262 500 (двести шестьдесят две тысячи пятьсот) белорусских рублей** за торговую площадь № 87 площадью **10 кв.м.** В случае уклонения или отказа от заключения договора аренды или уклонения или отказа от оплаты стоимости приобретенного права на заключение договора аренды задаток победителю аукциона не возвращается.
Заявки на участие в аукционных торгах принимаются до **15.08.2011 г.** до **12.00** включительно по адресу: Минский район, пересечение Логойского тракта и Минской кольцевой автодороги, административное здание, 1 (первый) этаж, комната 103. Тел. (017) 237 95 65, 237 93 95.

Чэмпіянат золаташукальнікаў

стартаваў у фінскай Лапландыі, паведамляюць інфармагенцтвы.

Чэмпіянат праводзіцца 38-ы раз. Па традыцыі ён праходзіць у вёсцы Танкаваара. У спаборніцтвах прымаюць удзел 235 чалавек з пяці еўрапейскіх краін: Фінляндыі, Швецыі, Германіі, Францыі і Нарвегіі. Спаборніцтвы праводзяцца ў пяці катэгорыях: індывідуальны залік для мужчын і жанчын, юніёрскія спаборніцтвы для хлопчыкаў і дзяўчынак да 16 гадоў, дзве ветэранскія гонкі для ўдзельнікаў старэйшых за 60 гадоў і залік нацыянальных каманд па пяць чалавек без абмежаванняў па полу. Кожны дарослы золаташукальнік атрымлівае 15-20 кг залатаноснага пяску, змешанага з драбнёным гравіем у прапорцыі 5:2, у якім, як правіла, змяшчаецца ад 5 да 12 самародкаў золата 750-й пробы. Гэту колькасць пяску трэба апрацаваць прыкладна за гадзіну. Пераможцам становіцца той, хто хутчэй за ўсіх справіцца з задачай і знойдзе больш за ўсіх самародкаў.

Усміхнёмся

У рэстаране.
— Афіцыянт, паўтарыце!
— Паўтараю: «Я не афіцыянт!»

☺

Двое сяброў, мужчыны пасля 50-ці.
— Як думаеш, што важней у жыцці — шчасце ці здароўе?
— Думаю, што шчасце.
— Не-е, здароўе. Вось некалькі дзён таму я сустрэў сваё шчасце — а здароўя не хапіла.

☺

На пляжы.
— Я прашу прабачэння, але на вас нітка.
— Гэта купальнік!

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар НАРКЕВІЧ Уладзімір Браніслававіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, В. ПАЗНЯКОЎ.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: rek@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адасланыя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год. Тыраж 33.380. Індэкс 63850. Зак. № 3633. Нумар падпісаны ў 19.30 29 ліпеня 2011 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12